Дай Божа, каб было гожа!

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

31 снежня 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 256 (26864)

Кошт 650 рублёў




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Новы год — незаўважная*
*важная кропка.*
*Кропка адліку.*

*Новы год — кропка паміж*
*сказамі ў тэксце жыцця.*
*Пасля кропкі звычайна*
*пішуць з вялікай літары.*

*І я старанна выводжу*
*На абрыўку падсвядомасці:*
*НА-ДЗЕ-Я.*
*Усё вялікімі.*

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

# ГОМЕЛЬШЧЫНА ПРЫМАЕ НОВАГА ГУБЕРНАТАРА

Сесія Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў зацвердзіла кандыдатуру Уладзіміра Дворніка ў якасці старшыні Гомельскага аблвыканкама. Аляксандр Якабсон, які займаў гэтую пасаду 9 гадоў, прызначаны старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь. Літаральна напярэдадні Новага года кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей прадставіў дэпутатам абласнога Савета новага кіраўніка Гомельшчыны.

Пазачарговае пасяджэнне Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў было незвычайным. Не толькі таму, што на вачах дэпутатаў адбывалася перадача ўлады пераемніку, але і таму, што Аляксандра Серафімавіча, які, паводле яго слоў, «пражыў у Гомельскай вобласці без трох месяцаў 60 гадоў», тут сапраўды паважаюць і любяць. Таму ў многіх навярнуліся слёзы на вочы, калі былы губернатар развітваўся са сваімі падначаленымі:

— Я на Гомельшчыне нарадзіўся, выхоўваўся, вучыўся, працаваў і па жыцці мне заўсёды шанцавала на добрых людзей, на добрыя калектывы. Не было ніколі лёгкай долі. Але бацька мне казаў заўсёды: для мужыка самае галоўнае — гэта быць адданым працы і любіць сваю Айчыну. Што я імкнуўся рабіць. Што тычыцца Уладзіміра Дворніка, то гэты чалавек можа з шэрагу праблем выдзеліць галоўнае, ён можа пабудаваць працу сваіх падначаленых такім чынам, каб яны ўсе працавалі на вынік. Гэта абаяльны і прынцыповы кіраўнік. У яго ёсць усе якасці, якія неабходны кіраўніку такога ўзроўню.

Асноўная частка працоўнай біяграфіі Уладзіміра Дворніка звязана з сельскай гаспадаркай — доўгі час ён узначальваў саўгас-камбінат «Зара» Мазырскага раёна. За апошняе дзесяцігоддзе гэта гаспадарка 8 разоў станавілася пераможцай рэспубліканскага спаборніцтва. Апошні час Уладзімір Дворнік займаў пасаду старшыні Мазырскага райвыканкама. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей выказаў упэўненасць, што Уладзімір Дворнік зможа захаваць тыя лепшыя традыцыі, якія існуюць у Гомельскай вобласці, і, нягледзячы на тое, што ў будучай пяцігодцы перад рэгіёнам стаяць няпростыя задачы, вобласць зможа выканаць усе прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця:

— Мне давялося не раз прадстаўляць кіраўнікоў рэгіёна, але я ўпершыню бачу такую атмасферу добразычлівасці і адкрытасці. У вобласці захавана пераемнасць, кіраванне перадаецца ў надзейныя рукі. Дзякуй вам за тое, што вы падрыхтавалі такога губернатара, як Александр Якабсон, у цэнтры патрэбны такія людзі. Што тычыцца Уладзіміра Дворніка, вам вялікі дзякуй, што падтрымалі прапанову кіраўніка дзяржавы аб яго прызначэнні старшынёй Гомельскага аблвыканкама. Мне здаецца, што мы разам зрабілі правільны выбар: гэта патрэбны чалавек у патрэбны час на патрэбным месцы.

Выступаючы перад дэпутатамі, Уладзімір Дворнік адзначыў, што цалкам усведамляе высокую меру адказнасці працы на новай пасадзе:

— Хачу запэўніць: колькі будзе ў мяне сіл і магчымасцяў, я буду імкнуцца выконваць той абавязак, які на мяне ўскладзены. Каб тыя традыцыі, якія ёсць у вобласці, абавязкова захоўваліся. Настрой адзін: працаваць, працаваць і працаваць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Маленькія навагоднія радасці

## *Голас народа з Магілёўскай вобласці*

**«Гарантую, што ў новым годзе вы будзеце жыць лепей, чым у мінулым. Хоць бы трохі»**

**Пётр РУДНІК, старшыня Магілёўскага аблвыканкама:**

— Памятаю, як я два гады таму рыхтаваўся да навагодніх свят. Я быў дырэктарам завода: калектыў напярэдадні 25 снежня атрымаў грошы і адправіўся на вакацыі, прадпрыемства падрыхтавалася да крызісу — мы назапасілі сродкі і матэрыялы. Усё было добра, і нібыта можна адпачываць. Але ўсё скончылася тым, што 31 снежня я, ужо назначаны губернатар, прыступіў да працы.

Хачу, каб мяне правільна зразумелі: святы — гэта для жыхароў, а для кіраўніцтва — зусім не. Таму што пастаянна, а на святы асабліва, неабходна быць у баявой гатоўнасці па любых пытаннях. Але асабліва важна — па пытаннях жыццядзейнасці людзей. Ведаеце, цяпер такія капрызы надвор'я здараюцца, што ліквідаваць наступствы даводзіцца доўга і цяжка. Таму трэба святкаваць такім чынам, каб быць гатовым у любы момант прыступіць да актыўнай працы.

Я буду адзначаць Новы год у сямейным коле. І, верагодна, не так доўга, як хацелася б. Што датычыцца святочнага стала, то я ем усё, што падаюць. І аддаю перавагу нацыянальнай кухні. Нездарма я заўсёды пытаюся на пасяджэннях, чаму ў нас не арганізаваны шырокі продаж у грамадскім харчаванні дранікаў, калдуноў-пельменяў і ўсялякіх каўбасак.

А ўвогуле 2010 год быў нядрэнным, і ў параўнанні з мінулым, мне падаецца, больш спакойным. Нават нягледзячы на тое, што год быў вельмі насычаным на знакавыя палітычныя падзеі.

Я хачу павіншаваць усіх жыхароў Магілёўшчыны і ўвогуле Беларусі з Новым годам і Калядамі. Хачу пажадаць, каб вы ўсе былі здаровыя, і вашы родныя і блізкія людзі таксама. Каб усе планы рэалізаваліся ў будучым годзе. І самае важнае, каб у наступным годзе вы жылі лепш, чым у папярэднім. А гэта я вам гарантую: хоць трошкі, але будзеце жыць лепш!

**«Елку, улетку пасаджаную на двары, упрыгожым 31 снежня ўвечары ўсёй сям'ёй»**

**Ніна МІХНОВА, галоўны рэдактар «Радыё «Магілёў»:**

— Маленькая навагодняя радасць маёй сям'і — гэта елка, якую мы ўлетку пасадзілі на двары нашага дома. Таму што шкада секчы елкі ў лесе, а на Новы год усё ж хочацца жывое дрэва. Мы жывём у прыватным доме, таму ў нашым двары цяпер арганізавалі цэлую снежную краіну: агульнымі сіламі залілі горку, дзеці лепяць снегавікоў, будуюць снежныя крэпасці і вежы. А чым яшчэ займацца на зімовых вакацыях?

Сыны мяне парадавалі сёлета: 10-гадовы Алёша выйграў дзве школьныя алімпіяды — па матэматыцы і англійскай мове; малодшы Цімур пайшоў у першы клас і стартаваў нядрэнна.

Мая радасць — гэта не толькі сям'я, але і любімая праца. Я ў ёй не толькі не расчаравалася, а яшчэ больш упэўнілася: радыё — гэта маё! У нас шмат планаў на новы год, і ўжо цяпер у эфіры радыё «Магілёў» з'явілася новае ранішняе шоу «XXL». Вялікі памер азначае павышаную колькасць гумару, пазітыву, радасці. Усяго таго, што неабходна для добрага жыцця ў будучым годзе.

**«Мне 46 гадоў, я важу 118 кілаграмаў, я салідная жанчына, але выехала на сцэну на роліках!»**

**Ірына АЗАРОНАК, пераможца магілёўскага шоу «Чароўныя таўстушкі»:**

— Першы раз за шмат гадоў буду адзначаць свята не дома разам з дзецьмі, якія ўжо дарослыя людзі, а адпраўлюся на вечарыну ў рэстаран разам з новымі сябрамі.

Маё жыццё змянілася каля месяца таму, калі я брала ўдзел і стала першай у конкурсе таўстушак. Паводле ўмоў шоу, удзельніцы павінны важыць не менш за 100 кілаграмаў. Узрост быў розны — ад 24 да 62 гадоў. Так, мне 46 гадоў, важу я 118 кілаграмаў, па адукацыі педагог і цяпер працую адміністратарам у Магілёўскай гарадской капэле, — салідная жанчына, адным словам, але дзеля перамогі выехала на сцэну на роліках!

Цяпер усе вечары ў мяне занятыя запрашэннямі выступіць на карпаратыўных вечарынах: мой вобраз Чырвонага Капялюшыка карыстаецца папулярнасцю. Што датычыцца маёй вагі, то я на гэты конт комплексаў не маю. Я прытрымліваюся актыўнага ладу жыцця: люблю плаванне, боўлінг, лазню. І не думаю, што за месяц дыеты можна дамагчыся добрага выніку: калі ўсё жыццё мы займаліся целаскладаннем, то целааднімание так лёгка не будзе давацца.

Мая навагодняя радасць — гэта любоў і падтрымка блізкіх людзей. Што маці жывая, і што ў дзяцей усё добра. Я не думаю, што багатае застолле, усе гэтыя салаты і заліўная рыба — гэта абавязковая рэч. Аднойчы я выдаткавала месячны запас харчоў на адну навагоднюю ноч, але ніхто нічога не паеў. І правільна. Галоўнае для людзей — не ежа, а зносіны. Я падыму ў гэты Новы год тост за здароўе і радасць у жыцці. Трэба знаходзіць нагоды для радасці!..

**Запісала Ілона ІВАНОВА.**

***(Працяг будзе.)***

## ПЕРШАГА СТУДЗЕНЯ — СНЕГАПАДЫ І МОЦНЫ ВЕЦЕР

Аб гэтым паведаміла БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава. У навагоднюю ноч часам будзе ісці снег, а тэмпература паветра складзе мінус 3—10 градусаў. 1 студзеня актыўны атлантычны цыклон рэзка пагоршыць надвор'е. Раніцай і днём чакаецца снег, па паўночнай палавіне краіны — моцныя снегапады, завеі, на дарогах снежныя заносы. Узмоцніцца вецер, яго парывы будуць дасягаць 15—20 метраў за секунду. Ад 7 градусаў марозу да нуля—плюс 2 градусаў. У пачатку наступнага тыдня маразы паступова пачнуць узмацняцца. Да сярэдзіны тыдня начная тэмпература складзе 7—14 градусаў марозу, пры праясненнях да мінус 17—20 градусаў. А днём прагназуецца 5—12 градусаў ніжэй за нуль.

**У сувязі са святам наступны нумар «Звязды» выйдзе ў аўторак, 4 студзеня 2011 года.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «Беларусь абавязкова захавае сацыяльную арыентацыю эканомікі»

**Пажылыя людзі ў Беларусі атрымаюць магчымасць пажыццёвага абслугоўвання ў абмен на нерухомую маёмасць. Даручэнне аб неабходнасці развіцця ў Беларусі рэнтных паслуг даў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, наведваючы дом-інтэрнат для ветэранаў вайны і працы «Світанак», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**


Фота БЕЛТА.

Як далажыў кіраўніку дзяржавы старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька, сумесна з Мінпрацы і сацабароны падрыхтаваны і ўнесены ва ўрад дакумент аб развіцці двух відаў рэнтных паслуг, якія з'яўляюцца новымі для Беларусі, але ўжо даўно рэалізаваны і паспяхова працуюць у некаторых краінах Еўропы. Сутнасць першага віду такіх паслуг у тым, што, напрыклад, пажылы адзінокі чалавек заключае дагавор з сацыяльным органам, у адпаведнасці з якім яго кватэра пераходзіць у камунальную ўласнасць. У сваю чаргу такі чалавек атрымлівае права пажыццёвага абслугоўвання: яму будуць набывацца прадукты харчавання, за яго будуць выплачвацца камунальныя плацяжы і гэтак далей. Такому чалавеку таксама будзе пажыццёва выплачвацца невялікая рэнта, а пасля смерці кватэра будзе прададзена або перададзена каму-небудзь у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам.

Аляксандр Лукашэнка адобрыў гэту ідэю. «Трэба, каб гэта было ўкаранёна неадкладна», — сказаў ён.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Трэба прадугледзець, каб гэта кватэра толькі прадавалася і нікому не выдзялялася. А потым ужо няхай фінансуецца з бюджэту, калі камусьці трэба прадаставіць бясплатную кватэру або за паўцаны».

Сутнасць другога віду рэнтных паслуг у тым, што кватэра па дагавору пераходзіць у распараджэнне камунальнай юрыдычнай асобы, і пасля неабходнага рамонту здаецца ў арэнду. У сваю чаргу чалавек размяшчаецца ў дзяржаўнай сацыяльнай установе, атрымлівае пажыццёва вызначаную рэнтную плату і поўны комплекс паслуг. Пасля яго смерці такая кватэра таксама пераходзіць у камунальную ўласнасць.

«Арыентацыю нашай эканомікі мы захаваем чаго б гэта ні каштавала», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, у краіне ёсць усе магчымасці, каб узровень жыцця людзей не знізіўся.

На заўвагу журналіста БЕЛТА аб тым, што да выбараў прадстаўнікі апазіцыі заяўлялі, што ўсе павышэнні зарплат, пенсій, стыпендый толькі піяр дзеючай улады і ў далейшым іх не ўдасца стрымаць, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Дай бог, каб у мяне і ўсёй Беларусі была магчымасць такім чынам піярыцца, таму што такі піяр вельмі дорага абыходзіцца дзяржаве, калі ён эканамічна не абгрунтаваны». Усё, што робіцца ў краіне ў сацыяльным плане, эканамічна абгрунтавана, падкрэсліў ён. «Рост цэн на вуглевадародную сыравіну адбіваецца на краіне, людзях, але гэта ўсё лягчэй пераносіць тады, калі ёсць гэты піяр у выглядзе росту заработнай платы, пенсій, дапамог і г.д.», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Дырэктыва па лібералізацыі павінна даць нейкі дадатковы штуршок. Таму калі нехта за мяжой або ў нас чакае гэту дырэктыву як манну нябесную, гэта вялікая памылка. Трэба цяпер пачынаць працаваць, у нас для гэтага ўсё ёсць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Што датычыцца затрыманых, мы ўжо не адну сотню вызвалілі. Але ўзбуджана крымінальная справа. Калі ў рамках следства, крымінальнай справы можна вызваліць гэтых людзей — нам яны там не патрэбны», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Калі ты актыўны ўдзельнік масавых беспарадкаў — ёсць следства, ёсць суд, з табой разбяруцца, — сказаў Прэзідэнт. — А ўвогуле лёс у іх руках: і экс-кандыдатаў, і затрыманых, і тых «баевікоў», якія грамілі. Чалавек 20 ужо ўстанавілі: усе па два, па аднаму тэрміну ўжо адсядзелі, значыць, гэта людзі, якія мелі праблемы з законам».

Адказваючы на просьбу журналістаў назваць асноўныя дасягненні адыходзячага года, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Галоўная заваёва — мы адстаялі краіну. Вы нават уявіць не можаце, што кучка адшчапенцаў магла перавярнуць краіну. Нават я шмат чаго не ўяўляў». Паводле слоў Прэзідэнта, «за іх спінай стаялі людзі, не з нашай дзяржавы, пэўныя структуры, вялікія грошы». «Нават калі яны трапілі ў следчы ізалятар, сяму-таму прыйшлі пасля грошы, гэта значыць грошы затрымаліся ў дарозе», — сказаў ён, дадаўшы, што гэтыя сродкі будуць перададзены ў бюджэт.

«Мы маглі прачнуцца ў зусім іншай краіне, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі мне гавораць пра Захад, я ім зусім не веру: хутчэй за ўсё, яны спрабавалі мяне і ўсіх нас заспакоіць. Вось вы правядзіце, усё адкрыйце, вось ляжце там, на марозе мінус 20, распластайцеся, раздзеньцеся — і тады ўсё будзе добра. Заспакойвалі. Цяпер мы бачым іх сапраўдны твар».

Адказваючы на пытанне, як Аляксандр Лукашэнка адрэагуе на патрабаванне Захаду вызваліць усіх арыштаваных, уключаючы экс-кандыдатаў у прэзідэнты, у якасці ўмовы для прадаўжэння кантактаў і дыялога, кіраўнік дзяржавы сказаў: «Ніякіх ультыматумаў мы больш не прымем. Калі нам будуць ставіць нейкія непрымальныя ўмовы, прытым зыходзячы з двайных стандартаў — мы іх таксама не прымем».

«Патрабаваць ад мяне не трэба: мы будзем рабіць, як у Францыі, Германіі, там жа прэзідэнт можа вызваліць чалавека з-пад следства. Так, я магу на стадыі следства, мне законам гэта дазволена, але калі для гэтага ёсць падставы, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Калі яны не маюць дачынення да масавых пагромаў, а апынуліся там па ідэйных меркаваннях, я асабіста буду разглядаць гэта пытанне. Калі ты вінаваты — я ў гэта ўмешвацца не буду».

У Аляксандра Лукашэнкі пацікавіліся, якім будзе шлях незалежнай Беларусі ў бліжэйшыя гады і як будуць выбудоўвацца адносіны з партнёрамі на Захадзе і Усходзе на тым знешнепалітычным фоне, які склаўся пасля беспарадкаў, учыненых апазіцыяй 19 снежня. Прэзідэнт адзначыў, што як незалежная краіна Беларусь існуе ўжо больш як паўтара дзясятка гадоў. «Вы помніце, каб мы развіваліся на нармальным знешнепалітычным і эканамічным фоне? У нас заўсёды былі праблемы, і праблемы былі не толькі ў нас», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, прычына гэтага ў тым, што на месцы адной дзяржавы з'явілася 15, «а месца для іх забраніравана не было». «Камусьці трэба было пацясніцца, і да гэтага часу некаму даводзіцца крыху пацясніцца ў гэтым цесным свеце. Таму ўсе праблемы адсюль, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Нікому не патрэбна, ні Расіі, ні Польшчы, ні Германіі, паспяховая дзяржава, якая пазіцыянуе сябе як суверэнная і незалежная. Але гэта патрэбна нам. Адсюль вось гэтыя асноўныя супярэчнасці. Ну а зачэпку і нават прычыну знайсці можна, каб нахіліць, тым больш, нашу краіну».

Што датычыцца негатыўных ацэнак вынікаў выбараў, Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да журналістаў, адзначыў: «Вы, як і я, адчулі, што мы ўжо такую дэмакратыю тут развялі, што далей няма куды. І мы ж ведаем аб'ектыўныя ацэнкі нашых выбараў. Тое, што яны прыехалі сюды з загадзя напісаным тэкстам, — скажу шчыра, я за месяц да выбараў гэты тэкст чытаў. У нас выбары яшчэ не адбыліся, а яны ўжо гэты тэкст напісалі. Ну, крыху лепш, чым у мінулыя выбары». Таму, лічыць Прэзідэнт, «трэба было нечым прыкрыцца, абгрунтаваць гэты негатыў». Такім прыкрыццём, паводле яго слоў, і сталі падзеі, якія адбыліся вечарам у Мінску 19 снежня. «Але, па-першае, гэта было пасля выбараў. Па-другое, якое гэта мае дачыненне, дапусцім, да галасавання? Ніякага, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Але ім так хацелася, яны гэта даўно запланавалі. Таму галоўны ўрок, які я атрымаў: мы ім там (на Захадзе. — **Заўвага БЕЛТА**) абсалютна не патрэбны. Нас хочуць бачыць слабымі, а слабы паспяховым не будзе. Паважаюць толькі моцных. Слабымі мы не будзем».

«Калі яны гатовы бачыць такую Беларусь у цэнтры Еўропы, мы з задавальненнем будзем з імі супрацоўнічаць. Калі яны шукаюць падставу для таго, каб застацца ў гэтым контрпрадукцыйным канфрантацыйным полі, мы змяніць іх не можам. Таму гэта іх справа. Пажывём — пабачым», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка збіраецца сустракаць Новы год з сям'ёй.

«Хутчэй за ўсё, буду сустракаць традыцыйна. Былі ў мяне іншыя думкі, але не складваецца, — даводзіцца традыцыйна адзначаць гэта свята. Паслухаю адных, паслухаю другіх, самога сябе, крыху вып'ю шампанскага або чырвонага віна — і на гэтым увесь Новы год, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба думаць аб рабоце ў будучым годзе».

Прэзідэнт таксама дадаў, што не можа дазволіць сабе сустрэчу Новага года, як большасць грамадзян, паколькі павінен быць на месцы, на пасту, як некаторыя людзі, занятыя на прадпрыемстве з бесперапыннай вытворчасцю, урачы, ваенныя.

## Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ: «Дзяржаўныя СМІ ў цэлым забяспечылі інфармацыйнае суправаджэнне прэзідэнцкай кампаніі»

Што датычыцца работы недзяржаўных СМІ, то ў Міністэрства інфармацыі ёсць сур'ёзныя прэтэнзіі да дзейнасці ў гэты перыяд некаторых з іх. «Вялікая колькасць публікацый мела адкрыта антыдзяржаўны характар, многія з іх змяшчалі недакладныя звесткі, знявагі і паклёп, заклікі да ўдзелу ў несанкцыянаваных мерапрыемствах. На нашу думку, на такіх выданнях ляжыць значная частка віны за масавыя беспарадкі, якія мелі месца на плошчы Незалежнасці 19 снежня», — падкрэсліў міністр інфармацыі. Менавіта ў сувязі з гэтым Мінінфарм дакладна прааналізуе дзейнасць гэтых СМІ і дасць ім адпаведную прававую ацэнку. Алег Праляскоўскі дадаў, што і сярод расійскіх мас-медыя, акрэдытаваных для асвятлення выбарчай кампаніі ў Беларусі, таксама знайшліся такія, якія вырашылі абмяркоўваць беларускую тэматыку выключна прадузята і тэндэнцыйна.

Настасся: «У Трусаў быў добры год»



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Што будзе на навагоднім стале ў Чаркіных ды Шкварко? Ці стаіць у кватэры Ёлкіных ёлка? Якім чынам у людзей з прозвішчамі — сімваламі Новага года — праходзіць свята і складваецца жыццё? Пра гэта карэспандэнты «Звязды» высвятлялі ў жыхароў сталіцы.

# Чаркіна працавала на «Крышталі», Шкварко ніколі не быў на мясакамбінаце, а сярод Віхроў шмат бландзінаў

## ГАРЭЛКІНУ НАЗЫВАЛІ САМАГОНКІНАЙ

— Ой, а вы ведаеце, я непітушчая, — засмяялася ў тэлефонную трубку **Надзея ГАРЭЛКІНА.** — Я сама працую таваразнаўцам у краме канфіскаваных тавараў. Ёсць там і алкаголь таксама, але мяне гэта не спакушае. Толькі вось любяць жартаваць, то «Самагонкінай» назавуць, то «Водкінай». А прозвішча маё па мужу. Ён сам з Амура, што ў Расіі. Таму прозвішча дакладна не беларускае.

— Год прайшоў досыць складана. Напэўна, як і ў многіх беларусаў, — кажа Надзея. — Усякае здаралася. Але веру ў лепшае.

Надзея Гарэлкіна мае двух дзяцей і ў Дзеда Мароза разам з мужам папрасіла двух унукаў.

— Сто гадоў з мужам на дваіх размянялі, а ўнукаў няма, — тлумачыць сваю просьбу Надзея Гарэлкіна.

Будзем спадзявацца, што род Гарэлкіных яшчэ працягнецца на зямлі беларускай.

— А дзе вы мой нумар тэлефона знайшлі? — здзіўляецца **Ганна ЧАРКІНА.**

— З тэлефоннага даведніка.

— От жа, бач! — не верыць Ганна Канстанцінаўна. — А пра што вам расказаць? Ну, працавала я на заводзе «Крышталь», на складзе да гэтага года, пакуль муж інвалідам не стаў. Так што сімвалічна ўсё з маім прозвішчам. Як прозвішча паўплывала? Звычайна на якіх-небудзь сустрэчах пра мяне быў адзін тост: «Вып'ем чарку за Чаркіну!»

**— А самі якія тосты казалі?**

— Ой, так і не ўспомніць. Да тостаў рыхтуюся звычайна, а так экспромтам рэдка атрымліваецца...

На Новы год на стале Чаркіных абавязкова будзе што і ў чарку, і пасля чаркі.

— Стол падрыхтуем як звычайна. Нейкай экзотыкі і штукарства не плануем, — кажа Ганна Канстанцінаўна.

Як кажуць у народзе, да чаркі ў народзе прынята ўжыць і шкварку. **Валянцін Пятровіч ШКВАРКО** кажа, што яму з яго прозвішчам досыць утульна. Не, ён не працуе на мясакамбінаце, яго праца нават не звязаная з прадуктамі.

— Я інжынер-механік. Ваенны, — сціпла адказвае Валянцін Пятровіч. — На прозвішча не скарджуся. Неяк так негатыўна на жыццё не ўплывае.

Па словах Валянціна Пятровіча, прозвішча яму засталося ў спадчыну ад украінцаў. Дзядуля і бабуля яго былі адтуль. А з прозвішча Шкварко не смяяліся ніколі.

— А як жа паздзекуешся тут, калі ўсе Шкварко больш за 120 кг, — гаворыць Валянцін Пятровіч. — Асабіста я 143 кг важу, так што з мяне асабліва не пакпіш.

Пра тое, што наступны год звязаны з яе прозвішчам, **Марыя ТРУС** даведалася ад мяне.

— Ой, а і праўда мой год, — зарагатала жанчына. — Як толькі маё прозвішча не тлумачылася: і бялізна, і баязлiўка...

Як высветлілася, Марыя Васільеўна больш за 30 год адпрацавала на заводзе, а пасля адзінаццаць год адрывала кантрольныя часткі на білетах у Беларускім моладзевым тэатры.

— Я ўсе спектаклі на памяць ведала, — расказвае Марыя Васільеўна. — Да мяне нават пасля акцёры падыходзілі і пыталі: ці правільна, ці не сфальшывілі чаго. Больш за ўсё Жураўля любіла... Зараз тэатр на рамонце, а я пакуль не працую. Але вельмі сумую... У нас быў такі сяброўскі калектыў, у рэстарацыі ўсе святы адзначалі, не звяртаючы ўвагі на тое, акцёр ты ці просты супрацоўнік...

Бягучы год для Марыі Васільеўны быў шчаслівым.

— Нарадзілася ў мяне праўнучка, — кажа жанчына. — Цяпер во маю чацвярых унукаў ды адну праўнучку. Хай бы і наступны год быў такім.

## НУ НЕ ЛЮТУЮЦЬ ЛЮТЫЯ!

Цікава, а які характар у чалавека, які носіць прозвішча **ЛЮТЫ**? Сяргей, які адказаў на званочак, сказаў , што прозвішча ніякім чынам на яго характар не ўплывае. І дарэмна людзі, якія даведваюцца пра яго, імкнуцца ставіцца пэўным чынам: ну не лютуюць людзі з такім прозвішчам! І наогул нічым не адрозніваюцца ад іншых людзей, і навагоднія святы сустракаюць не на дварэ, а як усе за накрытым сталом. Хіба што жыць з «халодным» прозвішчам крыху весялей. Узімку да іх навакольныя праяўляюць асаблівую увагу. Напрыклад, Сяргей жартуе, што, калі вучыўся ў школе, кожны дзень на працягу месяца на дошцы пісалі яго прозвішча, а ў канцы абвяшчалі: «прыйшоў канец Лютаму».

— Мы больш любім вясну, — прызнаецца **Вера ВІХОР.** — Вядома, мы не баімся завірух і холаду: мы ж віхры! Хоць як маразы, так і пару, калі хлюпае пад нагамі і капае з дахаў, вельмі не любім, дзеткі - віхры ў такое надвор'е хварэюць. У зіме падабаецца прыгажосць — калі дрэвы ў шэрані, свеціць сонейка і ўсё як у казцы зіхаціць.

І хоць напачатку Віхрам падалося, што нічога такога асаблівага ў іх жыцці няма, усё ж знайшліся пэўныя зімовыя зачэпкі. «Часам бывае такое, што спачатку ўсё ідзе ціха, мірна, а пасля як навалiцца адно на другое, як закружыцца, завярціцца — хоць разарвіся на некалькі кавалкаў! А па характары мы ўсе добрыя. Сярод Віхроў многа бландзінаў, а яшчэ мы вылучаемся доўгажыхарствам (так, дзядуля, які родам з Украіны, пражыў 110 гадоў!). І ў новым годзе жадаем людзям такога здароўя, як у людзей-маржоў, што не баяцца зімой купацца».

**— А вы ведаеце, што ваша прозвішча звязана са снегіром?**—цікаўлюся ў **Сяргея ГІЛЯ.**

— Цікава, першы раз чую. А мне падабаюцца гэтыя птушкі, шкада, што зараз іх не бачна. Хоць маё прозвішча даволі вядомае, персанальнага вадзіцеля Леніна так звалі, у школе мне гэта нават з падручніка зачытвалі. І яшчэ прозвішча маё даволі распаўсюджанае. Я часта сустракаў людзей з такім жа прозвішчам, і ёсць пэўныя рысы, характэрныя для ўсіх Гіляў. Я гэта заўважаю і ў сваякоў, і ў знаёмых з такім прозвішчам. Мы за справядлівасць. Здавалася б, іншы раз можна проста змаўчаць, але мы не хаваем сваіх думак, праўду рэжам у вочы, і за гэта пакутуем. Напрыклад, паўгода таму я, калі заўважыў, што крыўдзяць жанчыну, з якой разам працаваў, заступіўся за яе, хоць тыя разбіранні мяне ніяк і не тычыліся... У выніку я зараз без працы. А працаваў я на заводзе халадзільнікаў.

**— Дык можа, зіму любіце?**

— Ненавіджу! Затое люблю прыроду. І люблю падарожнічаць, толькі не так, як снягір. Мне стандартная, шэрая Еўропа нецікавая, больш маніць Усход — там, дзе цёпла, дзе ёсць нешта экзатычнае, дзе яскравыя фарбы, нешта далёкае, казачнае.

Жадае ж Сяргей Гіль усім у новым годзе быць добрымі, паблажлівымі, вучыцца разумець людзей.

У **ЁЛКІНЫХ** у гэтым годзе не будзе стаяць ёлка. Не было яе і ў мінулым. Хоць, калі дзеці былі маленькія, навагодняе дрэва тут заўсёды стаяла. А яшчэ ў сям'і Ёлкіных не любяць штучных ёлак.

Як рыхтуецца да свята **Каляда**?

— Мы вельмі добра ставімся да традыцый беларускага народа, свят нашых. Калі-нікалі размаўляем на беларускай мове, пішам прывітанні. На вечарынцы, па святах нас просяць: «Скажыце на сваёй мове», — бо ўсе размаўляюць на рускай, а мы на беларускай, — расказвае **Людміла КАЛЯДА** і зачытвае мне паштоўку-віншаванку, якую падпісала на беларускай мове. — А Каляды мы святкуем, у мяне яшчэ і дзень нараджэння на іх прыпадае, прыходзяць дзеці, мы бліны пячом. Калядаваць не ходзім, бо не ўмеем спяваць, а як малыя былі, дык калядавалі. Праўда, мы жылі ў гарадскім пасёлку, там асабліва калядаваць не прынята. Было нават, я марыла: вось бы ў якую глухую вёску на свята патрапіць.

Дарэчы, Людміла Мікалаеўна да пенсіі працавала загадчыцай дзіцячага садка, і заўсёды прыходзіла паглядзець, як малыя зімовыя святы адзначаюць.

— А мне так падабаецца, калі гучыць беларуская мова, — дзеліцца жанчына.— Сын за мяжу ездзіў і кажа, што сорамна, што ў нас на роднай мове не гавораць, песень не ведаюць. Як прыгожа на беларускай мове размаўляе міністр культуры! Вось бы і адукацыю так рабілі... Хацелася б, каб больш было праграм на роднай мове і каб тэлевядучыя па-беларуску размаўлялі. Каб больш было песень на роднай мове, і не папсовых, а меладычных, прыгожых, якія кранаюць, хвалююць. Каб у нас нараджаліся Коласы і Купалы. Каб моладзь гаварыла на роднай мове, ляпіла яе.

Што будзе на стале на калядным стале ў **Куцці**?

— Год, як памёр мой муж, і цяпер мне не да свят. А раней калядкі мы заўсёды адзначалі і куццю на стол ставілі, — адказвае **Клаўдзія КУЦЦЯ.** — Мне гэта прозвішча дасталася ад мужа, і скажу вам, добры быў чалавек. Мы з ім 47 гадоў разам пражылі, цікава з ім было, спакойна, ён заўсёды за мяне заступаўся. Наогул па сваяках мужа гляджу, што ўсе людзі з гэтым прозвішчам нядрэнныя, шчырыя. І жадаю ўсім здароўя. Няхай будзе мір і сяброўства, як на ўзроўні сваяцкім, суседскім, так і між народамі.



Анатоль КОТ да Новага года падрыхтаваны?

## ЧАМУ КАТЫ ПРАБІЎНЫЯ?

**— Дапамажыце вызначыцца, дык чый будзе год, Ката ці Труса?** — цікавімся ў **Алы КОТ.**

— А вам хто больш падабаецца?

— Кот, ён жа пад бокам. А Трус дзесьці далёка бегае.

— Няхай людзі самі выбіраюць. А мне ўсё роўна, бо калі замуж выходзіла, такой цікавасці да гараскопаў не было і я не надаю гэтаму значэння. Дарэчы, муж хацеў узяць маё прозвішча. У мяне было латышскае прозвішча Юргес. Ён так мяне казаў, што пагаджаўся з усім, што я рабіла. Але я падумала: як жа гэта мужчына будзе на жаночым прозвішчы? І таму стала Катом. У мяне пяць дзяцей. Ніхто з іх не жаліўся, што цяжка з такім прозвішчам. Мы адзін аднаго ў сям'і ласкава называлі коцік, каток. Гэтак жа звалі маіх дзетак і ў школе. Так, адна дачка добра малявала (сёння яна мастачка, піша абразы), другая добра пела, запявала ўсюды была, ва ўсіх мерапрыемствах удзельнічала (сёння служыць актрысай у лялечным тэатры). Дык іх і называлі ў школе кошачкамі. Яшчэ двое сыноў — ваенныя. А трэцяга вы напэўна ведаеце, — акцёр Анатоль Кот.

**— Дык можа вашы дзеткі па творчых спецыяльнасцях пайшлі, таму што ставіліся да іх усе ласкава, любілі іх?**

— Думаю, гэта не з-за прозвішча, а з-за крыві, каго ў нас у родзе толькі няма — і немцы, і палякі, яўрэі, беларусы і латышы. І ўсе мае дзеці вельмі розныя. Толік вельмі на немцаў падобны — можа таму, калі ён працаваў у Германіі, яго любілі і прымалі за свайго. А вось сястра яго падобная на палячку, такая гжэчная. Увагі я ім удзяляла шмат, урокі рабіла. Нават сачыненне пісала за сына. Яму ўсё за сачыненні настаўніца тройкі ставіла. І вось калі я напісала, ён прыходзіць, кажа: «Во, і табе тры». На лыжах каталіся. Пазбіраем усіх, саначкі адны за другія начапляем і паедзем, весела было. Шмат часу праводзілі ў лесе, збіралі па 10 вёдраў буякоў, журавін, грыбоў было многа. Адна знаёмая казала, што так уставаць не хочацца, каб у лес ехаць. Але глядзіць у акно: усе Катовы дзеці пабеглі, малы малога меншы...

У Ратамку ездзілі на конях катацца, у Стайкі, на возера купацца, у бадмінтон і іншыя гульні гулялі — карацей, з дзецьмі мы займаліся. І працавалі шмат. Я хацела, каб мае дзеці былі не горш, чым тыя, у каго адно-двое. А то, ведаеце, многія думаюць, што вялікія сем'і саплівыя, брудныя. З Польшчы мы прывезлі сукенкі, у якіх каўнерыкі і манжэты адшпільваюцца. Неяк стаіць класны кіраўнік, абгаворвае, што дзеці ў школе брудныя. Я пачынаю апраўдваць: што з малых возьмеш. А настаўніца мне: «А чаму ж тады вашы дзеці такія чысценькія?». Энергіі ў мяне было шмат. Але і дзеці цудоўныя. Старэйшаму было 3, другому дзіцяці год і 7 месяцаў, калі я нарадзіла трэцяга. Дык вось трохгадовае дзіця няньчыла таго, якому год і 7. Я разам іх выпускала на вуліцу і не баялася, хоць у нас перад домам ішла дарога, па якой машыны ездзілі. І ўсе казалі, што ні ў кога такіх дзяцей няма, як у Ката.

Нашы дзеці былі не скваплівыя. Я дзецям сказала, каб ні ў кога не бралі цукерак. І колькі ім ні прапаноўвалі — не бралі. Калі купім цукеркі, дзялілі ўсім роўна, ніхто лішняга не возьме. З намі жыла бабуля, якая сваю цукерку клала пад падушку. Я ў яе пытаюся: «Мама, цяжка табе? Дзеці ж шумяць увесь час?» А яна ў адказ: «Хто старога так пацалуе, як не дзеці?». Яна Толіку дасць цукерку, а ён і рукі ёй пацалуе, і пагладзіць, і так ужо лашчыцца!

Хоць усякага было. Калі пятаму дзіцяці быў год, я вымушаная была выйсці на працу, а садка нам не далі, месца не было. Неяк прыходжу дамоў раней, гляджу, а дзіцё мае гадавалае на сабаку спіць (у нас была аўчарка), старэйшыя ж дзеці гуляць пабеглі. Сабака стаў, бок выгнуў, бо баліць, і на старэйшых гаўкае, што на яе так доўга малую пакінулі.

Кватэру нам не хацелі даваць. Мы жылі ў двухпакаёўцы, я, муж, пяць дзяцей і маці. Спальня была ўся ложкамі застаўленая, а ў зале круглы стол, і ўсе дзеці там урокі рабілі.

Пайшла ў райвыканкам высвятляць пра нашу чаргу. І як на мяне там мужык пачаў крычаць! Я нават не магла зразумець чаму. А ў яго, высветлілася, дзень непрыёмны. І ўяўляеце, я стаяла з дзевяцігадовым дзіцем на руках, трымаць малую цяжка, а ён мне нават сесці не прапанаваў. І роў, ажно з пенай ля рота. І я тады кажу: «Пайду нараджу яшчэ аднаго і сяду на Круглай плошчы. Як людзі ідуць загінулым у вайне пакланяцца, няхай і мне кланяюцца, што я столькі дзяцей на свет пусціла і пакутую.

**— А ці б пажадалі вы людзям мець многа дзяцей?**

— Шкадую, што яшчэ двое не нарадзіла. Толік кажа: «Мама, давай жыць усе разам». А я згодная, толькі кажу ім, што вашы жонкі будуць незадаволеныя. Дзеці ў нас вельмі камунікабельныя, любяць вялікую кампанію, вельмі дружныя, увесь час цікавяцца адзін у аднаго, ці патрэбна якая дапамога. Дык і іншым такога жадаю. І няхай з усімі будзе Бог і ўдача, шчасце і здароўе!

***Дарэчы, калі мы набіралі тэлефонныя нумары, мы не ведалі, з кім звяжамся. Нумары проста бралі з даведніка і тэлефанавалі на ўдачу, каму патрапіцца. І кожны званочак — такі пазітыў. Кожны званочак — нечы лёс і чыйсьці настрой. Можа, і вы прaцягнеце нашу гульню? Набярыце тэлефонны нумар! Любы. І абмяняйцеся з чалавекам, які вам адкажа, святочнымі віншаваннямі. А можа, вы патрапіце якраз да таго, каго сёння няма каму віншаваць. Падзяліцеся сваім добрым настроем.***

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ, Настасся ЗАНЬКО.**

Алена: «Каляды пякуць бліны»



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Шчасце, калі ў доме Гаспадар

# ЧАМУ Ў ГОД ТРУСА НЕ РЭКАМЕНДУЕЦЦА РАБІЦЬ РЭЗКІХ РУХАЎ?


Андрэй Мурзіч ведае толк у трусах.

**ПРА гэта карэспандэнту «Звязды» распавялі трусаводы Мурзічы з Засулля. Хто-хто, а яны ў вушастых толк ведаюць.**

### УСЁ ПАЧЫНАЛАСЯ З САБАК...

Пазнаёміліся Андрэй з Людмілай не зусім звычайна. Іх звязала не музыка, як у той песні, а... нямецкія аўчаркі.

— Я колькі сябе памятаю, — распавядае Людміла, — душы не чула ў сабаках. Менавіта яны і прывялі мяне ў ветэрынарны інстытут. Пасля атрымання дыплома трэніравала зборную Беларусі па шматбор'і са службовымі сабакамі, працавала інструктарам па дрэсіроўцы.

— Так сталася, што я трапіў менавіта ў Люсіну (так з любоўю Андрэй называе сваю жонку) групу дрэсіравацца. Не адзін *(смяецца)*, з сабакам.

— Вой, як я ганяла іх там — то налева, то направа!

— І, самі бачыце, — падміргвае Андрэй Людміле, — так спадабалася, што дагэтуль падпарадкоўваюся *(смяюцца)*.

Карэнныя мінчане, і Андрэй, і Людміла з самага дзяцінства марылі жыць за горадам і разводзіць сабак. Таму практычна адразу пасля вяселля набылі дом у Нясвіжскім раёне.

— І адразу ж завялі веліканаў? — цікаўлюся.

— Не. Спачатку бацькі падарылі нам парася, — кажа Людміла. — Маўляў, як гэта жыць у вёсцы, ды не трымаць гаспадарку? Другія, гледзячы на іх, прывезлі яшчэ двух парасят. Як жа мы з імі намучыліся...

— Альбо яны з намі, — усміхаецца Андрэй. — У той час, калі ўсё куплялі па талонах, дастаць камбікорм было няпроста. Таму жылі нашы свінні надгаладзь. Увесь час вырываліся з загону. Шукалі, дзе што паесці. Неяк раз, Люсі не было дома, прыбягае сусед і пытаецца: «Мо гэта вашы свінні ля возера бегаюць?» А я не вытрымаў і кажу яму: «Не хачу тых свіней! Калі хочаш, лаві іх сам і еш!». Так яны мне атруцілі душу! Праз год мы сваіх спартсменаў закалолі. Вагой хваліцца не будзем, затое мясныя былі, практычна без сала. На гэтым са свіннямі мы завязалі.

Прафесійна займацца трусамі Мурзічы пачалі ўжо на Стаўбцоўшчыне, куды перабраліся, каб быць бліжэй да бацькоў, гадоў 14 таму.

— Як?.. — апярэджвае маё пытанне Людміла. — Проста ўбачылі аднойчы дзевяцікілаграмовага велікана і не змаглі ўстаяць. Пачыналі ж са звычайных, беспародных.

Калі Андрэй быў маленькі, яго, як і большасць гарадскіх дзяцей, бацькі на лета адпраўлялі ў вёску да бабулі. Самі ж прыязджалі праведваць. І аднойчы (колькі тады было радасці!) прывезлі сыну двух трусянят.

— Так бабуля з дзядулем, хацелі яны таго ці не, пачалі разводзіць трусоў. А калі мы пераехалі жыць у вёску, то я неяк жартам сказаў бабулі, што прыйшоў час вяртаць падарунак *(усміхаецца)*. Вось так усё і закруцілася...

### ЯК ТРУСЯЦІНУ ЗРАБІЦЬ ДАСТУПНАЙ?

З двух'ярусных клетак, якія месціцца побач з домам, з цікаўнасцю назіраюць за намі вочкі-гузікі. Трусы, усе як адзін — белыя, чорныя, плямістыя (якіх тут толькі няма!) — навастрылі свае вушкі: пэўна, чакаюць падвоху.

— Вось гэтыя, са стаячымі доўгімі вушамі, бельгійскія веліканы, а гэты пацешны трусік з масіўнай мордачкай і вісячымі вушамі — французскі баран, — праводзіць экскурсію па ферме Андрэй Мурзіч, дарэчы, як пасля высветлілася, перакладчык па адукацыі. — Трэцяя парода, на якой мы спецыялізуемся, называецца новазеландская белая. Усе тры пароды мясныя. Але пры ўсім пры гэтым нашай першачарговай задачай з'яўляецца захаванне і, па магчымасці,


Так адразу і не скажаш, што гэты французскі баран некага можа спужацца — хутчэй наадварот.

памнажэнне лепшых якасцяў кожнай з іх. Аб гэтым сведчыць і тое, што ўсе гадаванцы маюць кляймо і сваё непаўторнае імя.

На сёння вушастая гаспадарка Мурзічаў налічвае ні многа ні мала 100 самак. У сярэднім на 5-7 трусіх прыходзіцца па аднаму самцу. Пры гэтым «кавалераў» для сваіх «заек» Мурзічу пастаянна даводзіцца шукаць новых, бо перыядычна трэба ўліваць у патомства новую кроў.

— А любімчыкі ёсць?— цікаўлюся.

— У мяне ёсць, — дадае Людміла. — Я люблю тых самак, якія добра нараджаюць і клапоцяцца пра сваіх дзетак. Калі ж трусіха прывяла дзяцей і праз два дні перастала іх карміць, то яна для мяне больш не любіміца.

— Асабіста ж я стараюся не прывязвацца, — кажа спадар Мурзіч. — Бо калі заводзіш любімчыка, то складана яго забіць... А займацца мясной жывёлагадоўляй і самому не забіваць жывёлу — гэта практычна немагчыма... Навошта тады займацца?..

У прыкметы накшталт «нельга сімвал надыходзячага года на мяса пускаць» Мурзічы не вераць. Дыетычная і лёгказасваяльная трусяціна — і гэта не сакрэт — не проста карысная для здароўя, але і вельмі неабходная, асабліва алергічным дзеткам. Толькі вось шкада, што не кожнай сям'і яна па кішэні. Напрыклад, у «Прасторы» кілаграм гэтага мяса каштуе ажно 28 тысяч.

— Як вы думаеце, чаму курацiна такая адносна танная? — разважае Андрэй. — Усё вельмі проста: яе шмат. Таму, як толькі ў Беларусі з'явіцца вялікая колькасць фермаў, дзе будуць разводзіць трусоў на мяса, кошт на трусяціну адразу ж упадзе.

— Чаму б не пачаць са Стаўбцоўскага раёна? — дзеліцца сваёй марай Людміла. — Не адкрыць пры падтрымцы раённай улады прамысловы цэх па вырошчванні бройлернай трусяціны, як мінімум на 500 матак. Пры гэтым, як нам бачыцца, цэх павінен працаваць у цеснай звязцы з мясцовым мясакамбінатам.

...А пакуль беларускія трусаводы вымушаныя збываць сваю прадукцыю «за трыдзевяць зямель» і несці пры гэтым дадатковыя транспартныя выдаткі, альбо аддаваць трусоў за мінімальны кошт перакупшчыкам.

— У ідэале падобны цэх павінен быць у кожным раёне, — лічыць сям'я Мурзічаў, — інвестараў жа знайсці не праблема. Мы, беларусы, у стане самі сябе забяспечваць трусяцінай, а не закупляць яе за мяжой.

### «ДАЧУШКА, ПА ЧЫМ ТРУСЫ?..»

Столькі, колькі з Мурзічамі, я даўно не смяялася. Хто-хто, а гэтыя жыццярадасныя людзі ў кішэню за казуснымі гісторыямі не лезуць.

— Неяк раз Андрэй забіў бельгійскага велікана і павесіў тушку за заднія лапы, каб зручней было пасля разбіраць, — пачынае Людміла. — Якраз у гэты дзень да нас прыехалі маладыя людзі за вушастымі. З імі быў стараэнькі дзядуля. Убачыў стары падвешанага труса і пытаецца: «Барана забіў?» Мы ледзь жывыя не надарвалі ад смеху. Калі пачалі тлумачыць дзядулю прычыну такога выбуху смеху, ён схапіўся за галаву і яшчэ доўга не мог паверыць, што бываюць такія вялікія трусы.

Яшчэ адну «хохму» распавёў Андрэй.

— Калі наша дачка была маленькая, я браў яе з сабой на кірмаш прадаваць трусоў. Неяк мне трэба было адысці на пару хвілін. Вяртаюся, а Віка ўся ў слязах. Я перапужаўся, пытаюся: «Што здарылася?» А малая злосна праз слёзы: «Не буду я больш твоих кроликов продавать!». Як высветлілася, пакуль мяне не было, да Вікі падышоў дзядуля і спытаў: «Дачушка, па чым твае трусы?». Супакоілася толькі тады, калі я ёй патлумачыў, што «кролики» гэта і ёсць трусы, толькі па-беларуску.

Распавёў спадар Мурзіч і паву-чальную гісторыю пра тое, як у яго маладыя «распальцаваныя» хлопцы хацелі набыць 100 трусоў. Маўляў, «бабкі хочам зашыбаць. Трусяціна на Камароўцы дарагая, а справа, кажуць, не надта пыльная».

— «Вы ўпэўненыя, што справіцеся з такой вялікай колькасцю?» — спытаўся я. «А што там спраўляцца, яны ж толькі сена ядуць ды вадой запіваюць», — пачуў у адказ. У выніку я ўгавaрыў іх набыць пяць самак і аднаго самца. Маўляў, «атрымайце першых дзяцей, выгадуйце да чатырох месяцаў, прадайце мясам і паліччыце, у колькі абышлося ўсё. А пасля, калі не расчаруецеся, прыязджайце, і я вам з радасцю прадам 100 самак. Дык што вы думаеце? Тэлефанавалі і абяцалі пару бутэлек каньяку прывезці за тое, што я іх адгаварыў ад гэтай справы, што не паспелі выкінуць грошы на вецер. Праўда, каньяк і дагэтуль вязуць... *(смяецца)*.

> **А малая злосна праз слёзы: «Не буду я больше твоих кроликов продавать!». Як высветлілася, пакуль мяне не было, да Вікі падышоў дзядуля і спытаўся: «Дачушка, па чым твае трусы?». Супакоілася толькі тады, калі я ёй патлумачыў, што «кролики» — гэта і ёсць трусы, толькі па-беларуску.**

— А вы за 20 гадоў не расчараваліся ў вясковым жыцці? — цікаўлюся на развітанне.

— Як бачыце, не, — не раздумваючы выпаліў Андрэй. — Інакш не жылі б тут. У нас у Мінску кватэра засталася, таму, калі б хацелі, даўно ўжо вярнуліся б.

— Пакуль у нас будуць сілы займацца трусамі, у горад не паедзем, — падтрымала мужа гаспадыня. — А тое, што мы жывём у вёсцы, ніколькі не замінае нам карыстацца гарадскімі дабротамі. Напрыклад, мы два разы на месяц наведваем тэатр. Тут жа да Мінска рукой падаць: 40 хвілін — і ты на кальцавой.

...

Робім вячэрні абход. Пільным вокам гаспадар глядзіць, каб усё было ў парадку: клеткі чыстыя, дастаткова было сена, камбікорму, вады, працавалі грэлкі і кіпяцільнікі.

— Недарэмна ж кажуць: «Хочаш, каб было добра, — рабі сам», — кажа Андрэй. — Вось мы і робім з Люсяй на пару. Сваіх гадаванцаў нікому не даваем.

Аднойчы даверылі, дык і зараз сабе гэтага не могуць дараваць, бо, калі вярнуліся, знайшлі ў клетках трусянят з пераламанымі лапамі.

— Справа ў тым, што трусы вельмі пужлівыя, яны, як агню, баяцца ўсяго нечаканага, — тлумачыць Людміла. — Таму ні я, ні Андрэй не заходзім на трусарню моўчкі. За некалькі метраў ад клетак пачынаем ціха прыгаворваць: «Зайцы, зайцы, мама (тата) ідзе, увага. Не пужаемся». Калі ж зайсці ціхенька, то трусяняты, якія ў гэты час спалі, па інерцыі могуць кінуцца ўбок і траўмаваць сабе лапы.

— Ёсць такая парода трусоў «рэкс», — дадае Андрэй. — Яны настолькі хуткія, што, калі спужаюцца, пераносяць наперад тулава так імкліва, што галава застаецца ззаду. У выніку яны ламаюць сабе шыю. Менавіта таму ў наступным годзе, сімвалам якога з'яўляецца гэтая жывёліна, лепш пазбягаць рэзкіх рухаў.

**Надзея ДРЫЛА, Фота аўтара.**
*Стаўбцоўскі раён.*


«А можа мне, замест папугайчыка, завесці дэкаратыўнага трусіка?» — падумала карэспандэнт «Звязды» пасля наведвання Мурзічаў.

**Да ўвагі!**

## У прыгарадных перавозках — змяненні

**Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», у святочныя навагоднія дні ў расклад руху прыгараднага аўтамабільнага транспарту будуць унесены карэктывы.**

Так, 1 студзеня адмяняецца выкананне рэйсаў па маршрутах №№ 1005, 1019, 1026, 1199, 1233, 1507, 1529, 1269, 1567. На маршруце № 1001 пяць аўтобусаў пачнуць працаваць з 10.00. Адмяняецца таксама выкананне рэйсаў па маршрутах: № 1501-Т «Мінск — Жодзіна» адпраўленнем ад АВ «Маскоўскі» ў 6.21, 6.43, 8.45, 9.10, 9.35, 11.02, 11.23, 15.50; № 1098-Т «Мінск—Лагойск» адпраўленнем ад АВ «Маскоўскі» ў 7.15; № 1198-Т «Мінск—Лагойск» адпраўленнем ад АВ «Маскоўскі» ў 7.00, 9.35; «Мінск—Барысаў» адпраўленнем ад АВ «Маскоўскі» ў 9.50. 2 і 7 студзеня адмяняецца выкананне рэйсаў па маршрутах №№ 1026, 1199, 1507.

## Транспарт у святочную ноч: да ёлкі і назад дадому

**У навагоднюю ноч маршруты сталічнага камунальнага транспарту з 0.00 да 5.00 раніцы будуць арганізаваны з інтэрвалам 15-16 хвілін.**

Гэта датычыцца наступных **аўтобусных** маршрутаў: № 1 «ДС «Вяснянка» — Вакзал», № 27 «ДС «Ангарская-4 — Сасновы Бор», № 91 «АВ «Маскоўскі — Вяснянка», № 95 «ДС «Славінскага» — Сцяпянка» (інтэрвал — 20 хвілін), № 100 «Аэрапорт «Мінск-1» — АВ «Маскоўскі» (інтэрвал — 8 хвілін); **тралейбусных**: № 1 «ДС «Зялёны Луг-7» — АВ «Маскоўскі», № 13 «ДС «Захад-3» — Гарадскі Вал», № 41 «ДС «Уручча-2» — ДС «Малініна», № 65 «ДС Малінаўка-4» — ДС «Дружная»; **трамвайных**: № 1 «Зялёны Луг» — Пл. Мяснікова», № 3 «Возера — Трактарны завод».

А праца наступных маршрутаў камунальнага пасажырскага транспарту будзе арганізавана да 3.00 з інтэрвалам 15-16 хвілін: **аўтобусных** — № 29 «ДС «Карастаянавай» — ДС «Кунцаўшчына», № 35С «ДС «Дружная» — Брылевічы», № 42 «ДС «Кунцаўшчына» — «Сухарава-6», № 52 «ДС «Лошыца-2» — Вакзал», № 72 «ДС «Шабаны» — Ст.м. Магілёўская», № 73 «ДС «Сярова» — Вяснянка», № 99 «ДС «Уручча-4» — 9-ы км», № 112С «АС «Аўтазаводская» — Пас. Сокал» (інтэрвал — 25 хвілін), № 113 «АВ «Маскоўскі» — Тубдыспансэр» (інтэрвал — 30 хвілін), № 121 «ГЦ «Ждановічы» — Сухарава-6»; **тралейбусных** — № 20 «ДС «Серабранка» — Вакзал», № 26 «ДС «Чыжоўка» — Кабушкіна», № 27 «ДС «Дружная» — Курасоўшчына», № 32 «ДС «Малінаўка-4» — Вакзал», № 48 «Сухарава — ДС «Кунцаўшчына», № 51 «ДС «Дружная» — Курасоўшчына», № 53 «ДС «Малінаўка-4» — ДС «Зялёны Луг-7», № 60 «ДС «Ангарская-4» — Ст.м. «Магілёўская», № 62 «ДС «Уручча-2» — ДС «Уручча-4». Праца метрапалітэна будзе арганізавана да 2.30.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



# ЧАЦВЕР, 6 СТУДЗЕНЯ

## ПЕРШЫ

**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**6.05, 1.25** Дзень спорту.
**6.10, 7.10, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**6.45** Nota Bene.
**7.05, 8.10, 18.50** Зона Х.
**7.30, 8.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**8.35** Зямельнае пытанне.
**9.10, 19.55** Серыял «Маргоша».
**10.10, 17.05** Серыял «Маршрут міласэрнасці».
**11.00, 17.55** Серыял «Маруся».
**12.10** Серыял «Сваты-4».
**14.05** «Невядомая версія. «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Сольны канцэрт Вітаса.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Святочнае багаслужэнне на Нараджэнне Хрыстова з Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора.
**23.45** Дзённік Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
**0.05** Меладрама «Дзеці Дон-Кіхота».

## АНТ

**6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!».
**10.25** Серыял «Мая жонка мяне прываражыла».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.35** Навіны спорту.
**11.10** Камедыя «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольная закупка».
**13.45** «Самы народны артыст. Мікалай Кручкоў».
**14.50** «Зразумець. Дараваць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** Серыял «Заручальны пярсцёнак».
**17.05** Серыял «Слова жанчыне».
**18.20** Серыял «Шчаслівыя разам».
**18.55** «Каляды».
**20.00** Час.
**21.05** Маст. фільм «Цар».
**23.40** Камедыя «Мая мама — нявеста».
**0.50** Драма «Шчаслівых Каляд».
**2.50** Начныя навіны.

## ЛАД

**6.35** Серыял «Універ».
**7.00** ЛАДная раніца.
**8.00** Тэлебарометр.
**8.05, 16.55** Серыял «Чыста англійскія забойствы».
**9.00, 18.00** Меладрама «Сіндром Фенікса». Заключная серыя.
**10.00** Меладрама «Пяшчотная зіма».
**13.45** Жансавет.
**14.20** «Дача здароўя».
**14.55** М/ф «Казка пра цара Салтана».
**15.50** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Серыял «Налётчыкі».
**19.05** Хакей. КХЛ. Тарпеда (Ніжні Ноўгарад) — Дынама (Мінск). У перапынку: Калыханка.
**21.15** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Жанчыны.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**23.55** Камедыя «Прадаецца дача».

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10** «СТБ-спорт».
**8.30** Фільм-казка «Каралеўства крывых люстэркаў».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** Серыял «Багатая і каханая».
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40, 17.30** «Званая вячэра».
**12.35, 18.30** Серыял «Дарослыя гульні».
**13.50** Мюзікл «Папялушка».
**16.00** Серыял «Дурні, дарогі, грошы».
**16.50** «Прывітанне, доктар!».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.35** Мюзікл «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі».
**22.55** Маст. фільм «Калядная містэрыя».
**0.40** Маст. фільм «Бібліятэкар 3: праклён юдавай чашы».

## МІР

**5.00, 13.05** Маст. фільм «Калматыя героі».
**6.30** «Цік-так».
**6.45** М/ф.
**6.55** «Эксперыментатары».
**7.10** М/ф «Дванаццаць месяцаў».
**8.05** «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
**8.35, 3.30** Маст. фільм «Трактарысты».
**10.15** «Любімыя акцёры».
**10.30** Маст. фільм «Штрафны ўдар».
**12.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці.
**12.10** «Хіт-экспрэс».
**14.30** «Даведнік».
**15.20** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20** Серыял «Баранеса Карыні».
**17.10** «Па хвалі маёй памяці».
**18.20** «Усоды жыццё».
**18.50** Маст. фільм «З пункту гледжання анёла».
**19.40** Маст. фільм «Калядная містэрыя».
**21.15** «Паўночнікі».
**22.00** Трансляцыя Нараджэння Хрыстова.
**0.00** Маст. фільм «Бераг яго жыцця».

## 8 КАНАЛ

**7.00, 10.55, 12.55, 14.40, 16.55, 18.35, 19.40, 21.10, 23.35** «Надвор'е».
**7.05, 17.30** Серыял «Прытворшчык».
**8.15, 16.25** «Расказы пра жывёл».
**8.40, 12.35, 15.40** «Кінаблакнот».
**9.00** «Венесуэла вачыма гурмана».
**9.30, 16.00** «Мультпарад».
**10.00, 19.45** Серыял «Горац».
**11.00** Меладрама «Тарыф на каханне».
**13.00** Серыял «Пуаро Агаты Крысці».
**14.45, 18.40** Серыял «Падары мне жыццё».
**17.00** «Мой любімы гадаванец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «К-гульні» — «Лайт».
**21.15** Меладрама «Зімовы раман».
**23.05** Знаёмства «Life».

## ВТБ

**6.00, 23.30** Інтэрактыўны блок «PLAY».
**8.00, 18.00, 23.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 13.00, 20.00** Серыял «Татавы дочкі».
**10.00, 15.00, 19.00** Серыял «Ранеткі».
**11.00, 14.00** Серыял «Цуды. com».
**12.00** Музычны блок «Forward».
**16.00** Камедыя «Без аглядкі».
**21.00** Камедыя «Шосты гулец».

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00, 14.20** М/ф.
**7.10** Камедыя «Людзі і манекены».
**8.35** «Гарадок».
**9.20, 18.50** Серыял «Еўфрасіння».
**10.10, 11.20** Меладрама «Безыменная зорка».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**12.55** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**13.50, 16.50, 19.50, 22.30** Навіны — Беларусь.
**14.30** Серыял «Громавы».
**17.00** «Ізмайлаўскі парк».
**17.50** Серыял «Чорная багіня».
**20.30** Маст. фільм «Бацькі і дзяды».
**22.00** «Царыца нябесная. Багародзіца Уладзімірская».
**22.40** Урачыстае Каляднае богаслужэнне.

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.40** Серыял «Узяць Тарантіну».
**6.25** «Лепшы горад Зямлі».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** «Сёння».
**8.20** Камедыя «Масквічы».
**9.05** «Цячэ Волга». «Праспяванае ў СССР».
**10.20** Серыял «Дзеці белай багіні».
**13.15** Люба, Любачка, Любоў. Канцэрт-споведзь Л. Успенскай.
**14.45** «Следства вялі...».
**15.35** «Справа густу».
**16.20** Серыял «Эра стральца».
**19.25** Серыял «Павуцінне».
**23.05** «Прыгажосць. Гісторыя ўсерасійскага падману».

## ТНТ

**5.00** М/с «Як кажа Джынджэр».
**6.00** М/с «Дзеткі падраслі».
**6.55** «Нікеладэон на ТНТ».
**8.05, 23.30** Серыял «V-візіцёры».
**9.00** «Бітва экстрасэнсаў».
**16.20** Камедыя «Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара».
**18.30** «Камедзі Клаб». Лепшае.
**19.00** Камедыя «Астэрыкс і Абелікс: місія Клеапатра».
**21.00, 0.20** «Камедзі Клаб».
**22.00, 2.20** «Дом-2».
**1.20** «Comedy Woman».
**3.20** «Інтуіцыя».
**4.20** Серыял «Саша + Маша».

## КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** Навіны культуры.
**9.15, 1.50** Праграма перадач.
**9.25** Фільм-казка «Залатыя рогі».
**10.40** «Кірые элейсон». Дак. фільм.
**11.30** «Дванаццатая ноч». Маст. фільм.
**13.00, 0.55** «Экватар». Дак. серыял.
**13.55** Спектакль «Калядныя мроі».
**16.15** Маст. фільм «Музыка жыцця».
**18.00** Мікалай Кручкоў. «Астравы».
**18.40** Маст. фільм «Трактарысты».
**20.10** «Лінія жыцця». Уладзімір Федасееў.
**21.00** Г. Свірыдаў. «Завея».
**21.35** «Чайкоўскі». Маст. фільм.
**0.05** «Кірые элейсон». Дак. фільм.

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Рытмы планеты». Навагодняя праграма. 1985 год.
**6.05** Дак. фільм «Слова даецца адвакату».
**6.40, 12.40** Маст. фільм «Што такое «Ералаш»?».
**8.00, 14.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР». Лепшае.
**10.10** «Навагодні мультканцэрт». 1985 год.
**11.00, 17.00** «Калядныя сустрэчы. Тэатр песні Алы Пугачовай». 1989 год.
**12.10** Дак. фільм «Жаночы погляд на мужчынскія праблемы».
**16.05** «Галіна Уланава». «Пра балет». 1972 год.
**18.10** Дак. фільм «Увага — тыгры!».
**18.40** Маст. фільм «Пра ката».
**22.00** Дак. фільм «Уладары без масак».
**22.35** «Любімыя мелодыі мінулых гадоў».
**23.00** «Раніцай». Навагодні мультклас. 1991 год.
**0.10** Дак. фільм «Абавязковая праграма».
**0.40** Маст. фільм «Навагоднія прыгоды Машы і Віці».
**4.10** «Аншлаг». 1983 год.

## НАША КІНО

**6.30, 12.30** Меладрама «Жанчыны».
**8.30** Маст. фільм «Новы Гулівер».
**9.40** Маст. фільм «Мішэль і Мішутка».
**10.30, 16.30** Камедыя «Кар'ера Дзімы Горына».
**14.30** Дэтэктыў «Пятроўка, 38».
**18.30, 0.30** Камедыя «Трактарысты».
**20.30, 2.30** Дэтэктыў «Агарова, 6».
**22.30, 4.30** Казка «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі».
**23.40, 5.40** Камедыя «Жадаю вам...».

## ДОМ КІНО

**4.00** Камедыя «Дайце кнігу скаргаў».
**5.30** Дэтэктыў «Чыста англійскае забойства».
**8.10** Казка «Маленькая прынцэса».
**9.40** Камедыя «Любовь-морковь 2».
**11.10** Драма «Высакосны год».
**12.45** Камедыя «Дзелавыя людзі».
**14.10** Камедыя «Шумны дзень».
**15.45** Камедыя «Французъ».
**17.30, 1.30** Серыял «Танга з анёлам».
**20.00** Меладрама «Пра Любoff».
**21.55** Маст. фільм «Ванечка».
**23.40** Камедыя «Перакрыжаванне».

## ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Драма «Пацалунак змяі».
**11.00, 19.00, 3.00** Драма «Аляксандр. Неўская бітва».
**13.00, 21.00, 5.00** Меладрама «Удалечыні ад яе».
**14.55, 22.55, 6.55** Драма «Прытулак анёлаў».

## ТБ1000

**3.00, 21.00** Драма «Мяне там няма».
**5.10** Камедыя «Самы лепшы тата».
**7.00** Трагікамедыя «Два дні ў Парыжы».
**9.00** Драма «Шчасце Эмы».
**11.00** Камедыя «Асцярожна, дзверы зачыняюцца!».
**13.00** Драма «Аўгуст Раш».
**15.00** Драма «Апошні бой».
**17.00** Драма «Калі ты ў апошні раз бачыў свайго бацьку?».
**19.00** Камедыя «Залегчы на дно ў Бругу».
**23.20** Жахі «Пякельны бункер».
**1.00** Трагікамедыя «Ведаць бы, што я геній».

## ТБ3

**5.00** Маст. фільм «Дачка Махараджы». Частка 1-я.
**7.00** М/ф «Бакуган».
**8.00** М/ф «Казкі Альфа».
**8.30** М/ф «Том і Джэры: Гісторыя пра Шчаўкунчыка».
**9.30** Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга».
**11.30** «Хатні рэстаран».
**12.30, 16.00** «Тайны вялікіх магаў».
**13.30** «Далёка і яшчэ далей».
**14.15** Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры». Частка 1-я.
**17.00** Маст. фільм «Краіна фей».
**20.00** «Святыя. Тайна цудатворцы Спірыдона».
**21.00** «Святыя. Ідэальны шлюб Пятра і Фяўронні».
**22.00** «Святыя. Калядны цуд Мікалая Угодніка».
**23.00** Серыял «Зорныя вароты». Лепшыя серыі.
**1.00** Маст. фільм «Поўнач супраць поўдня».

## РАМАНТЫКА

**7.00, 16.55, 21.20, 5.20** «Тайна Лауры».
**7.55, 10.40, 20.30** «Анучная лялька».
**8.50, 14.10, 0.55** «Ніколі не позна?».
**9.45, 15.05, 3.35** «Сямейныя вузы».
**11.30, 17.45, 2.40** «Гатуем разам з Анхелем Ласана».
**12.25, 1.50, 6.10** «Жанчыны на сцежцы вайны».
**13.20, 23.05, 4.30** «Дора на варце парадку».
**16.00, 19.35, 22.10** «Дасканалая прыгажосць».
**0.00** «Прысутнасць Аніты».

## DIVA UNIVERSAL

**5.00, 2.30** Серыял «Дочкі Маклеода».
**5.45, 15.10, 0.50** Серыял «Вайна Фойла».
**7.25** Маст. фільм «Багаж на выхадныя».
**8.55** Маст. фільм «Лепшая пара года».
**10.25** Маст. фільм «Анёл Каляд».
**12.00** Маст. фільм «Давай пажэнімся».
**13.35** Маст. фільм «Раман па перапісцы».
**16.50, 23.10, 3.20** Серыял «Забойствы ў Мідсомеры».
**18.30** Маст. фільм «Выратаваць казку».
**20.05** Маст. фільм «Рэстараны раман».
**21.40** Маст. фільм «Кніга жаданняў».

## SY FY

**7.30, 13.20** Зачараваныя.
**9.10, 15.00** Пункт прызначэння — праўда.
**10.00, 15.50, 1.30** Лоіс і Кларк.
**11.40** Склад № 13.
**17.30** Легенда пра Шукальніка.
**18.30** Драма «Горад у агні».
**20.00** Драма «Стыгматы».
**21.40** Драма «Лавец сноў».
**23.55** Жахі «Прывід Хартленда».

## ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00** Камедыя «Канікулы Пятрова і Васечкіна. Звычайныя і неверагодныя».
**6.10, 10.10, 14.00** М/с «Аповеды старога марака». М/ф «Шэры воўк энд Чырвоная Шапачка».
**7.00, 11.00** Казка «Як грыбы з гарохам ваявалі»; м/ф: «Юля-капрызуля», «Сіняволька», «Чаму ослік заўпарціўся?».
**8.00, 12.00** Казка «Велікан-эгаіст»; м/ф: «Страла ляціць у казку», «Піражок».
**13.00, 15.00** Маст. фільм «Камертон».
**16.00** М/с «Кацяня па імені Гаў»; м/ф: «Саступіце мне дарогу», «Мы за сонейкам ідзём».
**17.00** Казка «Маладзільныя яблыкі»; м/ф: «Баранкін, будзь чалавекам!», «Жалезныя сябры».
**18.00** Казка «Шкатулка з сакрэтам»; м/ф: «Цімошкава елка», «Роўна ў 3.15...».

## ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Правілы здароўя.
**5.35, 13.35, 20.35, 4.35** Жыццё або Смерць?
**6.00, 21.00** Вялікая прабежка.
**6.40, 21.40** Гісторыя хвароб.
**7.10, 17.40, 22.10** Набалелае пытанне.
**8.00, 23.00** Пазнай сябе.
**8.35, 23.35** Я пераможу гэты боль.
**9.05, 9.50, 12.20, 12.50, 15.50, 18.45, 0.50, 3.20** Азбука здароўя.
**9.10, 0.10** Памылкі здароўя.
**9.55, 12.25, 15.55, 0.55, 3.25** Ты тое, што ты ясі.
**10.30, 1.30** Тайны медыцыны.
**11.00, 2.00** Нетрадыцыйная медыцына.
**11.40, 2.40** Выкрыццё прадуктаў.
**12.55** Элемент здароўя.
**14.00** Як не страціць здароўе.
**14.40, 19.30** Зялёная аптэка.
**15.20** Колькі вам гадоў?
**16.30** Я расту.
**17.00** Пра дыеты і не толькі.
**18.30** Энцыклапедыя памылак.
**18.50** Клінічны гіпноз.
**3.55** Школа розуму.

## ТДК

**6.00, 7.50, 12.50, 14.10, 16.55, 17.50, 18.50, 1.30** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 15.00, 22.20** Усё лепшае, для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 23.30, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00** Шлях поспеху.
**13.00** Філасофія здароўя.
**13.30, 2.00** Нашы дзеці.
**14.30** Маю права.
**16.00, 20.00** «Ваш асабісты псіхолаг».
**17.00** Красуня.
**19.00, 22.30** Люстэрка жыцця.
**21.00, 0.00** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Гісторыя поспеху.
**4.00** Твой дом.

## DISCOVERY

**7.00** Вялікія і хуткія.
**7.25, 15.15** Брудная работка.
**8.20, 19.00, 5.10** Як гэта ўстроена?
**8.50, 19.30, 5.40** «З чаго гэта зроблена?».
**9.15, 18.00, 3.50** Разбуральнікі легендаў.
**10.10, 2.55, 6.05** Лабараторыя выбуховых ідэй.
**11.05** Выжыць любой цаной.
**12.00, 17.05** Зброя будучыні.
**12.55, 20.00, 1.00** «Top Gear».
**13.50** «Круты цюнінг».
**14.45** «Пятая перадача».
**16.10, 0.00** «Бяспека межаў».
**21.00, 2.00** Монстры ўнутры мяне.
**22.00** «Discovery Channel» выратаваў мне жыццё.
**23.00** Выжыць у катастрофе.
**4.45** «Маланкавыя катастрофы».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 18.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00, 14.00** Жан-Мішэль Кусто: акіянскія прыгоды.
**7.00, 12.00** Падарожжа па планетах.
**8.00, 13.00** Тайны старажытнасці.
**9.00, 15.00** Укусі мяне, або Падарожжы вірусолага.
**10.00, 16.00, 4.00** Мяжа.
**11.00, 19.00** Зона будаўніцтва.
**11.30, 19.30** Я не ведаю гэтага.
**17.00** Расследаванні авіякатастроф.
**20.00, 23.00, 2.00** Анаконда: каралева змей.
**21.00, 0.00, 3.00** Адзін акіян.
**22.00** Амазонія.
**1.00** Тайны гісторыі.
**1.30** Секунды да катастрофы.

## TRAVEL

**5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 21.00, 2.00** Сусветны падарожнік.
**6.00, 12.30** Раскошныя падарожжы з Варунам Шармай.
**7.00, 8.30, 13.30, 16.00** Галівуд і вінаград.
**7.30** Падарожжы сёння.
**8.00, 15.30** Сафі Грыгсан едзе на Усход.
**9.00, 22.00, 3.00** Бясстрашныя падарожнікі.
**11.00** Планета ежы.
**12.00, 16.30** Індыйскі баль.
**15.00** Рудзі Макса падарожнічае па свеце.
**18.00, 23.00** Рэкі свету.
**19.00, 0.00** Зямля качэўнікаў.
**20.00, 1.00** Па рэйках.
**4.00** Даведнік для шукальнікаў прыгод.
**4.30** Вялікая рыба.

## ANIMAL PLANET

**7.00** Маёнтак сурыкатаў.
**7.25** Планета дзікіх.
**7.50** «Прыгоды панды».
**8.40** Усё пра сабак.
**9.10, 6.10** «Самыя нясцерпныя ручныя жывёлы Брытаніі».
**10.05, 14.40** Як выжыць жывёлам?
**11.00** «Тэрыторыя жывёл».
**11.55** «SOS дзікай прыроды».
**12.50** Паліцыя Х'юстана. Аддзел па абароне жывёл.
**13.45** «Таварыства па выратаванні жывёл».
**14.10** Ветэрынары-стажоры.
**15.30, 20.10** Перакладчык з сабачай.
**16.30** Як стаць Ільвом.
**17.25** Сабакі, коткі і іншыя ўлюбёнцы.
**18.20** «Ветэрынар у дзікай прыродзе».
**19.15, 1.40** Уводзіны ў сабаказнаўства.
**21.05, 2.35** Паляўнічы на яд.
**22.00, 3.30** На волю з пітбулем.
**22.55, 4.25** Коста-рыканскія кракадзілы-забойцы.
**23.50, 5.20** Дзікія і небяспечныя.
**0.45** Выжыванне ў засуху.

## EUROSPORT

**9.30, 21.45, 0.00, 2.00** Ралі Дакар.
**10.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**10.45, 12.15** Санны спорт. Кубак свету. Мужчыны.
**11.45, 16.45, 0.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**13.15, 19.45, 1.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**14.00** Санны спорт. Кубак свету. Каманды.
**15.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
**15.45, 18.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам.
**20.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**22.15** Дартс. Чэмпіянат свету.

## MTV

**5.00, 1.10** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца.
**8.00** «Крутыя бабры».
**8.25** «Котасабака».
**8.50** «Губка Боб».
**9.15** Тачку на пракачку.
**9.40** Тайныя спакусы курортнага гатэля.
**10.05, 23.35** Наступны.
**10.30, 0.00** Спатканне на выжыванне.
**10.55, 0.25** Шалёныя продкі.
**11.20, 0.50** Ужо можна.
**11.45** Сяброўка Пэрыс Хілтан.
**12.35, 17.15** Бітва візажыстаў.
**13.25, 18.05** «Шопаголікі».
**14.20, 19.00** Серыял «Ранеткі».
**15.15, 19.55** Серыял «Распешчаныя».
**16.10, 20.50** Серыял «Сэкс у вялікім горадзе».
**21.50** Серыял «Два з палавай чалавекі».
**22.40** Серыял «Клініка».
**23.10** Серыял «Клава, давай!».

## ІНТЭР+

**6.55** Маст. фільм «Вясковы дэтэктыў».
**8.25** Маст. фільм «У чаканні цуду».
**9.40, 18.25, 1.25** Песня года 2010.
**11.15, 20.30** Серыял «Заручальны пярсцёнак».
**12.10** Маст. фільм «Аніскін і Фантамас».
**14.25** Формула кахання. Уладзімір Зяленскі.
**15.10** Мюзікл «Ноч у музеі».
**17.05, 21.20** Маст. фільм «Перыкола».
**20.00, 3.00** Інфармацыйны канал «Падрабязнасці».
**22.40** Феерыя падарожжаў.
**23.00** Раджэственскае богаслужэнне.
**0.25** Канцэрт ансамбля «Пікардыйская Тэрцыя».
**3.30** Навагодні агеньчык.

## 23.40 ФІЛЬМ ДНЯ

**«МАЯ МАМА — НЯВЕСТА» (Расія, 2004 г.)**

Маладая жанчына Лара, дзякуючы сваёй прыстойнасці, раптоўна пазбаўляецца мужа, працы і кватэры. І тады за ўладкаванне асабістага жыцця маці бярэцца 10-гадовы Ваня. Некалькі мудрагелістых камбінацый — і ён ужо вядзе Лару ў багаты асабняк бізнэсмена Іваноўскага, які разводзіцца з жонкай...



**Рэжысёр** — Наталля Радзівонава. **У ролях:** Аляксандра Буданава, Аляксей Нілаў, Антон Валовік, Іван Агапаў.

Галоўны беларускі ўфолаг Ілья БУТАЎ:

# «Прывід Гальшанскага замка скраў нашую апаратуру!..»

## У час Калядаў і Новага года — пары містычнай і таемнай — спецыяльны карэспандэнт «Звязды» размаўляе з адмыслоўцам па НЛА, палтэргейсце ды іншых беларускіх анамаліях

**Ілья Бутаў — старшыня Беларускага ўфалагічнага камітэта. Гэта адзінае ў Беларусі таварыства, якое займаецца праблемамі лятаючых талерак, палтэргейстаў, метэарытаў, анамальных з'яў, прывідаў ды старадаўніх таямнічых абсерваторый. УфаКам (так скарочана называюць таварыства ягоныя сябры) заснаваны ў 2001 годзе. Ілья ўваходзіць у яго ад самага пачатку. Ён — прафесійны біёлаг, скончыў аспірантуру, цяпер з'яўляецца супрацоўнікам навукова-даследчага інстытута ў Мінску. Спадар Ілья не вельмі любіць, калі іх таварыства ўспрымаюць выключна як зборышча дзівакоў — аматараў лятаючых талерак. Таму пра гэта мы размаўлялі найменей. Аднак і апроч прыбышоў з зялёнымі вушамі ў нас, як высветлілася, хапае цікавых анамалій.**



Загадкавыя камяні ў мястэчку Сцібуракі.

### «Адзін з заснавальнікаў нашага камітэта знік...»

— Ад 2005 года мы сталі таксама прадстаўніцтвам міжнароднай арганізацыі «Касмапошук», — кажа спадар Ілья. — Гэта дазваляе нам трымаць шчыльныя кантакты з аднадумцамі іншых краін. УфаКам узнік у 2001 годзе ў Гомелі — там сабраліся аднадумцы, якія вырашылі аб'яднацца. Сход адбываўся на кватэры аднаго гамельчука. Цяпер ён знік, не выходзіць на сувязь, перастаў адказваць на лісты, званкі, мы не ведаем, дзе ён падзеўся...

***— Здаецца, добрая легенда для аднаго з заснавальнікаў таварыства ўфолагаў...***

— Ну так! Аднак я ж не кажу, што яго прыбышы забралі!.. Магчыма, у чалавека змяніліся інтарэсы — і ён аддаліўся ад гэтага...

***— Вы сябар арганізацыі ад самага пачатку?***

— Так, цяпер я — адзіны чалавек, які ў арганізацыі ад першых дзён...

***— Адзіны, які яшчэ не знік?..***

— Ну, «знік» толькі адзін чалавек, калі так казаць. Проста склад арганізацыі змяніўся, цяпер наш касцяк — навукоўцы, людзі, якія скончылі аспірантуру. Мы стараемся пазбягаць акультных, містычных азначэнняў. А некаторым было цікава менавіта гэта — эзатэрычны складнік нашай дзейнасці. Яны аддзяліліся.

***— Вашае таварыства вядзе актыўную дзейнасць, вы часта сустракаецеся?***

— У цяперашні час, калі моцна развіўся інтэрнэт, мабільная сувязь — збольшага кантактуем такім чынам. Але стабільна раз на год ладзім злёт беларускіх уфолагаў. Сёлета гэта было ў Крэве, непадалёк ад замка. Такія сустрэчы традыцыйна праходзяць ці ў нейкай анамальнай зоне, ці ў гістарычным легендарным месцы...

***— Я так разумею, Крэва трапіла пад абодва крытэры?***

— Так! Там фіксаваліся незвычайныя з'явы. І славутая гісторыя замка спрыяла добрай атмасферы сустрэчы. З замкам звязаныя легенды аб прывідах, таму мы наведвалі яго ў начны час, рабілі там замеры апаратураю. Мясцовыя ўлады, дарэчы, паспрыялі нам, вылучылі месца, нават дровамі для вогнішча дапамаглі, дзякуй ім!

### «У падзямеллі Гальшанскага замка гадзіннік стаў паказваць іншы час!»

***— Дык народ не дарма гаворыць, што ў старых замках жывуць прывіды?***

— Мы даследавалі пакуль не ўсе замкі Беларусі. І ў нас няма таго набору інструментаў і прыбораў, які хацелася б мець, які маюць уфолагі з іншых краін. Але, скажам, у Гальшанскім замку мы правялі даследаванне самай рознай апаратурай, у тым ліку пазычанай у нашых калег з Расіі. Былі атрыманы вельмі цікавыя вынікі! Некаторыя могуць падацца нават кур'ёзнымі — падчас даследаванняў у замку ў нас знік прыбор з замкнёнага пакоя!.. Яго так і не знайшлі! Вось вам — прывід Гальшанскага замка скраў апаратуру!.. *(усміхаецца)* Дакладна — там нешта ёсць. Мы апытвалі відавочцаў, якія бачылі прывід. Назіралі цікавыя сведчанні прыбораў. У замку была таксама экспедыцыя з расійскага «Касмапошуку». Яны таксама зафіксавалі шмат анамальных з'яў. Напрыклад, адзін з эксперыментаў заключаўся ў тым, што два спецыяльныя гадзіннікі былі настроеныя абсалютна аднолькава. Пасля чалавек спусціўся на некаторы час у падзямелле Гальшанскага замка. А калі падняўся на паверхню — паказанні гадзіннікаў адрозніваліся! У лёхах замка час пайшоў па-іншаму!

***— Паводле якіх крытэраў вы праводзіце даследаванне, калі прыязджаеце ў экспедыцыю «па слядах прывіда»?***

— У залежнасці ад характару з'явы. Калі гэта прывід — на асноўны план выходзіць фота- і відэафіксацыя. Таксама змена тэмпературных паказчыкаў у месцы анамаліі, калі самапісцы рэгіструюць нязвыклыя скачкі тэмпературы. Ёсць новая распрацоўка — «генератар выпадковых лікаў». Умоўна кажучы, калі вы возьмеце кубік і кінеце сто разоў, то ў Мінску, Гомелі і Паставах ён будзе падаць прыкладна аднолькава. А ў анамальным месцы — напрыклад, старадаўнім замку — ён падае інакш, асаблівым чынам!.. Выкарыстоўваем таксама іншае абсталяванне.

***— Дык навукоўцы таксама карыстаюцца тэрмінам «прывід»?***

— Я ўжываю яго ў якасці народнага падання. Мы не кажам пра прывід. Мы кажам пра незвычайныя паказанні прыбораў. Быў выпадак, калі з дыктафону, які зафіксаваў незразумелыя галасы, сцёрся раптам увесь запіс!..

***— А чаму атрымліваецца, што анамальнае месца — роўненька ў замку, а не за 300 метраў ад яго?***

— Пэўна ніхто сказаць не можа. Магчыма, таму, што знакавыя будынкі ўзводзілі каля культавых месцаў. Ёсць звесткі, што Гальшанскі замак збудаваны каля старадаўняга капішча — і менавіта там назіралі Багародзіцу!..

### «На могілках у Крычаўскім раёне зафіксавалі палтэргейст...»

***— Адзін з кірункаў дзейнасці арганізацыі — даследаванне з'явы палтэргейсту. Ёсць такое ў нас?***

— Не так даўно да нас паступіў сігнал, што на закінутых могілках пад Крычавам назіраюцца дзіўныя з'явы... Мы арганізавалі там дзяжурства, у часе якога адзін з сяброў арганізацыі на свае вочы пабачыў прывід! Потым, праўда, з'явілася версія пра тое, што гэта ў траве варушыліся вожыкі… Калі туды паехала наша экспедыцыя, сталі адбывацца незразумелыя рэчы! Проста на нашых вачах павалілася дрэва. І не старое спарахнелае, а маладое моцнае дрэва! Гэта падыходзіць да азначэння палтэргейсту, бо «палтэргейст» — гэта «шумны дух». Пры ягонай праяве могуць назірацца перамяшчэнні прадметаў па паветры, іх узгаранне, з'яўленне, знікненне прадметаў, перамяшчэнне сілуэтаў па кватэры. Бываюць зусім фантастычныя рэчы — падушка можа апынуцца ў лядоўні!

***— Што, і такое ў нас бывала?!***

— Канкрэтна гэты прыклад быў у Расіі. У нас у Мінску і ў ваколіцах Мінска былі выпадкі, калі самі па сабе дакументы, пашпарт, кнігі рваліся на дробненькія шматочкі. Былі самазагаранні прадметаў — загараўся матрац, адзенне. На падлозе з'яўляліся сляды. Знікалі залатыя рэчы, грошы.

### «Пад Полацкам знайшлі старадаўнюю абсерваторыю...»

***— А ёсць у нас свой Стоўнхэндж?***

— Менавіта так называюць адно месца ў Полацкім раёне, на возеры Янава! Туды былі арганізавана ўжо чатыры экспедыцыі, у тым ліку сумесна з супрацоўнікамі Інстытута гісторыі. Там знаходзіцца комплекс, які назвалі «Камяні». З кожнай паездкай там узнікае ўсё больш пытанняў і загадак, таму будзем ездзіць яшчэ. Комплекс выглядае, як літара «П», выкладзеная з камянёў сярэдняга памеру. Мы спадзяёмся адшукаць «пятачны» камень, які мусіць быць недзе непадалёк. Гэта камень-арыенцір. Калі людзі стаялі ў сярэдзіне літары «П» і над гэтым каменем з'яўлялася Сонца — людзі ведалі, што гэта, скажам, дзень летняга сонцастаяння. Ёсць сведчанні, што непадалёк ёсць і іншыя камяні, размешчаныя загадкавым чынам. Таксама быў шэраг экспедыцый ва ўрочышча Купа пад Оршаю, дзе таксама ёсць камяні, размешчаныя ў дзіўным парадку. Пра гэтае месца ідзе шмат спрэчак. Мы расчысцілі яго, правялі суботнік. Мяркую, гэты комплекс таксама можа мець астранамічнае прызначэнне.

***— Дык такіх абсерваторый было шмат?***

— Штогод мы даследуем усё новыя месцы, атрымліваем новыя паведамленні ад людзей. Нядаўна даследавалі такі комплекс у мястэчку Сцібуракі на Міншчыне. Гэта камяні, арыентаваныя на Палярную зорку. Яны маюць шмат сімвалаў, напрыклад, у выглядзе перакуленых рагоў жывёлы. Зразумела адно — нашы продкі былі вельмі дасведчаныя, умелі атрымліваць надзвычай карысную для сябе інфармацыю ад назіранняў за небам...

***— Ілья, я ведаю, што метэарыты таксама трапляюць у сферу цікавасцяў УфаКама...***

— Так, бо гэта — камяні, якія прыляцелі з космасу, якія могуць даць нам пэўную інфармацыю пра космас. Метэарытаў у Беларусі не так шмат, таму кожны з іх — надзвычай важны для нашай навукі. У Музеі метэарытаў у Мінску паказаныя тыя аскепкі, якія ў нас ёсць. Увогуле, у цэлым свеце метэарытаў знойдзена меней, чым за адзін год здабываецца золата! Таму кожны з іх надзвычай каштоўны для навукі. Мне вельмі шкада, што за апошнія гады ў нас былі фактычна згорнутыя пошукі і даследаванні метэарытаў. А ў заканадаўстве метэарыты апісаныя так туманна, што іх можна спакойна вывозіць за мяжу — ніхто не затрымае! Я сустракаўся з высокім чыноўнікам з Міністэрства прыродных рэсурсаў, і ён абяцаў, што сітуацыя зменіцца.

### «Штогод каля 10 сігналаў пра НЛА выглядаюць праўдзівымі...»

***— Ілья, у большасці людзей слова «ўфолаг» асацыюецца выключна з НЛА і лятаючымі талеркамі... Прылятаюць да нас такія?***

— Летась мы падвялі вынікі за 10 гадоў назіранняў. Паведамленняў ад людзей паступае вельмі шмат, але маем справу як з НЛА, так і з псеўда-НЛА. Часта людзі ўважаюць за НЛА спадарожнікі, атмасферныя з'явы, нейкія пражэктары...

***— А сапраўдныя трапляюцца?***

— Пры дэталёвым аналізе большасць падобных паведамленняў удаецца растлумачыць аб'ектыўнымі прычынамі. Але штогод здараецца каля дзясятка паведамленняў, якія сапраўды патлумачыць нельга! Я не кажу, што гэта іншапланецяне, гэта проста нявызначаныя аб'екты, якія мы не можам патлумачыць. На Берасцейшчыне ў адной вёсцы назіралі НЛА ўжо некалькі разоў. Там часта бываюць шаравыя маланкі. Над гэтым месцам часам псуюцца прыборы ў самалётаў — пра гэта нам паведаміў адзін лётчык. Мы ўжо колькі разоў ездзілі туды — сапраўды, прыборы зашкальваюць!..

***— А што беларусы часцей за ўсё прымаюць за НЛА?***

— Шмат такога! Мы даследавалі таксама ўжо два выпадкі кругоў на палях. Пакуль што ёсць сумневы ў іх праўдзівасці... Цяпер на вяселлях модна запускаць «кітайскія ліхтары», якія сапраўды здалёк выглядаюць як НЛА! Таму штотыдзень увечары пятніцы-суботы атрымліваем масу такіх «сігналаў!» Запомніўся выпадак, як па тэлевізары паказалі сюжэт, што жыхары аднае вёскі ўсе да аднаго назіралі НЛА. Зразумела, мы выехалі туды. А там і чуць пра такое не чулі! Нехта проста выдумаў гэта!

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота прадастаўлена Беларускім уфалагічным камітэтам.**

### ПАБАЧЫЎ НЛА — ПАВЕДАМЛЯЙ!

*На сайце Беларускага ўфалагічнага камітэта http://www.ufocom.net ёсць кантакты каардынатараў арганізацыі па ўсіх абласцях Беларусі. Калі ведаеце пра нешта, што можа зацікавіць уфолагаў — паведамляйце (а паралельна — у «Звязду»!) Электронны адрас Ільі Бутава ufocom@tut.by, скайп ufocom_butoff.*

### «ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ, БАЧУ НЛА!» Байка ад уфолагаў

*Гэтую байку распавядаюць ужо даўно, цяжка сказаць, якая там доля праўды. Сэнс такі. Чалавек у Мінску выйшаў паліць папяроску на балкон і пабачыў у небе круглы аб'ект, які рухаўся і свяціўся!.. Прычым не проста рухаўся, а — туды-сюды, туды-сюды... Мужчына неадкладна выклікаў спецыялістаў. Пакуль чакаў, паспеў змерзнуць у сямейных трусах, «пільнуючы» НЛА. Высветлілася, што на даху Педагагічнага ўніверсітэта быў усталяваны магутны пражэктар, які для забавы паспалітага люду свяціў прамянём туды-сюды па вечаровым небе! Мужчыну тым не менш падзякавалі за пільнасць і папрасілі паведамляць у выпадку чаго.*



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**01.02.2011 в 11.00 по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. № 204 по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на три года для использования в целях размещения офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств), оказания услуг по бытовому обслуживанию населения**

| Организатор аукциона | РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А. | | | |
|---|---|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 |
| Местонахождение имущества | г. Гродно, ул. Пестрака, 36, здание АТС. | Гродненская обл., г. Лида, ул. Чапаева, 3, здание АТС. | Гродненская обл., г. Лида, ул. Тельмана, 10, здание РУЭС. | |
| Характеристика имущества, входящего в состав лота | Часть помещения на 5-м этаже. Имеется естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, телефонизировано. Требуется проведение дополнительных работ по разграничению арендуемого помещения. | Отдельные помещения на 4-м этаже. Имеется естественное освещение, центральное отопление, канализация, электроснабжение, телефонизировано. Помещения требуют перепланировки, реконструкции и ремонта, этажи имеют высоту около 5 метров на три лестничных пролета, высота 4-го этажа соответствует 7-му этажу в обычном здании, лифт отсутствует, необходимо отгораживать часть территории на земельном участке от территории РУП «Белтелеком» для свободного прохода посторонних посетителей. | Отдельные помещения на 1-м этаже. Имеется естественное освещение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизировано. В помещении отсутствует водоснабжение, канализация, санузел находится на улице. | |
| Площадь имущества, кв.м | 212,0 | 320,29 (276,39 + 2,2 + 6,9 + 27,0 + 7,8) | 23,2 (11,1+12,1) | 16,9 |
| Коэффициент от 0,5 до 3,0 | 2,0* | 2,0* | 2,0* | 2,0* |
| Начальная цена, руб. | 1 855 000 | 2 802 540 | 203 000 | 147 875 |
| Размер задатка, руб. | 185 500 | 280 254 | 20 300 | 14 788 |

** – При наличии более 2 участников аукциона коэффициент увеличивается на 0,5.*

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору следующие документы: заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, копию платежного документа о перечислении задатка, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет 3012000000225 в филиале 426 АСБ «Беларусбанк» код 199, УНП 500826567 Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. 202 **с 31.12.2010 по 31.01.2011 включительно** в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 31.01.2011, не рассматриваются.

**Телефоны для справок (0152) 43 25 71, 48 65 95, факс (0152) 72 02 07.**

# 2011

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Праваслаўны каляндар

**ПАСХА (ВЯЛІКДЗЕНЬ) — 24 КРАСАВІКА**

### ДВУНАДЗЯСЯТЫЯ СВЯТЫ

| | |
|---|---|
| 7 студзеня | Раство Хрыстова |
| 19 студзеня | Хрышчэнне Гасподняе (Вадохрышча) |
| 15 лютага | Стрэчанне Гасподняе |
| 7 красавіка | Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы |
| 17 красавіка | Вербная нядзеля |
| 2 чэрвеня | Узнясенне Гасподняе |
| 12 чэрвеня | Пяцідзясятніца (Троіца) |
| 19 жніўня | Праабражэнне Гасподняе (Яблычны Спас) |
| 28 жніўня | Успенне Прасвятой Багародзіцы |
| 21 верасня | Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы |
| 27 верасня | Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга |
| 4 снежня | Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы |

### ВЯЛІКІЯ СВЯТЫ

| | |
|---|---|
| 14 студзеня | Абрэзанне Гасподняе |
| 7 ліпеня | Нараджэнне Іаана Прадцечы |
| 12 ліпеня | Святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла |
| 11 верасня | Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы |
| 14 кастрычніка | Пакроў Прасвятой Багародзіцы |

### ШМАТДЗЁННЫЯ ПАСТЫ

| | |
|---|---|
| Вялікі пост | з 7 сакавіка да 23 красавіка |
| Пятроў пост | з 20 чэрвеня да 11 ліпеня |
| Успенскі пост | з 14 жніўня да 27 жніўня |
| Пост перад Раством Хрыстовым | з 28 лістапада да 6 студзеня 2012 года |

### АДНАДЗЁННЫЯ ПАСТЫ

Серада і пятніца на працягу ўсяго года, за выключэннем усёедных тыдняў і Каляднага перыяду

| | |
|---|---|
| Навячэр'е Богаяўлення | 18 студзеня |
| Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы | 11 верасня |
| Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга | 27 верасня |

### УСЁЕДНЫЯ ТЫДНІ (ПА СЕРАДАХ І ПЯТНІЦАХ ПОСТУ НЯМА)

| | |
|---|---|
| Калядны перыяд | з 7 да 17 студзеня |
| Мытара і фарысея | з 14 да 19 лютага |
| Сырны (масленічны) | з 28 лютага да 5 сакавіка |
| Велікодны (Светлы) | з 24 да 30 красавіка |
| Троіцкі | з 13 да 18 чэрвеня |

### ТРАПЕЗА Ў СВЯТЫ

Паводле Царкоўнага статута, у святы Раства Хрыстовага і Богаяўлення, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, посту няма. У Навячэр`е Раства Хрыстовага, Навячэр`е Богаяўлення, у святы Уздзвіжання Крыжа Гасподняга і Усекнавення галавы Іаана Прадцечы дазваляецца ежа з алеем. У святы Стрэчання, Праабражэння Гасподняга, Успення, Нараджэння і Пакрова Прасвятой Багародзіцы, Увядзення Ye ў храм, Нараджэння Іаана Прадцечы, апосталаў Пятра і Паўла, Іаана Багаслова, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, а таксама ў перыяд ад Пасхі да Троіцы ў сераду і пятніцу дазваляецца рыба.

### ДНІ АСАБЛІВАГА ПАМІНАННЯ СПАЧЫЛЫХ

| | |
|---|---|
| Памінанне ўсіх спачылых, што пацярпелі падчас ганенняў за веру Хрыстову | 13 лютага |
| Субота мясапусная | 26 лютага |
| Субота 2-га тыдня Вялікага посту | 19 сакавіка |
| Субота 3-га тыдня Вялікага посту | 26 сакавіка |
| Субота 4-га тыдня Вялікага посту | 2 красавіка |
| Радаўніца | 3 мая |
| Памінанне спачылых воінаў | 9 мая |
| Субота Троіцкая | 11 чэрвеня |
| Субота Дзімітрыеўская | 5 лістапада |

### НЕ АДПРАЎЛЯЕЦЦА ВЯНЧАННЕ

Напярэдадні серады і пятніцы ўсяго года (г.зн. па аўторках і чацвяргах)
Напярэдадні нядзельных дзён (г.зн. па суботах)
Напярэдадні двунадзясятых, храмавых і вялікіх святаў
На працягу пастоў Вялікага, Пятровага, Успенскага і посту перад Раством
На працягу Каляднага перыяду (ад 7 да 19 студзеня)
На працягу сырнага тыдня (масленіцы), пачынаючы з Нядзелі мясапуснай і ў Нядзелю сырапусную
На працягу Велікоднага (Светлага) тыдня
У дні і напярэдадні Усекнавення галавы Іаана Прадцечы — 11 верасня і Уздзвіжання Крыжа Гасподняга — 27 верасня.

## Каталіцкі каляндар

| | |
|---|---|
| 1 студзеня | Святой Багародзіцы Марыі |
| 6 студзеня | Абвяўленне Пана (Тры Каралі) |
| 9 студзеня | Хрост Пана |
| 2 лютага | Ахвяраванне Пана |
| 9 сакавіка | Папялец (пачатак Вялікага посту) |
| 19 сакавіка | Святога Юзафа |
| 25 сакавіка | Звеставанне Пана |
| 17 красавіка | Пальмовая нядзеля |
| 24 красавіка | ВЯЛІКДЗЕНЬ |
| 25 красавіка | Велікодны панядзелак |
| 1 мая | Божай Міласэрнасці |
| 31 мая | Адведзіны Найсвяцейшай Панны Марыі |
| 2 чэрвеня | Унебаўшэсце Пана |
| 12 чэрвеня | Спасланне Духа Святога |
| 19 чэрвеня | Найсвяцейшай Тройцы |
| 23 чэрвеня | Цела і Крыві Хрыста |
| 24 чэрвеня | Нараджэнне святога Яна Хрысціцеля |
| 29 чэрвеня | Святых Апосталаў Пятра і Паўла |
| 1 ліпеня | Найсвяцейшага Сэрца Езуса |
| 2 ліпеня | Найсвяцейшай Панны Марыі Будслаўскай |
| 6 жніўня | Перамяненне Пана |
| 15 жніўня | Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі |
| 8 верасня | Нараджэнне Найсвяцейшай Панны Марыі |
| 14 верасня | Узвышэнне Святога Крыжа |
| 29 верасня | Святых Арханёлаў |
| 2 кастрычніка | Анёлаў Ахоўнікаў |
| 1 лістапада | Усіх Святых |
| 2 лістапада | Успамін усіх памерлых вернікаў |
| 20 лістапада | Хрыста — Валадара Сусвету |
| 27 лістапада | Першая нядзеля Адвэнту |
| 8 снежня | Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі |
| 25 снежня | Нараджэнне Пана |
| 30 снежня | Святой Сям'і |

## Лютаранскі каляндар

| | |
|---|---|
| 1 студзеня | Новы год. Абразанне і нарачэнне імя Ісуса |
| 6 студзеня | Богаяўленне. Эпіфанія |
| 25 студзеня | Дзень абарачэння апостала Паўла |
| 2 лютага | Стрэчанне Гасподняе |
| 4 сакавіка | Сусветны дзень малітвы |
| 9 сакавіка | Папяльцовая серада. Пачатак Пакутнага часу |
| 17 красавіка | Вербная нядзеля |
| 21 красавіка | Чысты чацвер. Дзень усталявання Прычасця |
| 22 красавіка | Пакутная пятніца |
| 24 красавіка | ВЯЛІКДЗЕНЬ |
| 25 красавіка | Дзень евангеліста Марка |
| 2 чэрвеня | Узнясенне Гасподняе |
| 12 чэрвеня | Пяцідзясятніца. Свята сашэсця Святога Духа |
| 19 чэрвеня | Тройца. Свята святога Трыадзінства |
| 2 чэрвеня | Нараджэнне Іаана Хрысціцеля |
| 25 чэрвеня | Дзень Аўгсбургскага веравызнання |
| 29 чэрвеня | Дзень святых апосталаў Пятра і Паўла |
| 2 ліпеня | Дзень наведвання Марыяй Елізаветы |
| 28 жніўня | Дзень памяці ахвяраў палітычных рэпрэсій |
| 21верасня | Дзень апостала і евангеліста Мацвея |
| 29 верасня | Дзень архангела Міхаіла і ўсіх анёлаў |
| 2 кастрычніка | Свята падзякі за ўраджай |
| 18 кастрычніка | Дзень евангеліста Лукі |
| 30 кастрычніка | Дзень памінання ахвяраў гвалту, вайны і тэрору |
| 31 кастрычніка | Дзень Рэфармацыі |
| 16 лістапада | Дзень пакаяння і малітвы |
| 20 лістапада | Дзень памінання спачылых. Нядзеля вечнасці |
| 24 снежня | Куцця |
| 25 снежня | Нараджэнне Хрыстова |
| 26 снежня | Дзень першапакутніка Стэфана |
| 27 снежня | Дзень апостала і евангеліста Іаана |
| 28 снежня | Дзень бязвінна забітых немаўлят |
| 31 снежня | Пярэдадзень Новага года |



## Яўрэйскі каляндар

| | |
|---|---|
| 20 студзеня | Ту Бішват — (Новы год дрэў) |
| 18—19 лютага | Пурым Катан (Малы Пурым) |
| 17 сакавіка | Пост Эстэр |
| 20 сакавіка | Пурым |
| 19—26 красавіка | Пэсах — Свята выхаду з Егіпта |
| 18 мая | Пэсах Шэні (Другі Пэсах) |
| 22 мая | Лаг Баомэр |
| 8—9 чэрвеня | Шавуот (Свята даравання Торы) |
| 19 ліпеня | Пост 17 Тамуза |
| 9 жніўня | Пост 9 Ава |
| 15 жніўня | Хамішаасар Бэав |
| 29—30 верасня | Рош Ашана |
| 2 кастрычніка | Пост Гедаліі |
| 8 кастрычніка | Ём ха-кіпур (Судны дзень) |
| 13—19 кастрычніка | Сукот |
| 20 кастрычніка | Шміні Ацарэт |
| 21 кастрычніка | Сімхат Тора (Радасць Торы) |
| 21—28 снежня | Ханука — Свята Святла |

Усе іудзейскія святы пачынаюцца напярэдадні ўвечары, пасты 9 Ава і Ём ха-кіпур таксама пачынаюцца з захаду сонца напярэдадні, астатнія пасты — ад світанку названай даты.

## Мусульманскі каляндар

(1432 — 1433 год ПА ХІДЖРЫ)

| | |
|---|---|
| 14—15 лютага (11 — 12 рабі аль-аваля) | Нараджэнне Прарока Мухамада (Маўлід ан-Набі) |
| 9—10 чэрвеня (5 — 6 раджаба) | Шлюб бацькоў Прарока Мухамада (ноч Рагаіб) |
| 27—28 чэрвеня (26 — 27 раджаба) | Узнясенне Прарока Мухамада (ноч Мірадж) |
| 15—16 ліпеня (14 — 15 шаабана) | Ноч ачышчэння ад грахоў (Лейлят аль Бараа) |
| 1 жніўня (1 рамадана) | Пачатак мусульманскага посту (Ураза) |
| 26—27 жніўня (26 — 27 рамадана) | Ноч Прадвызначэння (Лейлят аль-Кадр) |
| 30 жніўня (1 шаваля) | Свята разгавення (Ураза-Байрам) |
| 5 лістапада (9 зуль-хіджа) | Дзень стаяння на гары Арафат (Дзень Арафата) |
| 6—9 лістапада (10-12 зуль-хіджа) | Свята ахвярапрынашэння (Курбан-Байрам) |
| 26 лістапада (1 мухарама) | Пачатак новага 1433 года па мусульманскім календары |
| 5 снежня (10 мухарама) | Дзень Ашура (памінанне прарокаў і пасланнікаў Алага) |

### СТУДЗЕНЬ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| АЎТ | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| СР | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| ЧЦ | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| ПТ | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| СБ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |
| НД | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 | |

### ЛЮТЫ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| АЎТ | 1 | 8 | 15 | 22 | |
| СР | 2 | 9 | 16 | 23 | |
| ЧЦ | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| ПТ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| СБ | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| НД | 6 | 13 | 20 | 27 | |

### САКАВІК

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| АЎТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| СР | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| ЧЦ | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| ПТ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| СБ | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| НД | 6 | 13 | 20 | 27 | |

### КРАСАВІК

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 4 | 11 | 18 | 25 |
| АЎТ | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| СР | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| ЧЦ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| ПТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| СБ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| НД | 3 | 10 | 17 | 24 | |

### МАЙ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| АЎТ | | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| СР | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| ЧЦ | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| ПТ | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| СБ | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| НД | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |

### ЧЭРВЕНЬ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| АЎТ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| СР | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| ЧЦ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| ПТ | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| СБ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| НД | 5 | 12 | 19 | 26 | |

### ЛІПЕНЬ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| АЎТ | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| СР | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| ЧЦ | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| ПТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |
| СБ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 | |
| НД | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 | |

### ЖНІВЕНЬ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| АЎТ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| СР | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| ЧЦ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| ПТ | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| СБ | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| НД | 7 | 14 | 21 | 28 | |

### ВЕРАСЕНЬ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| АЎТ | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| СР | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| ЧЦ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| ПТ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| СБ | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| НД | 4 | 11 | 18 | 25 | |

### КАСТРЫЧНІК

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| АЎТ | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| СР | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| ЧЦ | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| ПТ | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| СБ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |
| НД | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 | |

### ЛІСТАПАД

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| АЎТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| СР | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| ЧЦ | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| ПТ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| СБ | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| НД | 6 | 13 | 20 | 27 | |

### СНЕЖАНЬ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| АЎТ | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| СР | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| ЧЦ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| ПТ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| СБ | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| НД | 4 | 11 | 18 | 25 | |

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗВЯЗДА 31 снежня 2010 г.

Шык-шок

# ШТО АПРАНУЦЬ У НАВАГОДНЮЮ НОЧ?



## Памятайце, што Трус не любіць вычварнасці і пафасу

**У чым сустракаць Новы 2011 год, які стане годам металічнага Труса ці Ката, — гэта пытанне, актуальнае для ўсіх жанчын, бо ў навагоднюю ноч хочацца не проста прывабна выглядаць, але і спадабацца самому сімвалу года.**
**На гэты раз гэта да дзіўнага проста, бо перавагі Труса і модныя тэндэнцыі адно аднаму не супярэчаць.**



### КОЛЕР

Пачнём з колеру. У чым сустракаць 2011 год Труса (ці Ката), калі ён металічны? Зразумела, у тым, што блішчыць: блёсткі, стразы, паеткі, металічныя ўпрыгажэнні, тканіны, якія пераліваюцца, — усё гэта прыцягне схільнасць жывёл. Калі казаць пра каляровую гаму, аддайце перавагу светлым колерам, пастэльным адценням. Асабліва актуальна будуць выглядаць жоўтыя і белыя сукенкі. Залаты колер увогуле пераважае ў калекцыях сезону 2010/2011, і памятайце, што ён у стане ператварыць любую дзяўчыну ў сапраўдную каралеву навагодняга балю. Але аматарам іншых колераў таксама не трэба засмучацца. У наступным сезоне актуальныя ўсе адценні чырвонага (каралавы, бардо, аранжавы, барвовы), а таксама колеры мора (марской хвалі, блакітны, бірузовы, сіні). Выбар за вамі. І як заўсёды, пры недахопе часу і выбару вас заўсёды выручыць чорная сукенка. Чорны колер не страчвае сваёй актуальнасці. І не важна, гэта будзе маленькая чорная сукенка ці шыкоўныя вячэрнія строі. Галоўнае, каб было зручна і элегантна.

### ДАЎЖЫНЯ

Цяпер пагаворым пра фасон. Міні паранейшаму застаецца ў модзе. Але такія кароткія, вышэй за калена сукенкі, падыдуць маладым дзяўчатам. Многія летнія трэнды засталіся актуальнымі, таму, дастаўшы з шафы клубныя строі, можна накіроўвацца на навагоднюю вечарынку. Кактэйльны варыянт да месца ў любы момант: і ў рэстаране, і ў начным клубе, і падчас хатняга застолля. Але памятайце, што трус не любіць пафасу, таму шыкоўныя вячэрнія сукенкі з доўгімі шлейфамі, складкамі і глыбокімі дэкальтэ з шафы лепш не даставаць. Нават для дам ва ўзросце рэкамендуюцца строі даўжынёй не ніжэй за калена.

### МОДНЫЯ ДЭТАЛІ

Аборкі, карункі, махры — усё гэта не толькі модна, але і вельмі прывабна. Такія дэталі робяць прадстаўніц прыгожай паловы яшчэ больш кранальнымі, мілымі і жаноцкімі. Акрамя таго, аборкі здатныя схаваць дробныя недахопы фігуры. А гэта зручна як для поўных, так і для занадта хударлявых. Актуальнай застаецца і драпіроўка. Яна ставарае непаўторныя формы, гульня тканін і пераліваў адценняў ператвараюць звычайную сукенку ў шыкоўны вобраз. Вельмі да месца будуць і незвычайныя дэталі ў строях: пройма на адно плячо, арыгінальнае дэкальтэ, наўскос зрэзаны падол ці асіметрычны выраз, спалучэнне розных па фактуры і колеры тканін. Адным словам, усё, што дапамагае вылучыць вас з натоўпу, толькі вітаецца.

### АКСЕСУАРЫ І АБУТАК

У 2011 годзе асаблівую ўвагу трэба надаць аксесуарам. Паколькі гэта год Металічнага Труса (Ката), упрыгажэнні з любых металаў асабліва парадуюць заступнікаў года. Няма сумненняў, што фаварытам застаецца золата, аднак і іншыя металы актуальныя. Толькі не забудзьцеся, што сімвал гэтага года трусаваты і не любіць вычварнасці, таму фамільныя каштоўнасці з вялікім брыльянтам лепш пакінуць у шкатулцы.

Што абуць на Новы год? Сёлета туфлі адышлі на задні план, саступіўшы месца бацільёнам. Лепш выбраць мадэлі з замшы, бо скураныя варыянты не заўсёды выглядаюць святочна. Дызайнеры прадугледзелі, каб у такім абутку не было спякотна: для навагодняй ночы лепш выбраць мадэлі з адкрытымі насамі, заднікамі ці шчыкалаткай. Вядома, па сумётах у такім абутку не пройдзеш, але для свята ён незаменны.



І апошні штрых — сумачка. На гэты раз без варыянтаў — толькі маленькія клатчы, прычым яны выдатна дапоўняць як вячэрнюю сукенку, так і кактэйльную, а таксама і святочны касцюм. Безумоўна, перавагу лепш аддаць мадэлі з чымсьці бліскучым — напрыклад, упрыгожаную стразамі, металічнымі дэталямі ці штучнымі камянямі.

**Падрыхтавала Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Адкрыццё года

# Беларускамоўнаму байцу ўручылі «Заслужанага майстра спорту»

## Чэмпіён свету па тайскім боксе Віталь Гуркоў уганараваны, як алімпійскія чэмпіёны



**Як стала вядома «Звяздзе», знакамітага беларускага байца ўзнагародзілі за тыдзень да Новага года — 24 снежня. Значок «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» уручыў тады яшчэ прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі.**

Чаму мы пішам пра гэтую падзею ў святочным нумары?

Справа ў тым, што Віталь Гуркоў стаў першым вядомым беларускім спартсменам у гісторыі, які публічна па дзяржаўным тэлебачанні выказаўся на роднай мове. Здарылася гэта пасля перамогі на ўсходнееўрапейскім Гран-пры К-1 у сакавіку 2010-га. Пасля гэтага папулярнасць байца пайшла ўгару. І вось заслугі Гуркова (баец восем разоў перамагаў на чэмпіянаце свету па муай-тай) адзначыла дзяржава. Званне «Заслужаны майстар спорту» маюць, напрыклад, алімпійскія чэмпіёны Андрэй Арамнаў (цяжкая атлетыка) і Аляксей Грышын (фрыстайл).

**— І дзе зараз ваш значок «Заслужаны майстар спорту»?** — сустрэліся мы з Віталем у трэніровачным клубе «Патрыёт». **— Напэўна, на самым ганаровым месцы ляжыць.**

*— Калі шчыра, забыўся забраць значок з машыны, ляжыць у бардачку.*

**— Ці ўразіла вас цырымонія ўручэння?**

*— Адчуваў сябе на мерапрыемстве, так бы мовіць, не ў сваёй талерцы. Былі не толькі спартсмены, але і перадавікі з прадпрыемстваў, настаўнікі, дырэктары школ. Прэм'ер-міністр усіх пахваліў, гаварыў пра выкананне планаў на пяцігодку. Потым падыходзіў да кожнага і ціснуў руку, казаў нейкія словы, фатаграфаваўся.*

**— Што сказаў вам?**

*— Вельмі стрымана пажадаў поспехаў.*

**— Ці звярталіся да вас яшчэ нейкія афіцыйныя асобы, ці падтрымлівалі вашы беларускамоўныя памкненні?**

*— Нядаўна, на прэс-канферэнцыі, прысвечанай чэмпіянату свету, да мяне падышлі супрацоўнікі «Белзнешэканамбанка», падарылі беларускамоўны каляндар. Сказалі, што чытаюць мае інтэрв'ю ў сеціве і ў прэсе, ведаюць, што я цікаўлюся гісторыяй. Уручылі старажытную карту Вялікага Княства Літоўскага на лацінскай мове. Цудоўны падарунак...*

Нагадаем, што Віталь Гуркоў з'яўляецца шматразовым чэмпіёнам свету па муай-тай і лідарам нацыянальнай зборнай. У гэтым сезоне Віталь сустракаўся з самымі магутнымі прафесіяналамі планеты. Напрыклад, з чэмпіёнам свету па К-1 італійцам Джорджыа Петрасянам (па нязручных для беларуса правілах кікбоксінга, дзе нельга біць локцем і ўжываць клінч). Віталь прайграў па пунктах, але выглядаў вельмі годна і не атрымаў ніводнай траўмы. Пасля гэтага двубоя папулярнасць беларускага байца ў Заходняй Еўропе і ў Японіі павялічылася ў шмат разоў.

Па любімых для сябе правілах муай-тай Віталь сустрэўся з Петчманконгам (жалезным чэмпіёнам Тайланда). На думку многіх спецыялістаў, беларус аказаўся нечакана мацнейшым (двубой выкладзены ў інтэрнэце). Але тайскія суддзі аддалі перамогу свайму. У астатніх прафесійных двубоях Гуркоў перамог.

У новым сезоне, набраўшыся досведу на прафесійным рынгу, беларус плануе выйсці на першыя радкі сусветных рэйтынгаў.

Трэніруецца Віталь у мінскім клубе «Патрыёт». Пасля Новага года з'явіцца інтэрнэт-старонка клуба на беларускай мове.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.28 | 15.57 | 7.29 |
| Віцебск — | 8.25 | 15.39 | 7.14 |
| Магілёў — | 8.18 | 15.47 | 7.29 |
| Гомель — | 8.06 | 15.52 | 7.46 |
| Гродна — | 8.42 | 16.13 | 7.31 |
| Брэст — | 8.34 | 16.22 | 7.48 |

### Месяц

***Апошняя квадра 28 снежня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

### Імяніны

***Пр.** Зоі, Мадэста, Марка, Міхаіла, Сімяона.*

***К.** Меланіі, Сільвестра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.





СНОВ
## Агракамбінат «Сноў» віншуе з Новым годам і Калядамі!

Асаблівыя пажаданні шматлікім спажыўцам нашай прадукцыі і партнёрам. Зычым Вам шчасця і дабрабыту, удачы і моцнага здароўя, новых поспехаў, здзяйснення ўсіх вашых планаў і задумак у 2011 годзе.

Жадаем вясёлых і прыгожых святаў, каб на Вашым стале заўсёды былі смачныя сноўскія каўбасы і вяндліны. Іх якасць, дарэчы, штогод пацвярджаецца дыпломамі розных прэстыжных конкурсаў і выстаў.

Сёлета і ў наступным годзе ў нашых фірмовых крамах у Мінску, у тым ліку і на Камароўскім рынку, Магілёве, Нясвіжы і Салігорску вы заўсёды знойдзеце шырокі асартымент прадукцыі нашага слыннага мясакамбіната, а таксама якасныя малочныя вырабы.

Налета мы прапануем сваім спажыўцам новыя смачныя якасныя мясныя і малочныя вырабы.





**НУ, дарагія мае кулінары, вось і Новы год! Мне засталося толькі павіншаваць вас з надыходзячым, пажадаць усяго самага светлага, аптымізму і пазітыўных эмоцый. Дзякуй, што вы былі са «Звяздой» сёлета і, спадзяёмся, будзеце з намі і ў будучыні! Ад кулінарнай рубрыкі хочацца дадаць: няхай на ўсе стравы, прыгатаваныя па нашых рэцэптах, у вас заўсёды хопіць здароўя і грошай.**

### САЛАТА «КАЗЁЛ У АГАРОДЗЕ»

Вазьміце: *вяндліну, капусту, карэйскую моркву, свежыя агуркі, свежыя памідоры, балгарскі перац, маянэз.*

Усю гэтую прыгажосць рэжам тонкай саломкай, капусту крыху падсольваем, цiснем, каб дала сок, складваем на талерку кучкамі: у сярэдзіне вяндліна, па дыяметры талеркі ўсё астатняе. Нічога не пішу пра колькасць прадуктаў, проста кучкі павінны быць прыкладна аднолькавыя, за выключэннем вяндліны, яе можна пакласці пабольш, зверху паліваем маянэзам (на смак) і падаём на стол, перамешваем перад непасрэдным ужываннем. Салата проста гатуецца, смачная і выглядае вельмі эфектна.

### Навагодні жарт: ПІРОГ З КАНЬЯКОМ

Вазьміце: 1 шклянку цукру, 2 шклянкі сухафруктаў, 1 шклянку вады, жменю арэхаў, 4 яйкі, 250 г масла, 1 лімон, 2 маленькія літры каньяку!

Перш чым пачаць замешваць цеста, паспытай каньяк — ці добры? Узбі масла міксерам да лёгкасці. Паспытай яшчэ раз каньяк — ці сапраўды ён вышэйшай якасці? Для гэтага налі поўную шклянку і выпі да дна. Паўтары 2 разы. Дадай 2 лыжкі цукру і паспрабуй зноў. Разбі ў міску яйка і кінь туды гэтыя дзіўныя, зморшчаныя фрукты... Паспытай каньяк на кансістэнцыю... Выключы міксер. Сухафрукты, якія захраслі, добра выцягваць нажніцамі! Кінь лімон у міксер і выцісні туды ж арэхі. Дадай цукар і наогул усяго, чаго хочаш... Змаж духоўку маслам і паверні яе на 360 градусаў... Выкінь міску з акна і дапі каньяк... наплюй на пірог і ідзі спаць!

### ЯЗЫК У ГАРЧЫЦЫ

**Высунуты язык засоўваюць у слоік з гарчыцай. Трымаюць да 5—6 хвілін. Пасля вымання пасыпаюць перцам на смак.**

* * *



**«Гусь у яблыках».**

# НЯДЗЕЛЯ, 9 СТУДЗЕНЯ

## ПЕРШЫ

7.50 Дзень спорту.
8.00 «Неразгаданая гісторыя». «Рымскі Калізей».
8.45 «Зброя».
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
9.40 Альманах падарожжаў.
10.05 У свеце матораў.
10.40 «Культурныя людзі».
11.15 «Школа доктара Камароўскага».
11.45 «Невядомая версія. «Вяселле ў Малінаўцы».
**12.55 Камедыя «Вяселле ў Малінаўцы».**
14.35 Зямельнае пытанне.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.35 «Гладыятары сёння».
**16.00 Камедыя «Бэндслэм».**
18.05 Суперлато.
19.15 «Дзядулі-чараўнікі».
19.30 «Мая праўда». «Міхалай Карачанцаў».
20.30 «Спортлато 5 з 36».
20.50 «КЕНО».
21.00 У цэнтры ўвагі.
**21.55 Серыял «Сваты-4».**

## АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная прапаведзь.
**9.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
10.15 «Анатоль Рамашын. Тры маланкі ў сэрца».
**11.15 Камедыя «Французы».**
12.55 «Саюз».
13.25 «Пухавік з курыцы».
**14.25 Камедыя «Каўказская палонніца, або Новыя прыгоды Шурыка».**
16.15 Навіны спорту.
**16.20 Камедыя «Шырлі-мырлі».**
18.45 Канцэрт Віктара Дробыша «Хіты і зоркі».
20.00 Контуры.
**21.05 Маст. фільм «Чыкага».**
23.10 «Yesterday Live».
**0.10 Камедыя «Гэта вясёлая планета».**

## ЛАД

8.15 Звон.
8.40 Мір вашаму дому.
8.50, 20.40 Тэлебарометр.
**8.55 Камедыя «Тэрмінова патрабуецца Дзед Мароз».**
10.25 Урачэбныя тайны.
11.00 Школа рамонту.
12.05 Бухта капітанаў.
12.45 Кінапробы.
13.05 «Ты і я».
14.05 «Правы чалавека».
14.20 «Смешныя людзі».
16.25 Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Мужчыны.
**17.20 Меладрама «Кальце для снежнай бабы».**
19.10 Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Жанчыны.
20.05 Смешная часінка.
**21.00 Меладрама «Ажаніць мільянера!».**
22.50 Культасвет.
23.20 Канцэрт Diana Krall «Live in Rio».

## СТБ

7.05 М/ф.
**7.45 Фільм-казка «Казка пра згублены час».**
**9.05 Камедыя «Вусатынянь».**
10.20 «Аўтапанарама».
10.50 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
11.40 «Вялікае снеданне».
12.20 М/ф «Асляпляльныя Бары і чарвякі дыска».
13.35 «Прывітанне, доктар!».
**14.05 Меладрама «Забытая мелодыя для флейты».**
16.30 «24 гадзіны».
16.50 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
19.00 «Аўтапанарама».
19.30 «Тыдзень».
20.40 Канцэрт, прысвечаны юбілею Уладзіміра Мулявіна.
**23.05 Маст. фільм «Кракадзіл Дандзі ў Лос-Анджэлесе».**
**0.45 Мюзікл «Дванаццаць месяцаў».**

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Хлапчук паліцэйскі».**
6.30 «Цік-так».
6.45 М/ф.
6.55 «Эксперыментатары».
7.10 М/ф «Чыпаліна».
8.05 «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
**8.35, 2.50 Маст. фільм «Музычная гісторыя».**
10.15 «Любімыя акцёры».
**10.30 Маст. фільм «Апладысменты, апладысменты».**
12.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці.
12.10 «Хіт-экспрэс».
**13.05 Маст. фільм «Разам назаўсёды».**
14.30 «Даведнік».
15.20 Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20 Серыял «Дама з камеліямі».**
17.10, 4.10 «Па хвалі маёй памяці».
18.20 «Дыяспары».
**18.50 Маст. фільм «Цудоўная чацвёрка».**
**20.30 Маст. фільм «Містэр і місіс Сміт».**
22.20 «Зорнае жыццё».
23.00 «Паўночнікі».
**23.35 Маст. фільм «Глядзі весялей».**

## 8 КАНАЛ

9.00, 12.55, 18.50, 21.10, 23.40 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад».
9.30 «Мой любімы гадаванец».
10.00, 17.25 «Кінаблакнот».
10.20 «Адшукваецца адпачынак».
**10.50 Камедыя «Па-банку».**
**13.00 Серыял «Яна напісала забойства».**
14.50 «К-відэа» для дзяцей.
**15.15 Фільм для дзяцей.**
17.00 «Бульбокс».
**17.50 Серыял «Думаць як злачынца».**
**18.55 Меладрама «Справа была ў Пянькове».**
20.50 «Вечарніца».
21.05 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
**21.15 Камедыя «Удар у адказ».**
23.15 Знаёмствы «Life».

## ВТБ

6.00, 0.15 Інтэрактыўны блок «PLAY».
**9.30 Серыял «Як сказаў Джым».**
10.30, 17.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
11.15 Спявачка Натана. Жывы канцэрт.
**12.00 Серыял «Гром у раі».**
**13.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**15.00 Камедыя «Астэрыкс і Абелікс місія Клеапатра».**
**18.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**20.00 Камедыя «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».**
**22.30 Камедыя «Клеркі».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Аднойчы праз дваццаць гадоў».**
**8.10 Маст. фільм «Пяшчотны Барс».**
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.15 М/ф.
**11.25 Маст. фільм «Двайная пастка».**
14.15 «Калядная «Песенька года».
**16.00 Маст. фільм «Тры паўграцыі».**
18.15 «Ізмайлаўскі парк».
**20.25 Маст. фільм «Усё не выпадкова».**
**22.00 Маст. фільм «Я падару сабе цуд».**
23.45 «КВЗ БДУ» 20 гадоў!

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.45 Серыял «Узяць Таранціну».**
6.25 «Лепшы горад Зямлі».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 «Сёння».
**8.15 Камедыя «Елка, трус, папугай».**
9.50 М/ф.
**10.20 Камедыя «Заходзь — не бойся, выходзь — не плач».**
11.55 «Дачны адказ».
13.20, 16.25, 19.25 «Чыстасардэчнае прызнанне».
23.30 «ЖКГ — патрашыцель. Гісторыя ўсерасійскага падману».

## ТНТ

5.00 М/с «Як кажа Джынджэр».
6.00 М/с «Дзеткі падраслі».
6.55 «Нікеладэон на ТНТ».
7.50 «Лато Спорт Супер».
**8.05, 23.45 Серыял «V-візіцёры».**
8.50 Латарэі: «Першая Нацыянальная» і «Фабрыка ўдачы».
9.00 «Бітва экстрасэнсаў».
**16.00 Баявік «Блэйд».**
18.30 «Камедзі Клаб». Лепшае.
**19.00 Баявік «Блэйд-2».**
21.15, 0.40 «Камедзі Клаб».
22.15, 2.35 «Дом-2».
1.40 «Comedy Woman».
3.35 «Школа рамонту».
4.40 «Камедыянты».

## КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 0.50, 1.50 Праграма перадач.
**9.10 Фільм-казка «Лясная царэўна».**
10.45 «Дзед Мароз і лета». «Жылі-былі...». М/ф.
11.15 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**11.40 «Вар'яцкі дзень». Маст. фільм.**
12.45, 0.55 «Балада пра тарбазаўра». Дак. фільм.
13.35 Ансамбль Робі Лакатоша ў Маскве.
14.30 «Маскоўскі цырк».
15.30 Опера Дж. Вердзі «Травіята».
18.00 «Лідзія Смірнова. Выпрабаванне пачуццяў». Дак. фільм.
**18.40 Маст. фільм «Маё каханне».**
19.55 «Загадка Пампеі». Дак. фільм.
**20.45 Маст. фільм «Гібель Пампеі».**
23.50 «Ад Баха да Beatles».
0.40 «Бесталковы вамбат». М/ф для дарослых.
1.45 «Эзоп». Дак. фільм.

## НАСТАЛЬГІЯ

5.00, 10.05 «Навагодні атракцыён». 1982 год.
**6.30 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».**
8.00, 14.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР». Лепшае.
11.00 «Да і пасля...». Год 1988.
12.10 «Возьмемся за рукі, сябры!». Фестываль аўтарскай песні. 1988 год.
13.20 «Навошта вы збіраецеся?». Дак. фільм.
**15.00 Маст. фільм «Выпадковы вальс».**
16.35 «Канцэрт Надзеі Чапрагі». 1993 год.
17.00 «Акулы пяра».
17.45 «Блакітны агеньчык. Сябрам блакітнага экрана». 1968 год.
19.25 «Ранішняя пошта». 1984 год.
20.00 «Быў час».
21.00 «Тэатральныя сустрэчы». Сустрэча з М. Казаковым. 1989 год.
22.30 «Спявае ансамбль «Здравствуй, песня!». 1979 год.
23.00 «Калядныя сустрэчы. Тэатр песні Алы Пугачовай». 1989 год.
0.10 Дак. фільм «Увага — тыгры!».
**0.40 Маст. фільм «Пра каТа».**
4.00 Дак. фільм «Уладары без масак».
4.35 «Любімыя мелодыі мінулых гадоў».

## НАША КІНО

6.30, 12.30 Маст. фільм «Добраахвотнікі».
8.05 Плюс кіно.
8.35 Маст. фільм «Вершнік без галавы».
10.30, 16.30 Маст. фільм «Перыкола».
14.30 Маст. фільм «Герой нашага часу («Максім Максімыч», «Тамань»).
15.50 Драма «Бацькоўскі дзень».
18.30, 0.30 Маст. фільм «Следапыт».
20.30, 2.30 Камедыя «Клуб жанчын».
22.55, 4.55 Маст. фільм «У добры час!».

## ДОМ КІНО

4.00 Маст. фільм «Яраслаў».
5.40 Камедыя «Дзяўчына з гітарай».
7.10 Трагікамедыя «Жэня, Жэнечка і «Кацюша».
8.35 Казка «Зорны хлопчык».
9.45 Камедыя «Гісторыя кахання, або Навагодні розыгрыш».
11.15 Камедыя «Джэнтльмены ўдачы».
12.40 Трагікамедыя «Снягурка для дарослага сына».
14.10 Камедыя «Гараж».
15.50 Трагікамедыя «Дзяўчаты».
17.30, 1.30 Серыял «Танга з анёлам».
20.00 Трылер «Чызкейк».
21.30 Маст. фільм «Відрымасгор, або Гісторыя майго космасу».
22.50 Маст. фільм «Каханая жанчына механіка Гаўрылава».
0.10 Камедыя «Шмат шуму з нічога».

## ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Камедыя «11 запаведзяў».
10.35, 18.35, 2.35 Дэтэктыў «Забойства ў вышэйшым коле».
12.10, 20.10, 4.10 Вестэрн «За прыгаршчы долараў».
13.50, 21.50, 5.50 Камедыя «Хлусня і здрада».
15.25, 23.25, 7.25 Трылер «Чысцільшчык».

## ТБ1000

3.00, 20.50 Трылер «Хто Вы, містэр Брукс?».
5.00 Драма «Амерыканскі прэзідэнт».
7.00 Камедыя «Вызваляючы месца».
8.40 Драма «Жаночыя тайны».
10.30 Драма «Дзеці Хуанг Шы».
12.30 Драма «Апостал».
14.50 Камедыя «Звярынец».
16.50 Камедыя «Каманда».
19.00 Камедыя «Каханне і іншыя катастрофы».
23.00 Меладрама «Уяві нас разам».
0.40 Драма «Тайны «Начнога дазору».

## ТБ3

5.00 Маст. фільм «Згублены свет».
7.00 М/ф «Бакуган».
7.30 М/ф «Герой».
8.00 М/ф «Казкі Альфа».
8.30 М/ф «Бэтмен і тайна жанчыны—лятучай мышы».
10.00 Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры».
11.30 «Хатні рэстаран».
12.30, 16.00 «Тайны вялікіх магаў».
13.30 «Далёка і яшчэ далей».
14.30 Маст. фільм «Чарадзеі». Частка 1-я.
17.00 Маст. фільм «Чараўнік Земнамор'я».
20.45 Дыскатэка 80-х.
23.00 Серыял «Зорныя вароты». Лепшыя серыі.
1.00 Маст. фільм «Рай і пекла».
3.00 Маст. фільм «Дарога на захад». Частка 1-я.

## РАМАНТЫКА

7.00, 18.40 «Рабыня Ізаўра».
7.55 «Тайна Лауры».
12.20, 17.50, 2.40 «Гатуем разам з Анхелем Ласана».
13.20 «Анучная лялька».
19.35, 0.55 «Амазонія».
21.30 «Усё, хопіць!».
22.25 Каханы па найме.
0.00 «Якія заблыталіся ў сетцы».

## DIVA UNIVERSAL

5.00, 2.30 Серыял «Дочкі Маклеода».
5.45, 15.10, 0.50 Серыял «Вайна Фойла».
7.25 Маст. фільм «Кніга жаданняў».
8.55 Маст. фільм «Калядное абрабаванне».
10.25 Маст. фільм «Раман па перапісцы».
12.00, 21.40 Маст. фільм «Давай пажэнімся».
13.35 Маст. фільм «Калядныя прыгоды сямейства Фоксаў».
16.50, 23.10, 3.20 Серыял «Забойствы ў Мідсамеры».
18.30 Маст. фільм «Калядныя пісьмы».
20.05 Маст. фільм «Выратаваць казку».

## SY FY

7.30, 1.30 Зачараваныя.
11.40 Пункт прызначэння — праўда.
13.20 Легенда пра Шукальніка.
15.05 Баявік «Арктычны выбух».
16.40 Па слядах прывідаў.
17.30 Факт або выдумка: паранармальныя з'явы.
18.25 Камедыя «Бітлджус».
20.00 Зорныя вароты: Сусвет.
20.50, 0.00 Капрыка: Пілотная серыя.
22.20 Фэнтэзі «Спаўн».

## ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00 Маст. фільм «Аповеды пра Кешку і яго сяброў».
6.20, 10.20, 14.05 М/с «Віні-Пух». М/ф: «А раптам атрымаецца!..», «Як страціць вагу?».
7.00, 11.00 М/ф «Калядныя казкі».
8.15, 12.15 Казка «Лятучы карабель»; м/ф: «Бобік у гасцях у Барбоса», «Падарожжа мураша».
13.00, 15.00 Маст. фільм «Прыгоды Электроніка».
16.05 М/с «Віні-Пух». М/ф: «Казляня, якое лічыла да дзесяці», «Хто паедзе на выставу?».
17.00 Казка «Дванаццаць месяцаў».
17.55 Казкі: «У некаторым царстве...», «Дзень цудоўны».

## ЗДАРОЎЕ

5.00, 20.00 Нетрадыцыйная медыцына.
5.40, 20.40 Выкрыццё прадуктаў.
6.20, 9.50, 15.20, 18.50, 21.20, 0.50 Азбука здароўя.
6.25, 13.35, 18.55, 21.25, 4.35 Ты тое, што ты ясі.
6.55, 21.55 Школа розуму.
7.35, 22.35 Жыццё або Смерць?
8.00, 23.00 Як не страціць здароўе.
8.40, 23.40 Жаночы часопіс.
9.20, 0.20 Колькі вам гадоў?
9.55, 0.55 Увага, ежа!
10.30, 1.30 Я расту.
11.00, 2.00 Набалелае пытанне.
11.50, 2.50 Выдаткі вытворчасці.
12.30, 3.30 Сакрэты здароўя.
12.55, 3.55 Кабінет прыгажосці.
14.00 Энцыклапедыя памылак.
14.30 Здароўе ад зоркі.
15.25 Будзем здаровыя.
15.55 Дзіцячая медыцына.
16.30 Дзіцячы ўрач.
17.00 Пазнай сябе.
17.35 Я пераможу гэты боль.
18.10 Памылкі здароўя.
19.30 Не выходзячы з дому.

## ТДК

6.00, 7.50, 16.55, 17.50, 18.50, 1.30 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 14.30, 22.20 Усё лепшае, для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 22.00,
5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00 Шлях поспеху.
13.00, 2.00 Нашы дзеці.
14.00, 4.00 Твой дом.
15.30 «Латарэя Бінга».
16.00, 20.00 «Ваш асабісты псіхолаг».
17.00, 23.30 Красуня.
19.00, 22.30 Люстэрка жыцця.
21.00, 0.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
3.00 Гісторыя поспеху.

## DISCOVERY

7.00, 16.10 «З чаго гэта зроблена?».
7.55, 14.20, 3.50 Вынайсці будучыню.
8.50, 13.25, 21.00, 2.55 Разбуральнікі легендаў.
9.45 «Маланкавыя катастрофы».
10.40 Смяротны ўлоў.
11.35 Выжыць любой цаной.
12.30 «Сам-насам з прыродай».
15.15 Нацыя, якая адпачывае.
22.00 «Рос Кемп у Афганістане».
23.00 «Рай, які абярнуўся пеклам».
0.00 «Discovery Channel» выратаваў мне жыццё.
1.00 Выжыць у катастрофе.
2.00 «Бяспека межаў».
4.45 Як гэта ўстроена?
5.10 Крутыя выбухі.
6.05 Гіганцкія караблі.

## NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 18.00, 22.00, 1.00 Вялікія міграцыі.
7.00 Дагістарычныя драпежнікі.
9.00 Некранутая прырода.
10.00 Гіена.
11.00 Мегазлом.
12.00 Самы цяжкі ў свеце рамонт.
13.00 Створаныя забіваць.
14.00 Атака насякомых.
15.00 Туземцы ў Англіі.
16.00, 22.10 Канец свету?
19.00, 4.00 Дзіўны свет з Nat Geo.
20.00, 23.00, 2.00 Ноч ільва.
21.00, 0.00, 3.00 Армія львоў.

## TRAVEL

5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 21.00, 23.00, 2.00 Сусветны падарожнік.
6.00 Па чыгунках Швейцарыі.
7.00 Падарожжы сёння.
7.30 Лыжны свет.
8.30 Па маляўнічых дарогах.
9.00, 22.00, 3.00 Па рэйках.
12.00 Падарожжы сёння.
12.30 Галівуд і вінаград.
13.00 Кулінарная Азія.
16.00 Раскошныя падарожжы вачыма відавочцы з Варунам Шармай.
20.00, 1.00 Зямля качэўнікаў.
4.00 Даведнік для шукальнікаў прыгод.
4.30 Вялікая рыба.

## ANIMAL PLANET

7.00 Маёнтак сурыкатаў.
7.25 Як стаць.
8.15 Планета дзікіх.
8.40 Усё пра сабак.
9.10, 14.40 Планета малых.
10.05, 6.10 Праект «Шчанюкі».
11.00 «Тэрыторыя жывёл».
11.55 «SOS дзікай прыроды».
12.50 Паліцыя Х'юстана. Аддзел па абароне жывёл.
13.45, 20.10 Перакладчык з сабачай.
15.35 «Прыгоды панды».
16.30 Сабакі, коткі і іншыя ўлюбёнцы.
17.25 Хуткасць жыцця.
18.20 «Ветэрынар у дзікай прыродзе».
19.15, 1.40 Уводзіны ў сабаказнаўства.
21.05, 2.35 Незвычайныя жывёлы Ніка Бэйкера.
22.00, 3.30 Сабакі-паліцэйскія.
22.55, 4.25 Кітовыя войны.
23.50, 5.20 Дзікія і небяспечныя.
0.45 Твар у твар з белым мядзведзем.

## EUROSPORT

9.30, 21.45, 0.00, 2.00 Ралі Дакар.
10.00, 14.45, 15.45, 0.30 Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету.
11.00, 14.15 Лыжнае двабор'е. Кубак свету.
11.45 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам.
12.30 Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
14.00 Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
15.30, 18.30 Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
16.30 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
17.15 Снукер. Мастэрс. Марк Селбі (Англія) — Марк Кінг (Англія).
19.15, 1.30 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
19.55 Снежны выхадны. Часопіс.
20.00 Дартс. Чэмпіянат свету. Фінал.
22.15 Снукер. Мастэрс. Алістэр Картар (Англія) — Пітэр Эбдан (Англія).

## MTV

5.00 MTV Караоке.
6.00 Стэрэа_раніца.
8.00 «Крутыя бабры».
8.25 «Котасабака».
8.50 «Губка Боб».
9.15 Тачку на пракачку.
9.40 Тайныя спакусы курортнага гатэля.
10.05 Наступны.
10.30 Спатканне на выжыванне.
10.55 Шалёныя продкі.
11.20 Ужо можна.
11.45 Сяброўка Пэрыс Хілтан.
12.35, 17.15 Бітва візажыстаў.
13.25 «Шопаголікі».
14.20 News блок: Вынікі года.
15.15 Серыял «Распешчаныя».
16.10, 20.50 Серыял «Сэкс у вялікім горадзе».
18.05 Серыял «Ранеткі».
22.20 Трэндзі.
22.50 Цырымонія «Europe Music Awards-2010».
1.20 Music.

## ІНТЭР+

7.00, 18.40, 1.45 Ян Табачнік «Гонар маю запрасіць».
8.15 Украінская топ-дваццатка.
9.35 Школа доктара Камароўскага.
10.05 Украіна, уставай!
10.40 Пераблена ва Украіне.
11.45 Канцэрт «Мелодыя двух сэрцаў».
14.45, 0.55 Камедыйны клуб.
16.20 Мюзікл «Фігаро».
20.00, 3.00 Інфармацыйны канал «Падрабязнасці».
20.30, 5.15 Маст. фільм «Удачы вам, спадары».
22.10 Мюзікл «12 крэслаў».
3.30 Мюзікл «Зорныя канікулы».

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена!*

## БЕЛАРУСЬ РТР 22.00 ФІЛЬМ ДНЯ

**«Я ПАДАРУ САБЕ ЦУД»**
**(Расія, 2010 г.)**

Пярэдадзень Новага года, але адбываецца зусім не святочная падзея, Лена і яе муж Сяргей разводзяцца. Душэўная спустошанасць штурхае Лену на адчайны ўчынак: яна адпраўляецца ў горад Каменск, каб вярнуць сваё першае каханне — Косцю. У цягніку Лена знаёміцца з выпадковым спадарожнікам Максімам...



**Рэжысёр** — Фуад Шабанаў. **У ролях:** Ірына Лачына, Аляксандр Арсенцьеў, Вячаслаў Кулакоў, Сяргей Гірын.



# ЛЮБОЎНЫ ГАРАСКОП НА 2011 ГОД

**АВЕН**. Што датычыцца кахання і пачуццяў сардэчных, то ў будучым годзе Авенам не перашкодзіць некалькі лакалізаваць пажар свайго сэрца. Гэта, вядома, добра, што вы палаеце і раскідваеце іскры вакол сябе на добрых тры кіламетры, спальваючы сэрцы. Або ўспыхваеце, нібы запалка, ад кожнай гутаркі па душах з малазнаёмым чалавекам і тут жа накідваецеся на яго з абдымкамі, накіроўваючыся паволі ў бок найбліжэйшай канапы. Аднак да птушкі Фенікс вы ўсё ж не дацягваеце, і калі будзеце дзейнічаць у тым жа духу, то прачняцеся ў адну «цудоўную» раніцу на галавешках. Увогуле, выпраўляйцеся па цэглу і пачынайце абкладваць ёй сваё апантанае сэрца, узводзячы сямейны ачаг.

**ЦЯЛЬЦЫ**. У 2011 годзе любоўная лодка Цяльцоў калі не разаб'ецца аб быт, то парадкам падрапаецца. Найбольш востра пытанні, каму мыць посуд, а каму выносіць смецце, будуць паўставаць у лютым і сакавіку. Дадаць перцу ў вашы сямейна-інтымныя адносіны таксама не перашкодзіла б, а то развялі дыетычнае харчаванне з дазаваннем увагі блізкаму свайму і сэксам строга па выхадных. Без сумнення, падобная прасняціна надакучыць каму заўгодна. Тут не толькі з-за брудных талерак лаяцца пачнеш, а можна нават на сценку палезці — і то цікавей, чым з дня ў дзень нудзіцца, гледзячы ў столь і «адбываючы» шлюбную павіннасць. Хоць у заапарк схадзіце, ці што, каб узяць прыклад з братоў і сясцёр нашых меншых — якраз увесну, калі шлюбная пара пачынаецца. Можа, і ў вас пачнецца.

**БЛІЗНЯТЫ**. Увесну могуць сутыкнуцца з няпростай сітуацыяй выбару паміж сваімі інтарэсамі і інтарэсамі свайго партнёра. Самае смешнае, што, стараючыся выправіць сітуацыю, Блізняты будуць шчыра лічыць, што дзейнічаюць як сапраўдныя альтруісты, а таму стануць чакаць пагладжвання па галаве і пахвалы за сваю дабрыню і клопат. Аднак на самай справе Блізняты зусім не такія ўжо «белыя і пухнатыя»: яны (хай нават падсвядома), напэўна, пралічылі ўсе варыянты і выбралі самы выгадны. Так што не варта чакаць узнагароды за беззапаветнае каханне і адданасць. Замест гэтага паспрабуйце сапраўды зразумець, што зробіць вашага спадарожніка жыцця шчаслівым. Лета можа закруціць Блізнятам галаву і падштурхнуць да адзюльтэра, аднак зоркі папярэджваюць: любыя вашы «паходы налева» абернуцца галаўным болем.

**РАК**. Так, часам здараюцца і такія неспадзяванкі: самыя сямейныя з усіх знакаў задыяка, Ракі будуць неймаверна мучыцца з-за ўласнай абцяжаранасці другой паловай, дзецьмі і іншымі абавязкамі. Больш за ўсё ім захочацца збегчы на край свету і там пачаць усё зноўку: у першы раз пацалавацца — абавязкова з мускулістым прыгажуном у адной насцёгнавай павязцы або смуглай прыгажуняй у вянку з трапічных кветак, якія жывуць у суседняй вёсцы. І ў другі раз пацалавацца... А суседняя вёска, вядома, варагуе з вашай. І калі аб вашых прыгодах даведаюцца, вас скормяць жудаснаму гіганцкаму слану (усё гэта хлусня, што сланы — не драпежнікі!). Але, да вашай таемнай радасці, пабрацца шлюбам з імі ніяк не атрымаецца, так што вам дастанецца толькі асалода, а потым можна збегчы на іншы край свету пад пагрозай магчымага пераследу. Увогуле, вы зразумелі: шукайце рамантыку ўсюды, дзе толькі можна. Дзе нельга — стварайце. Бо без яе змарнееце.

**ЛЕЎ**. На працягу года Львам вельмі захочацца пусціцца ва ўсе цяжкія — але нешта ўвесь час будзе ім перашкаджаць. То ўласнае сумленне, то празмерная педантычнасць, то боязь асуджэння з боку знаёмых, а то і несвоечасовае вяртанне з камандзіроўкі другой паловы. З-за нерэалізаваных сэксуальных фантазій у Львоў неяк асабліва заказыча ўнізе жывата (не блытайце з пырханнем матылькоў — гэта толькі пры чыстай закаханасці бывае, а вашы пачуцці і жаданні назваць чыстымі язык не паварочваецца). У прынцыпе, нічога страшнага не здарыцца, калі вы і ўпусціце ўсе свае шанцы завязаць некалькі лёгкіх інтрыжак, аднак паспрабуйце хоць бы актыўна сублімаваць лібіда, якое рвецца вонкі. У ліпені Львам варта быць асабліва далікатнымі і ўважлівымі да сваіх спадарожнікаў жыцця — і тады жнівень можа стаць вашым другім мядовым месяцам.

**ДЗЕВА.** У любоўнай сферы Дзевы ў новым годзе застануцца не абласканымі. Або абласканымі, але не так, як бы ім хацелася. Або не тымі, з кім ім марылася. Увогуле, інтымны кубік Рубіка ніяк не жадае складацца. Да канца красавіка многія Дзевы будуць працягваць перманентна пакутаваць па згубленым даўным-даўно Вялікім Каханні, цалкам не заўважаючы ўсіх выдатных прэтэндэнтаў на сваё сэрца. Гэты анабіёз спыніцца толькі з прыходам цёплага сонечнага надвор'я — тады Дзевы могуць рэзка адтаяць. З надыходам восені Дзевы нарэшце скінуць назапашаны груз гармонаў і змогуць больш-менш цвяроза глядзець на сваё асабістае жыццё.

**ШАЛІ**. Па традыцыі, усе гады, якія заканчваюцца на адзінку, прыносяць Шалям адзіноту. Праўда, тут адзінак цэлых дзве — вось і тлумач, як хочаш: ці то вы будзеце ўдваіх, але адны, ці то вас на аднаго дадасца, ці то наогул барабанныя палачкі... Калі ж адцягнуцца ад бытавой магіі і любоўнай нумералогіі і звярнуцца да свяціл, то можна ўбачыць, што яны вам падміргваюць. Здаецца, гэта азначае, што яны ў гуморы — хоць не выключана, што пры гэтым ухмыляюцца і збіраюцца падкласці свінню. Тут галоўнае — вырашыць, як вы ставіцеся да гэтых жывёл. Калі высветліцца, што станоўча — можаце смела паказаць язык свяцілам. Яны прайгралі.

**СКАРПІЁН**. Дзіўна, але вось сэксу Скарпіёнам якраз будзе хапаць. Часам гэта іх нават палохае. Хоць нічога страшнага не адбываецца: проста ваша галава будзе настолькі забітая ідэямі, планамі, клопатамі, што туды проста не дойдуць сігналы аб нейкай узрушанасці. Або будуць губляцца дзесьці ў глыбіні і ў закутках лабірынтаў. Так што, калі вы цвёрда ўпэўненыя, што рэгулярны сэкс вельмі важны для здароўя, стаўце напамінкі ў мабільніку і дзейнічайце па раскладзе. Сямейныя ж Скарпіёны абавязкова павінны як мага больш размаўляць са сваёй палавінай аб асабістым і важным.

**СТРАЛЕЦ**. Вясна прынясе Стральцам любоўныя перажыванні (часцей за ўсё не ўзаемныя) і вострае запатрабаванне выказваць свае пачуцці вершамі. Магчыма, гэта не самы лепшы спосаб сублімацыі, але дзе ж вас утрымаеш ад струменя графаманіі? Ваша сэксуальнае жыццё ў летні перыяд будзе нагадваць гавайскую сумесь — хораша, ярка, але праснавата, а ўвосень і зусім ператворыцца ў вінегрэт — разнастайна, шмат, карысна, аднак у вас чамусьці не лезе... І яшчэ адна парада: перастаньце па звычцы спакушаць вашых былых умілаваных, бо нічога прыемнага гэты «свойскі флірт» вам не прынясе, а расхлёбваць заваруную кашу давядзецца не адзін месяц.

**КАЗЯРОГ**. Дзіўна, але ў выпадку Казярогаў (і гэта пры іх цвярозым поглядзе на рэчы) ва ўсім, што датычыцца сферы асабістых узаемаадносін, будзе працаваць містыка і магія. Так што вам лепш пачаць праграмаваць свой лёс адразу з Новага года, спальваючы доўгі пералік жаданняў і закідваючы попел у фужэр з шампанскім. Галоўнае — не піце ўсе жаданні залпам, а то яшчэ паперхняцеся ці пякотка пачнецца, або наогул у бальніцу загрыміце з апендыцытам. Звярніце яшчэ, калі ласка, самую пільную ўвагу на правільную фармуліроўку жаданняў. У цэлым жа Казярогі сапраўды сёлета рана або позна атрымаюць тое, на што разлічваюць і чаго просяць ва ўсемагутных касмічных сіл.

**ВАДАЛЕЙ.** У 2011 годзе Вадалеям неабходна цвёрда трымаць у руках нітачку ад паветранага шарыка сваіх наіўных памылак наконт іншых людзей. Бо калі вы яго выпусціце, то сіла зямнога прыцягнення разам з грузам клопатаў літаральна прыцісне вас да зямлі. У той жа час з аб'ёмамі шарыка вам таксама нельга перабіраць — інакш ізноў паляціце куды-небудзь у вышынныя сферы, і тады сапраўды ніякія надзённыя патрэбы навакольных людзей вас хваляваць не будуць. А зоркі настойліва раяць як мага больш часу праводзіць у сям'і, аталяючы сваім клопатам самых малодшых і самых старэйшых. Актыўныя зносіны з тымі і іншымі дапамогуць балансаваць на тонкай грані паміж поўнай дэпрэсіяй, жаданнем сысці ў свой унутраны свет і эйфарыяй ад уласнай персоны.

**РЫБЫ.** Нягледзячы на ўсе свае старанні праславіцца тонкімі і артыстычна-непрактычнымі натурамі, Рыбы ў надыходзячым годзе будуць праяўляць досыць прагматызму ва ўсім, што датычыцца сямейна-сэксуальнага жыцця. Без прыстойнай матэрыяльнай падтрымкі яны не гатовыя падзяліць сваю норку з кім-небудзь яшчэ. Знайшоўшы ж годнага прэтэндэнта на ролю сваёй палавіны, Рыбы дзелавіта пачынаюць яго эксплуатаваць, празрыста, але рэгулярна намякаючы, што гняздо час абстаўляць, а то і зусім пашыраць. Што нядрэнна было б папаліраваць лускавінкі Рыб, каб ім можна было бліскаць сярод іншых марскіх насельнікаў. Усё гэта — цалкам нармальныя і разумныя паводзіны. Таму смялей, не саромцеся, стойце на сваім!




Віншую вучонага і пісьменніка **Ул. Кісялёва** (Мінск), паэтэс з Баранавічаў **А. Жук** і **А. Дарашэвіч** з Новым годам і іх юбілеямі ў ім! Шчасця, радасці, здароўя, натхнення і плёну!

**Міхась МАЛІНОЎСКІ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА С УСЛОВИЯМИ

### по продаже неиспользуемого объекта, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине

Аукцион состоится **2 февраля 2011 г.** в 11.10 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 62, к. 106.

Организатор аукциона – фонд «Могилевоблимущество», тел.: 8(0222)311185, 223375, 229022.

**Продавец неиспользуемого имущества** – РУПП «Могилевхлебпром», тел.: 8(0222)323053, 224775.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11 марта 2010 г. № 342.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни в фонде «Могилевоблимущество» с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **31 января 2011 г. с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00.** Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **2 февраля 2011 г. с 10.00 до 10.50.**

| № лота | Сведения о неиспользуемом имуществе | | | Информация о земельном участке | | Сумма задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена, базовых величин* | Площадь, га | Срок аренды, лет | |
| 1. | **Незавершенное незаконсервированное капитальное строение** – расширение хлебозавода (производственный корпус, административно-бытовой корпус, котельная) | Могилевская область, г. Костюковичи, ул. Колхозная | 1 | 1,8242 | 50 | 35,0 |

** – Начальная цена продажи неиспользуемого имущества определяется исходя из размера базовой величины, установленного законодательством на дату проведения аукциона.*

Обязательные условия аукциона:

1. Использование покупателем указанного имущества в предпринимательской деятельности до 1 января 2017 г.

2. Создание покупателем на базе указанного имущества не менее двадцати рабочих мест и сохранение их в течение трех лет.

3. Запрет отчуждения указанного имущества до 1 января 2017 г.

Задаток перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, внесшие задаток в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет, подавшие организатору аукциона в определенный в извещении срок заявление с приложением (предъявлением) необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и получившие билеты участников аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов:

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; копии учредительных документов юридического лица без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Прием заявлений со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Дата и время регистрации заявления указываются организатором аукциона в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, при этом объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в газете «Звязда».

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков.

Срок заключения договора купли-продажи неиспользуемого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат.

Оплата за неиспользуемое имущество осуществляется денежными средствами по безналичному расчету без предоставления рассрочки в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

**Считать недействительными** страховые полисы ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске № 2 по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств, выезжающих за пределы Республики Беларусь, «Зеленая карта» серии BY номер /12/1227673, 1227674, 3144716, 1466608, 4090661-4090663; по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств серии ВС номер 2744725, 2744145, 2744146, 2707557; по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ номер 0227065, 0261071-0261075, 0275730, 0274414, 0284007, 0270374. УНП 102332274

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу, формы 2РН, 2РП серии БА № 0031421; по гражданской ответственности владельцев транспортных средств серии ВС № 2874209; квитанции 1 СУ серии КС № 0412465 считать недействительными.

Считать недействительными страховые полиса серии ВС № 2734971—2735000 по обязательному страхованию ГО владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь. УНП 200035955

ИП Носко Иван Анатольевич. Свидетельство № 190618692 ликвидируется. Претензии предъявляются в течение двух месяцев. Тел. (8 029) 863 86 70.

У **суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Лісоўскага Алега Аляксеевіча**, 2 сакавіка 1952 года нараджэння, ураджэнца в. Барэц Рэчыцкага раёна, які пражываў у г. Рэчыца, вул. Дастаеўскага, д. 51, кв. 37. Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Лісоўскага Алега Аляксеевіча, паведаміць суду Рэчыцкага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

## У АСІПОВІЦКІМ РАЁНЕ СУТЫКНУЛІСЯ 5 ГРУЗАВІКОЎ

29 снежня а палове на 8-ую гадзіну ўвечары ў Асіповіцкім раёне паблізу пасёлка Татарка фура «MANN», якой кіраваў 38-гадовы жыхар горада Гомеля, выехала на сустрэчную паласу руху і па чарзе сутыкнулася з трыма «МАЗамі», а потым яшчэ і з грузавой «Газеллю». Як паведамілі ў Магілёўскай ДАІ, 27-гадовы вадзіцель трэцяга па ліку «МАЗа» загінуў на месцы, а вадзіцель Газелі» шпіталізаваны з траўмамі.

**Ілона ІВАНОВА.**

# СВОЙ СЛЕД

## Працы беларускай сцэнарысткі Таццяны Сухоцкай скарылі расійскіх тэлеакадэмікаў: два «Тэфі» за 2010 год!

**Ніколі не ведаеш, якім чынам увойдзеш у гісторыю. Таццяна Сухоцкая з Беларусі ўвайшла ў гісторыю расійскага тэлебачання: яе праца ў 2010 годзе была адзначана адразу дзвюма прэміямі «Тэфі» за фільмы для студыі «Цывілізацыя». Сама лаўрэатка, здаецца, імкнулася сціпла замаўчаць гэты факт. Вядома, каму, як не ёй, ведаць: сапраўдны поспех не вымяраецца ўзнагародамі і віншаваннямі, а толькі рэальна і сумленна зробленай справай, якая можа быць карысна людзям. І тады яны цябе не забудуць. Як не забылі асоб, пра якіх знятыя дакументальныя тэлефільмы паводле сцэнарыяў Таццяны Сухоцкай. Некаторыя з іх нам вядомыя па цыкле «Геніі і злодзеі сыходзячай эпохі». Адным з аўтараў сцэнарыя праграмы з'яўляецца наша зямлячка. Жыхары Беларусі ведаюць яе па праекце АНТ «Адваротны адлік».**

**Героі яе фільмаў — людзі, рэальныя справы якіх уплывалі на лёсы краін, народаў ці пакідалі след у гісторыі ўсяго свету. Гэта людзі, імёны якіх застаюцца на вуснах, нягледзячы на тое, што мінаюць эпохі, стагоддзі. Сыходзіць год за годам, а сакрэты іх узлётаў і падзенняў, таямніцы іх жыцця, пытанні, якія былі галоўнымі для іх, здаецца ўсё такімі ж важнымі. Магчыма, праз іх думкі і пошукі мы лепш пазнаём сябе? Самі шукаем адказ на пытанне: што значыць быць асобай у свой час? Колькі трэба часу, каб раскрылася геніяльнасць асобы: дзесяцігоддзі руплівай працы, ці год палымянага натхнення, альбо адно імгненне, на якое прыйшлася нейкая вельмі важная думка? І калі так атрымліваецца, што наш час мы бачым і пазнаем праз тэлеэкран, няхай асоба тэлебачання падкажа адказы на гэтыя пытанні.**



Таццяна Сухоцкая, «Тэфі» і Леў Мікалаеў.

### Геніі тэлебачання

...Усяго толькі статуэтка, а столькі працы, мітусні было. Тэлевізійны «Оскар», як часта называюць гэтую прэмію ў Расіі, для некаторых мяжа мар: ці то атрымаць, ці то пабываць на самой цырымоніі, сярод тых, хто лічыцца багемай тэлебачання, — гэта ўсё адно, што паехаць на баль. Мінчанку Таццяну не надта ўжо і вабяць такія балі. Не першы раз праграмы, дзе яна была аўтарам сцэнарыя, наміналіся на гэтую прэмію. Але сёлета яна зразумела, што на гэты раз запрашаюць не проста так, у якасці гледача. Адразу сказалі, што трэба абавязкова прыязджаць, заказалі атэль. Нагадалі пра вечаровую сукенку — давялося адмыслова замаўляць нават два строі для цырымоніі ў маладой беларускай мадэльеркі. Два строі, таму што сёлета было дзве цырымоніі ўручэння «Тэфі» — ў Маскве і Піцеры. З кожнай Таццяна прывезла па «Тэфі». Прычым адну статуэтку ёй уручаў акцёр Максім Аверын, вядомы па серыяле «Глухар». Ёй падабаўся гэты герой, але пакуль дайшло да таго, як яны разам з рэжысёрам Юліяй Маўрынай узняліся на сцэну, Таццяна ўзгадала адну біблейскую ісціну: не ствары сабе куміра. Таму што вобраз, які стварае экран, часта не адпавядае рэальнасці. Ёй, безумоўна, тлумачыць метамарфозу не трэба было: сама ў сваіх сцэнарыях вельмі часта разважае пра гэта. Але ж трэба прызнаць, што ў той вечар метамарфоза адбылася і з ёй: імя беларускай жанчыны, якое ў яе персанальнай гісторыі звычайна ідзе ў цітрах пасля фільма, загучала па-каралеўску.

Усё-такі нездарма яна займаецца дакументалістыкай, якую называюць каралевай тэлебачання: яна даследуе рэальнасць і робіць гэта па-мастацку. Такі падыход да творчасці прывабіў аднойчы Таццяну, якая па адукацыі — мастак па шкле. Шкло — вельмі крохкі матэрыял. Рэальнае жыццё рэальных людзей — таксама. Аднак экраннае жыццё рэальных людзей можна пражываць зноў і зноў. Дзіўная прыцягальная метамарфоза...

— У 2006 годзе я пачынала як сцэнарыст у нашай беларускай праграме «Падарожжа дылетанта», — гаворыць Таццяна. — Потым зразумела, што трэба кудысьці рухацца, развівацца. Напісала некалькі заявак у Маскву. Так, сама, набралася смеласці. Гэта ўсё прасцей, чым здаецца. Насамрэч у Маскве шукаюць аўтараў. Бо добрых знайсці не так проста. У студыі «Цывілізацыя» мае прапановы спадабаліся. Леў Нікалаеў, які з'яўляецца вядучым «Геніяў і зладзеяў» і мастацкім кіраўніком праекта «Цывілізацыя», — вельмі мудры чалавек. Ён падбірае людзей, якія мысляць падобна. Ён адзін з карыфеяў тэлебачання. Вельмі ўзрадавала адзнака маіх прапаноў, асабліва таму, што я ведала, да каго яны патрапяць. З таго часу я стала пішу сцэнарыі для расійскіх тэлеканалаў.

Мяне ўразіў падыход да людзей, які ёсць там. У нас часта можна пачуць, што незаменных людзей няма. Але там разумеюць, што гэта не заўсёды так. Калі чалавек прафесійны, з ім працуюць і за яго змагаюцца. Таму што ад прафесіяналізму шмат чаго залежыць: можна зрабіць больш хутка, якасна, ад гэтага шмат плюсоў.

***— Вы паглядзелі на тэлебачанне іншымі вачыма?***

— Там, у адрозненне ад нашага тэлебачання, больш прыватнага пачатку. Зразумела, што тэлеканал не можа забяспечыць увесь эфір. Таму ёсць шмат кантор, якія робяць пэўны прадукт, які потым прадаюць каналам. Напрыклад, «Цывілізацыя» спецыялізуецца на вытворчасці праграм па навуцы і культуры. Ёсць тыя, што спецыялізуюцца на ток-шоу. Мне здаецца, што самі тэлеканалы робяць толькі навіны. Усё астатняе — гэта закупная прадукцыя. У нас ёсць спробы працаваць таксама, але іх пакуль мала.

Затое ў нас ёсць людзі і таленавітыя, і геніяльныя. Людзі насамрэч ствараюць краіну. Сама сабе дзіўлюся: я настолькі патрыётка, што ва ўсім шукаю беларускія карані. А калі інтуіцыя мяне не падводзіць, дзіўлюся, колькі мы пра сябе не ведаем. Мы сябе не ведаем, калі не разумеем, як і з чаго складвалася беларуская цывілізацыя, якія вынаходлівыя ў нас людзі. Вось той жа Маскве Крэмль адбудавалі нашы земляки, і «сталінкі» прыдумалі. І калі так пакапаць... Асоба за асобай, ствараць агульны вобраз народа. Мне наогул падабаецца гісторыю краіны раскрываць праз асоб.

### Два бакі геніяльнасці

— Праграма «Геніі і зладзеі» дае погляд на гісторыю праз тых асоб, якія для нас калісьці былі знакавымі. Мы пра іх ведалі штосьці адно, а цяпер маем магчымасць даведацца штосьці іншае, новае. Паглядзець на іх не толькі як на дзеячаў, а як на людзей.

Геній і злодзей у кожным чалавеку можа ўжывацца. У прынцыпе, у гэтых двух словах сутнасць нашага грамадства. У кожнага медаля ёсць два бакі, і ў кожным чалавеку могуць быць некалькі сутнасцяў. Напрыклад, я прапанавала ў якасці герані Соф'ю Кавалеўскую. Мне вельмі хацелася пра яе напісаць яшчэ і таму, што яна мае беларускія карані. Падаць гісторыю не матэматыка, а ў першую чаргу жанчыны.

Але самае першае, што мне прапанавалі, — зрабіць сцэнарый пра Фелікса Дзяржынскага, таму што ён з Беларусі родам. З гэтага фільма пачалося маё супрацоўніцтва з праграмай «Геніі і злодзеі» . Мы зрабілі фільм з беларускім рэжысёрам Дзянісам Скварцовым. Ён мой сябра дзяцінства, мы адно аднаго разумеем. На мой погляд, гэты фільм у праграме быў адзін з самых удалых, таму што я пайшла ад адваротнага: паспрабавала ў псіхалогіі пакапацца і правяла асабістую гісторыю Дзяржынскага праз запаветы Божыя. Менавіта тут усё і стала на свае месцы: ён вучыўся калісьці ў семінарыі і ў выніку прыйшоў да таго, з чаго пачынаў... Ва ўсялякім выпадку я так зразумела па яго шмат якіх выказваннях, калі шукала матэрыял для фільма.

Канцэпцыя «Геніяў і зладзеяў» — паказаць чалавека з незвычайнага боку. А як часта мы думаем, што чалавек — геній , а калі раскрыць мінусы ў яго ўчынках, атрымліваецца, што не так усё проста. Хоць у мяне быў герой, у якім я нічога адмоўнага не знайшла. На гэтым я і пабудавала сцэнарый пра фізіка-эспэрыментатара Роберта Вуда. У яго ўсё жыццё — як карцінка.

***— Магчыма, гэта залежыць ад таго, каму ў які час выпала жыць і дзе. Бо гісторыя асоб непадзельная ад гісторыі краін.***

— Тут трэба ўзгадаць фільм, які ішоў па канале «Культура» і быў адзначаны «Тэфі» пра савецкага гісторыка Яўгена Тарле. Гэты чалавек напісаў кнігу пра Напалеона, якая вельмі спадабалася Сталіну. Калі я пра яго пісала, зразумела, як гэты чалавек здолеў захаваць сябе. Ён мог з'ехаць у Францыю, працаваў у Сарбоне і мог там застацца. Але выбраў сваю краіну і працаваў дзеля яе. Ён рабіў свае даследаванні і навучыўся жыць так, каб не згубіць свайго «я». У яго не было дзяцей, практычна не было вучняў. Але ён застаўся самім сабой.

***— Вы, напэўна, знаходзілі герояў, у якіх хацелася б павучыцца?***

— Жарэс Алфёраў. Я рабіла пра яго дакументальны фільм — карціна пакуль не выйшла на экран. Я проста закахалася ў Алфёрава. Чалавек жыў у сваім часе, сумленна працаваў і стварыў навуку, учыніў сапраўдны прарыў, хоць, здавалася, для гэтага была зусім непрыдатная глеба. Гэта можна лічыць працоўным подзвігам. Такія асобы заражаюць аптымізмам. Тым больш што Нобелеўскі лаўрэат Алфёраў — наш зямляк. Вытокі ягонай самаадданай працавітасці нам вядомыя і зразумелыя. Наогул, наша краіна нарадзіла шмат выдатных асоб, пра якіх мы, на жаль, мала ведаем.

### Зямля геніяў

— Наша тэлебачанне даўно патрабуе асобнага культурна-гістарычнага канала. Чаму мы павінны глядзець «Дыскаверы» і іншыя пазнавальныя каналы? У нас свая гісторыя, не менш цікавая, чым у тых жа суседзяў. А гэта пакідае вялікі грунт для працы тым жа кіна- і тэледакументалістам.

Адзін з самых яркіх і якасных беларускіх тэлепраектаў — «Адваротны адлік» на АНТ. Яго робіць майстэрня Уладзіміра Бокуна, з якой мне выпала супрацоўнічаць у Мінску. Я лічу, што гэта адна з лепшых праграм АНТ, таму што дазваляе прыадкрыць маляведамыя старонкі беларускай гісторыі. Іх захоўваюць самі нашы людзі! Яны часта нават не ўсведамляюць, якімі ведамі валодаюць. Так, калі мы аднойчы заехалі ў Заходнюю Беларусь, то як быццам між іншым даведаліся, што ў гады вайны тут былі «чырвоныя» і «белыя» партызаны. Мы тады самі не адразу зразумелі, пра што гаворка. Аднак я стала цікавіцца, пайшла ў архівы... Вось так натрапіла на след «Арміі краёвай», пра якую зрабілі фільм. Мяне сапраўды ўражвае беларускае мінулае. Нават калі не думаеш, што яно беларускае, і, наадварот, упэўнены на ўсе сто, што не, раптам выяўляюцца нечаканыя факты. Калі мы працавалі над фільмам пра «Катынь», я з'ездзіла пад Смаленск. Паглядзела на прозвішчы пакараных: шмат беларускіх. Мястэчкі, адкуль паходзілі гэтыя людзі, — у Заходняй Беларусі. Адзін з двух генералаў — Багатыровіч, з Гродна. Я думаю, і людзі, якія паглядзелі гэты фільм, былі здзіўленыя.

Пачынаеш капаць, дык нашы беларусы былі паўсюль. Толькі пра тое, што яны нашы, — трэба яшчэ доўга даводзіць. Здавалася б, ужо ніякіх сумненняў у беларускім паходжанні Міцкевіча ці Манюшкі. Яны ж на нашай зямлі нарадзіліся! Але нават ад сваіх сучаснікаў-беларусаў часта можна пачуць: палякі... Яшчэ адзін такі ж «паляк» Семяновіч — гэта ў яго Цыялкоўскі «запазычыў» ідэю палёту ў космас. Той жа наш Леў Сапега — першую дэмакратычную канстытуцыю прыдумаў!.. Тлумачу гэта як і дзе толькі можна.

Але дзеля гэтага ў творчым аб'яднанні «Мір-фільм» прыдумалі праект, які б расказваў людзям у іншых краінах пра вядомых беларусаў, што зрабілі ўнёсак у сусветную цывілізацыю. 22 серыі задумана. Знята больш за палову, 6 серый былі паказаны. У асноўным мы ўзялі малавядомыя імёны. Тэдар Нарбут — хто пра яго што ведае? А ён спраектаваў крэпасць у Бабруйску. Яна ў свой час была адзінай крэпасцю, якая не здалася французам у 1812 годзе — проста не змаглі ўзяць! Пасля таго, як цыкл пайшоў па тэлеканале «Мір», многія пісалі ў водгуках на сайце: «Беларусы, дзякуй, мы не ведалі такіх асоб». Гэты канал глядзяць у Кіргізіі, Грузіі, у Расіі, Украіне. Такім чынам праект працуе на імідж нашай краіны.

«Зямля геніяў» — так назвалі праект тэлекампаніі «Мір» у Маскве, калі паглядзелі спіс асоб, якіх мы б хацелі прадставіць. І аказалася: французскі паэт Гіём Апалінэр з беларускімі каранямі, мастак Хаім Суцін, акадэмік Ота Шміт, сусветна вядомы дэкаратар Бакст нарадзіўся ў Гродне. Той жа Малевіч, па-сутнасці, наш чалавек... Парадокс, што большая частка гэтых людзей рэалізаваліся не на радзіме. Два Агінскіх у нашым спісе — дзядзька Міхал Казімір, які пабудаваў шыкоўны оперны тэатр у Слоніме, і пляменнік Міхал Клеафас, які вярнуўся і на радзіме напісаў славуты паланэз.

***— У гісторыі Беларусі былі розныя эпохі. Як яны ўплывалі на з'яўленне ці праяўленне чалавечага генію?***

— Было «Залатое стагоддзе», а былі і 60-я, 70-я, абсалютна савецкія па сутнасці гады мінулага стагоддзя. Вось у той час, здавалася, у беларускай культуры павінна была быць пустэча. Але ж тады з'явіўся Быкаў, які распавёў пра вайну абсалютна па-беларуску, з сапраўдным чалавечым болем, які стаў болем зямным. Тады вырас Караткевіч — абсалютна не такім, якім павінен быў вырасці паводле тагачаснай сістэмы выхавання, а наадварот, з упэўненасцю ў асаблівасці беларусаў. Гэта доказ таго, што ёсць у нас адмысловая здольнасць да самазахавання: нават калі толькі адзінкі думаюць пра гэта, сама ідэя краіны Беларусь будзе існаваць. Караткевіч — насамрэч геній нашага народа. Мы ж, беларусы, сціплыя па прыродзе, сваімі поспехамі не любім пахваліцца. Можа, і не трэба хваліцца, дастаткова для сябе ведаць. На ведах трымаецца патрыятызм. З верай у сябе, у будучыню, у свой народ і краіну вырастаюць асобы.

***— Але ёсць такі алгарытм: каб мяне заўважылі на радзіме, трэба, каб ацанілі яшчэ недзе.***

— Сваю радзіму, свой горад Мінск, я не прамяняла на Маскву, колькі ні запрашалі пераязджаць. Спрабавала там жыць — тыдзень, два... Не мой горад. Тут у мяне сябры, сям'я. На радзіме ўсё дапамагае. Тут я больш адчуваю людзей і хачу з імі размаўляць праз экран.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# УРГАНТ І ЦЭКАЛА ЗАГАВОРАЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ, а Павел Латушка прыйдзе на «Кухню»

**Чым яшчэ здзівіць гледача навагодні эфір?**

**31 снежня Першы канал прадставіць доўгачаканы выпуск навагодняй перадачы «Вялікая розніца» — беларуская аналага расійскага парадыйнага шоу. Гледачы пабачаць пароды на зорак беларускага шоу-бізнэсу — Анатоля Ярмоленку, Алесю, гурт «Сябры», Аляксандра Ціхановіча і Ядзвігу Паплаўскую, Георгія і Дзмітрыя Калдуноў, Анжэліку Агурбаш, гурт «Тяни-Толкай», карэспандэнта АТН Міхася Равуцкага, Святлану Бароўскую і іншых.**

Як сцвярджаюць рэжысёры, падрыхтоўка вялася сем месяцаў — за гэты час былі створаны дакладныя копіі дэкарацый і сцэнічных касцюмаў герояў, а самі вобразы прапрацоўваліся да дробязяў. Самае цікавае, што вядучыя праграмы — Іван Ургант і Аляксандр Цэкала — загавораць па-беларуску.

У гэты ж дзень у вечаровым эфіры Першага канала Белтэлерадыёкампанія прэзентуе ўласны кінапраект — аўтарскі дэтэктыў па матывах твораў Вольгі Тарасевіч «Пацалунак Сакрата». Серыял аб'яднае шэсць двухсерыйных мастацкіх фільмаў: «Смяротны водар», «Каралі Неферціці», «Праклён Эдварда Мунка», «Чысты след», «Шагалаў анёл, які плача», «Таямніца залатых апосталаў».

— Гэты праект унікальны як для Белтэлерадыёкампаніі, так і ўвогуле для беларускага кіно, — гаворыць галоўны рэдактар серыяла Ігар Касцючэнка. — Гэта першая ў Беларусі спроба ажыццявіць экранізацыю нацыянальнай дэтэктыўнай серыі.

Серыял здымалі ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета, Нясвіжскім замку, Нацыянальнай бібліятэцы, Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў в. Азярцо пад Мінскам. Першым фільмам з серыі «Пацалунак Сакрата» стане фільм «Смяротны водар».

Тэлеканал АНТ 1 студзеня таксама пакажа «Вялікую розніцу», толькі ў адрозненне ад Першага канала — ужо расійскую версію перадачы. Гледачоў чакае навагодні выпуск, дзе гасцям будуць уручаць «Залатыя тармашкі».

Прэм'ера АНТ «Навагодняя кухня» парадуе гледачоў у навагоднюю ноч. Трыа вядучых дапоўніць Люся Лушчык. Упершыню гледачам будзе паказана не толькі кухня, але і іншыя пляцоўкі праграмы: вітальня і музычны пакой. Сярод гасцей у навагоднім эфіры чакаецца шмат знакамітасцяў: Алесь Мухін, гурт «3+2», Вадзім Дзевятоўскі, Аляксандр Саладуха і нават міністр культуры Беларусі Павел Латушка.

На тэлеканале «ЛАД» у навагоднюю ноч будзе паказана ажно восем (!) серый серыяла «Інтэрны». У эфір запусцяць таксама канцэрты танцавальнага калектыву «Харошкі» і грузінскага ансамбля песні і танца «Эрысіёні». Пасля навагодняга выпуску праграмы «Жывы гук» гледачы змогуць паглядзець падборку лепшых сусветных кліпаў 2010 года.

Тэлесеткі



Чакаецца таксама і незвычайнае афармленне навагодняга эфіру. Падымаць настрой паміж святочнымі праграмамі будуць вясёлыя ролікі пра Дзеда Мароза і Снягурку.

У першыя дні новага года беларускія каналы парадуюць гледача святочнымі камедыямі, серыяламі і фіналам праекта «Лёд і полымя».

**Ілья ЛАПАТО.**



# РАЙСКІЯ ЯБЛЫЧКІ НА ХВОЙНЫМ ДРЭВЕ

## А таксама — «будзёнаўцы», «касманаўты» і «царыца палёў» — кукуруза

**Гэтыя і многія іншыя ўпрыгажэнні (зразумела, з калекцыяй дзедаў-марозаў і снягурак) можна ўбачыць у Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі на выставе, прысвечанай святочнай ёлцы. У экспазіцыі — 260 выробленых да 1966 года цацак (менавіта яны лічацца найбольш каштоўнымі), якімі карысталіся жыхары горада над Нёманам. Ды і працягваюць карыстацца, бо арганізатары выставы звярнуліся не толькі да фондаў музея гісторыі рэлігіі і Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, але і да сваіх знаёмых.**

### «ЧАГО ЯНА СЮДЫ ПРЫЙШЛА, У НАШУ КАМПАНІЮ?»

**Старшы навуковы супрацоўнік Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі Аліна ХАМКО** ведае шмат паданняў пра гісторыю набыцця елкай статуса каляднага, святочнага дрэва.

Паводле адной з версій, першым у свеце ёлку на Раство прынёс да Хрыста сам Іосіф. Ён быў цесляром, добра ведаў лес, дрэвы, вось і зрабіў такі падарунак маленькаму Хрысту.



Альбо такое паданне. Калі нарадзіўся Хрыстос, то ўсе дрэвы «пайшлі» на яго паглядзець, пакланіцца яму. Сярод першых былі, вядома, алівы і пальмы. Прыйшла і елка з вельмі далёкай Поўначы. На яе, калючую, глядзелі, як на нейкую папялушку: «Чаго яна сюды прыйшла, у нашу кампанію?» Елка стала адчуваць сябе няёмка, чужой. Але раптам штосьці здарылася ў свеце. Зоркі сталі спускацца з неба і ўпрыгожылі гэтую елачку. І яна зрабілася такой прыгожай і смелай, што падышла да Хрыста.

Ёсць і цікавыя звесткі пра святога Баніфацыя, які лічыцца патронам Германіі, дзе зарадзілася і пачала распаўсюджвацца па свеце традыцыя калядной ёлкі. Вядомы факт, што ён чытаў казань друідам і, каб паказаць ім, што дуб — не свяшчэннае дрэва (друіды яму пакланяліся), ссек яго. І калі яно падала, то паваліла ўсе дрэвы, акрамя аднаго — елкі (па іншых крыніцах, гэта была піхта, якая таксама ўпрыгожваецца на Захадзе). І тады святы Баніфацый сказаў, што хай гэтае дрэва будзе дрэвам Хрыста.

Вядома, што ў XVI — XVII стагоддзях ёлка ўжо была ў хаце на Каляды. А шырока па ўсім свеце яна распаўсюджваецца ў XIX стагоддзі, прычым, перш чым стаць сімвалам сямейнага свята — сярод вышэйшых слаёў грамадства. Напрыклад, у Расіі калядная ёлка пачынае ставіцца папулярнай з 1817 года, калі нямецкая прынцэса Шарлота выходзіць замуж за Мікалая І і прывозіць гэтую традыцыю ў Пецярбург, хаця яна там ужо і існавала сярод немцаў.

Дарэчы, папулярызацыі ёлкі як святочнага дрэва пасадзейнічалі літаратурныя творы, у прыватнасці, раман Гётэ «Пакуты маладога Вертэра», раман Дастаеўскага «Ёлка і вяселле», казкі Гофмана «Шчаўкунок і Мышыны кароль».

У СССР калядная ёлка была забаронена. Больш за тое, спачатку, у 1920-я гады, не было нават навагодняй. Але 28 снежня 1935 года ў газеце «Праўда» з'яўляецца артыкул Постышава, дзе ён піша, што трэба дзецям арганізаваць ёлку. І ў наступным годзе ў Крамлі, у Калонным зале Дома саюзаў, арганізоўваюць галоўную навагоднюю ёлку краіны. З гэтага часу ёлка, а асабліва ў пасляваенны перыяд, заваёўвае ў Савецкім Саюзе, у тым ліку на нашых землях, не толькі горад, але і вёску.

— А калі з'явіліся вельмі папулярныя цяпер — асабліва на працы, на рабочым стале — ёлачкі-малюткі? — цікаўлюся ў Аліны Хамко.

— У пачатку 50-х гадоў мінулага стагоддзя, калі было шмат камунальных кватэр, дзе мала месца для вялікіх ёлак.

### УПРЫГАЖЭННІ ДВАЙНОГА КАРЫСТАННЯ: СПАЧАТКУ — ДЛЯ КАТАЛІКОЎ, ПОТЫМ — ДЛЯ ПРАВАСЛАЎНЫХ

— Я чула цікавыя аповеды, што тычацца нашых земляў, дзе жывуць і каталікі, і праваслаўныя, — расказвае Аліна Хамко. — Калядныя святы для іх не супадаюць па часе, і мне апавядалі, што пасля вайны, калі быў дэфіцыт ёлачных упрыгажэнняў, яны мелі двайное карыстанне. Спачатку гэтымі цацкамі ёлку ўпрыгожвалі каталікі, а потым — іх праваслаўныя сваякі альбо знаёмыя. Пры гэтым, напрыклад, мая мама ўпрыгожвала ёлку так званымі райскімі яблычкамі, якія не елі, бо яны кіслыя.

Дарэчы, першыя калядныя ёлкі, паводле гістарычных крыніц, якраз і ўпрыгожваліся яблычкамі, грушкамі. А таксама цукеркамі, печывам, вафлямі з аплатак — хлеба прычасця. Усё — натуральнае. Штучнымі маглі быць хіба што кветкі, бо, згодна з паданнем, усе дрэвы на Каляды расцвілі і далі свае плады.

З'яўленне штучных ёлачных упрыгажэнняў (XVI — XVII ст.) паданні звязваюць з тым, што ў адзін год у Германіі быў неўраджай яблыкаў, і на дапамогу людзям прыйшлі шкловыдзімальшчыкі. Адсюль і вельмі старажытная сімволіка шароў, якія па сёння застаюцца «каралямі» святочнай ёлкі.

Вельмі даўно зарадзілася і традыцыя ўпрыгожваць ёлку свечкамі (цяпер — гірляндамі), а таксама Віфлеемскай зоркай альбо Анёлам на верхавіне. Зразумела, што ў савецкі перыяд наверсе была ўжо не Віфлеемская, а чырвоная зорка. А анёлаў замянілі «будзёнаўцы», «піянеры» і іншыя персанажы новай эпохі, з сярпом і молатам і іншай сімволікай савецкай эпохі. З'явіліся аўтамабілі — вось вам і цацкі з іх выявамі. Паляцелі ў космас, перамагаем у спорце — як жа на ёлцы без «касманаўтаў», «спартсменаў»? Выйшаў на экраны фільм «Карнавальная ноч» — тут жа з'яўляецца цацка-гадзіннік, дзе заўсёды без пяці хвілін дванаццаць.

Акрамя таго, ёлку пачалі ўпрыгожваць усялякімі лялькамі. Прычым яны прадаваліся без адзення, і дзецям трэба было апрануць іх на свой густ. І, вядома, нельга абысціся без казачных герояў, якія, каб можна было ўмацаваць на ёлцы, рабіліся на прышчэпках.

Што тычыцца Дзеда Мароза, то ён такім, як цяпер, быў не заўсёды. Спачатку, маркуючы па ёлачных персанажах, гэта быў сярдзіты дзед, накшталт лютага марозу. Але затым ён падабрэў і стаў тым, хто прыносіць дзецям падарункі.

А вось што ў ёлачных упрыгажэннях заставалася нязменным і, у адрозненне ад Віфлеемскай зоркі альбо анёлаў, не забаранялася, дык гэта зусім «непалітызаваныя» прадстаўнікі садавіны і агародніны. Хоць і тут адчуваецца подых часу: да папулярных здаўна яблыкаў, груш і арэхаў дабавіліся агуркі, перац, трускалкі, а ў часы Хрушчова, зразумела, не магла быць забытай «царыца палёў» — кукуруза.

Дарэчы, для вырабу многіх з паказаных на выставе ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі ёлачных упрыгажэнняў выкарыстоўвалася звычайная вата. А таксама — кардон, шкло, шклярус, так званы штучны снег (шар, які выдзімаўся вельмі тонкім, разбіваўся, і гэтымі дробнымі лускавінкамі пакрывалася цацка) і нават пілавінне. Усё можа быць прыгожым, калі зроблена па-майстэрску, з душой.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**

# ЗІМА СВАІМІ РУКАМІ

**Мы не чараўнікі, мы толькі вучымся. І не важна, хто мы: студэнты, якім не хапае грошай на дарагія цацкі і гірлянды, каб упрыгожыць пакой у інтэрнаце; маладыя мамы, якім трэба заняць сваіх дзетак; ці проста людзі, якім хочацца свята. Сёння наша мэта — уразіць блізкіх. Шчыраваць будзем з таго, што пад рукамі. Патраціцца давядзецца хіба што на клей і нажніцы. Прынамсі, усе рэцэпты правераныя ў хатніх і рэдакцыйных умовах. Ну што, пачнём чараваць?**

### ЗАМАРОЗІМ АКЕНЦА

Хто-хто, а мы не застанемся без снегу, шэрані, ледзяшоў і марозных малюнкаў на акенцах, нават калі на вуліцы будзе стаяць плюсавая тэмпература. Не верыце? А паспрабуйце зрабіць, як мы: націраем на тарцы кавалак белага мыла, да атрыманых шматкоў дадаём нямнога вады і ўзбіваем міксерам усё да густой мыльнай пены. Пенай можна выкласці ўзор. А можна наклеіць пры дапамозе клея-алоўка на акенца шаблоны (выразаныя з кардону елачку, аленя, сняжынку), а пасля пакрыць акенца мыльнай пенай. Калі пена высахне, шаблоны здымаем — на іх месцы застануцца некранутыя «лёдам» акенцы.

Дарэчы, можна на шкле і проста памаляваць мылам (лепш абмылкамі). Як варыянт — на акенцы можна рабіць узоры зубной пастай: хочаце адразу «выціскайце ўзор» з цюбіка, альбо развядзіце пасту вадой і вазьміце старую зубную шчотку. Варта яе абмакнуць у раствор з зубной пастай, правесці па шчаціннi пальцам — і на акно пырснуць кроплі, падобныя на снег. Хочаце зрабіць святочным люстэрка? Прыклейце на яго папяровую сняжынку (яе проста трэба намачыць, а лішкі вільгаці ўбраць сурвэткай). Цяпер «пырскайце» пасту (ці белую фарбу). Калі ўсё падсохне, сняжынку адклейце.

Зрабіць «снегапад за акном» пад сілу нават самым маленькім чараўнікам. Дайце дзіцяці некалькі сурвэтак — няхай ірве на дробныя кавалкі і пры дапамозе клея-алоўка мацуе на акенцы. А пакуль гарэза заняты, можаце спакойна займацца прыгатаваннем святочнай вячэры.

### СНЕГ, ЯКІ НЕ РАСТАЕ

Не, я не пра той штучны снег, які сёння ўжо можна набыць на рынку. Мы свой зробім самі. З ваты, з пенапласту, альбо, як мае знаёмыя... з памперсаў. Трэба толькі вытрасці змесціва памперсу (таго, што не быў у карыстанні :)), дадаць вады — і вось ён, снег, які не тае. Яго нават можна зрабіць халодным, калі патрымаць у лядоўні.

За снегам або інеем можна завітаць на кухню... У вас ёсць галінкі, якія вы будзеце ставіць у вазу, сасновыя ці яловыя шышкі? Самы просты спосаб — пафарбаваць (знайшлі ў аддзеле з канцтаварамі серабрыстую ці залацістую фарбу ці фарбу з бліскаўкамі — выдатна (таксама можна пашукаць балончыкі з фарбамі патрэбных вам колераў на будаўнічых рынках). А калі не — «паскрабём па сусеках». Варта толькі змазаць шышку клеем і пасыпаць соллю, цукрам, манкай — і заснежаны аб'ект гатовы.

Хочаце шэрань на абадку бакала? Абмакніце яго сокам лімона і абмакніце ў талерцы з цукрам (соллю).

### СНЯЖЫНКІ ЯДОМЫЯ І НЕЯДОМЫЯ

Далікатныя сняжынкі атрымліваюцца з клею. Вы ўжо спрабавалі ствараць малюнкі вітражнымі фарбамі? Такія фарбы каштуюць дорага, а ўсё тое ж самае атрымліваецца і з клея ПВА. Намалюйце шаблон на паперы, укладзіце яго ў файл альбо ў любы празрысты пакецік. Абавязкова ў шаблоне павінны быць замкнутыя фрагменты, якія можна будзе заліць клеем. Робім контур малюнка чорным клеем (дадаём у ПВА акварэль ці гуаш). Контур павінен быць аб'ёмным.

Пакідаем сохнуць (на некалькі гадзін). Зноў падфарбоўваем клей у розныя колеры і заліваем ім буйныя дэталі сняжынкі. Праз суткі такі малюнак лёгка здымаецца з плёнкі — і можна прыціскаць да акенца. Калі налепка надакучыць, то



пазбавіцца ад яе можна за адну секунду.

Нават звычайную папяровую сняжынку можна зрабіць больш «крохкай», калі яе абмазаць клеем і пасыпаць соллю (цукрам). А можна намаляваць сняжынку на лісце паперы клеем. Потым сыпце соль, пачакайце пакуль падсохне і страсіце з малюнка лішкі солі.

А яшчэ сняжынкамі можна частаваць гасцей. Варта толькі ведаць рэцэпт: у сухую каструлю кладзіце бялок яйка і паступова дадавайце цукровую пудру (трэба паўшклянкі), пры гэтым энергічна мяшайце масу, дадайце некалькі крышталікаў лімоннай кіслаты (ці кроплю воцату). Мяшайце яшчэ хвіліны дзве. Гатовая маса павінна быць эластычнай і не вельмі густой. Напоўніце ёй кандытарскі мяшочак (варонку з паперы з абрэзаным канцом) і выціскайце малюнак на бляху ці паднос, крыху змазаны алеем. Прамяні сняжынкі рабіце таўсцей, тады вырабы атрымаюцца больш трывалымі. І яшчэ: чым больш перакрыжаванняў на сняжынцы, тым яна надзейней. Засталося толькі падсушыць — і гатовыя ядомыя сняжынкі можна за нітку вешаць на ёлку.

### БЯСПЕЧНЫЯ ЛЕДЗЯШЫ

Іх можна зрабіць з таго ж цеста, што і сняжынкі (глядзі вышэй), а можна спячы. Патрэбны для цеста шклянка мукі, 100 грамаў цукру, 0,5 чайнай лыжкі разрыхляльніка цеста, 0,5 пакеціка ваніліну, цэдра 1 лімона, 1 бялок, 150 грамаў маргарыну; каб змазаць печыва — жаўток і чайная лыжка малака ці вады.

Замясіць тэста, падзяліць на невялічкія кавалкі, з якіх зляпіць палоскі. Перакруціце па дзве палоскі — і атрымаюцца ледзяшы. Цяпер іх трэба змазаць жаўтком і пячы ў гарачай духоўцы 8-10 хвілін.

Дэкаратыўны лядзяш, які калі і зваліцца на галаву, бяды не нарабіць, атрымаецца з файла (ці празрыстай упакавачнай плёнкі): звярніце файлік кульком, унутр пакладзіце мішуру, абгорткі ці маленькія цукерачкі. Верх ледзяша абматайце ніткай і ўпрыгожце стужкай.







### ПАГУЛЯЕМ У СНЕЖКІ

Снежак можна нарабіць з нітак. Надзімаем шарыкі і абмотваем іх белымі ніткамі, змочанымі клеем. Калі канструкцыя высахне, шарык лопаем і вымаем. Снежкі гатовыя. Калі зрабіць некалькі такіх, дык і на снегавіка хопіць.

Свайго рэдакцыйнага снегавіка мы зрабілі за 5 хвілін. Пустую бутэльку з-пад пітнога ёгурту абклеілі ватай, шапку змайстравалі з дзіцячай шкарпэткі, вочы — пацеркі, нос — кавалак пластыліну. Снегавіку можна зрабіць шалік з атласнай стужкі, а можна проста прычапіць гатовы банцік.

З ваты можна ляпіць снежкі і ствараць самыя розныя вырабы. Адну шклянку вады даводзім да кіпення. Лыжку крухмалу разводзім у невялікай колькасці вады і ўліваем у кіпень. Клейстар студзім. Туды акунаем шарыкі з ваты, адціскаем іх, прыдаём патрэбную форму і раскладаем для сушкі. Калі снежкі падсохнуць, з іх можна ляпіць цацкі (розныя дэталі аб'ядноўваем з дапамогай клею).

### ЗОРКА НА ШЧАСЦЕ

Калядную зорку можна зляпіць з цукровай масы. Зорачак, гэтак жа як сняжынак і разнастайных ёлачных цацак, можна нарабіць і з салёнага цеста (шклянка мукі, шклянка солі і вада). У цеста можна дадаваць фарбы (атрымаецца нешта накшталт каляровага пластыліну). Можаце таксама расфарбаваць гатовую цацку. Вырабы сушыце альбо ў духоўцы, альбо пры пакаёвай тэмпературы. Праверана: гатовая высушаная цацка з цеста можа захоўвацца не адзін год.

Але самы просты спосаб па вырабе зорак: замарозіць каляровую ваду. Мы для гэтага выкарыстоўваем латкі ад яек, упакоўкі ад цукерак, формачкі. Наліваем у іх ваду, робім яе каляровай пры дапамозе фарбаў (можна марозіць кавалкі абгортак ад цукерак, пялёсткі, мішуру). Топім у гэтай вадзе канцы нітак — гэта будучая пяцелька, за якую будзем вешаць зорачку на дрэўца на дварэ ля свайго дома. У святочную ноч выходзьце ў двор — лавіце сваю калядную зорку і загадвайце жаданне. З Новым годам, з новым шчасцем!

**Зіму стварылі Алена ДЗЯДЗЮЛЯ і Марына БЕГУНКОВА (фота).**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



### АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

**Па гарызанталі:** Ахеджакава. Раса. Руб. Анод. Латок. Хна. Азон. Атам. Баба. Сыр. Луста. Буркоў. Арк. Апала. Наліўка. Лук. Кіт. Опера. Барана. Пас. Ангар. Біт. Грам. Аса. Арад. Дэкада. Ахун. Маса. Блат. Якаўлеў. **Па вертыкалі:** Брыльска. Горб. Тырса. Лепта. Лаура. Колба. Каскад. Жанр. Атакама. Карбанат. Рахат. Ната. Градус. Вясло. Унт. «Даная». Дамба. Бры. Ялта. Кобра. Рог. Накрыўка. Бок. Кінза. Ісаў. Дата. Мягкоў.

## Навагодні анекдот

Тэхнолагі завода «Крышталь» даказалі ўсё ж, што раніцай 1 студзеня галава баліць ад мандарынаў.

☺

**Хутка Новы год. А яшчэ дагэтуль сорамна за мінулы.**

☺

У бальніцы.

— Добры дзень, Міхась.

— Прывітанне, Мікалай Канстанцінавіч.

— Адгадай загадку: не п'е, не курыць — на Новы год дзяжурыць!

— Эээ... Гэта вы на што намякаеце?..

☺

**1-е студзеня — «Дзень незалежнасці апорна-рухальнай сістэмы». Заступнікамі свята спрадвеку лічыцца Святы Цытрамон. Пачынаецца свята а 8 гадзіне ўвечары. Сігналам да пачатку свята з'яўляецца званок з пытаннем «А што ўчора было?»**

☺

Жонка прыязджае пасля доўгай адсутнасці, заходзіць у пакой:

— Дарагі, ты ёлку вынес?

— Вынес, яшчэ тыдзень таму, а што?

— Што, што — ідзі па новую, дурань, Новы год праз тыдзень!

☺

**У наш часопіс прыйшоў ліст ад групы чытачак, якія перад пачаткам Новага года пытаюцца: «Колькі павінен есці мужчына — колькі хоча ці колькі можа?» Адказваем: «Колькі дадуць!».**

☺

— Алё, гэта ў вас можна заказаць на дом Дзеда Мароза і Снягурку?

— Так.

— Тады прышліце нам, калі ласка, пяць Снягурак і скрыню гарэлкі.

☺

**Навагодні вечар, застолле.**

**— Ты аліўе будзеш?**

**— Не.**

**— Тады я ў ім буду спаць.**

☺

Што для людзей Новы год, то для елкі смерць.

☺

**Маршрутка, 1 студзеня. Заходзіць п'яны мужык. На пытанне кіроўцы пра аплату кажа, што ў яго няма грошай.**

**— А на гарэлку былі?**

**— Мяне сябар частаваў.**

**— А чаму на дарогу не даў?**

**— Ну чаму ж не даў... — выцягвае з-за пазухі бутэльку гарэлкі.**

☺

З 1 студзеня па 31 снежня 2011 года праезд ва ўсіх тыпах транспарту бясплатны! Год Зайца!

☺

**Ідуць дзве бландзінкі па лесе на ёлку. Гадзіну ідуць, другую, трэцюю. Адной надакучыла і яна кажа другой:**

**— Усё, Машка! Цяпер ссякаем першую елку, якая трапіцца, нават калі яна не прыбраная!**

☺

Несапраўдны ў вас Дзед Мароз... Цвярозы нейкі.

☺

**— Табе колькі гадоў?**

**— Не ведаю.**

**— А колькі разоў ты глядзеў фільм «Іронія лёсу, ці з лёгкай парай»?**

**— Ну, разоў 20.**

**— Значыць, табе 20 гадоў.**

☺

Чаму Дзед Мароз 1 студзеня не носіць мяшок з мінералкай?

☺

**Два акцёры падзарабляюць пад Новы год Дзядамі Маразамі. Адзін просіць іншага:**

**— Слухай, зайдзі да маёй сям'і, павіншуй іх са святам.**

**— А чаму ты сам не можаш?**

**— Ды я занадта дорага бяру.**




☺

Навагоднія тосты:

1. За Стары год.
2. За Новы год.
3. Сержык, хоць ты і быў у тым годзе як казёл, давай вып'ем!
4. Ды ты і сам паводзіў сябе як свіння, але вып'ю з задавальненнем!
5. ...Ды нічога, лёд прыкладзі — хутка пройдзе. Ну што, супакоіўся? П'ём за сяброўства!
6. За прысутных тут дам (Сержыку больш не налівайце!).
7. Я хачу праымовыы тостапатаяшчэмсоўпыыпа....

☺

**А скажыце: вось Дзед Мароз існуе? А то мама кажа, што так, а жонка смяецца...**

## ЦІКАВЫЯ ГУЛЬНІ ДЛЯ НАВАГОДНЯГА СВЯТА

**«Ручаёк».** Колькасць гульцоў не абмежаваная. Раптам аднаго з гульцоў прызнаюць вядучым і прывязваюць да крэсла, а затым усе астатнія гульцы на працягу 5—6 гадзін пояць вядучага півам. Гульня лічыцца скончанай, калі з'яўляецца ручаёк.

**«Бутэлечка».** Колькасць гульцоў не абмежаваная. Гульцы размяшчаюцца кругам. У цэнтры круга вядучы, адвязаны да таго часу ад крэсла і пераапрануты ў форму радавога гульца, раскручвае пустую бутэлечку на доўгай вяровачцы. Гулец, які ўсклікнуў: «Вой, ё!» і схапіўся за галаву, не толькі лічыцца, але і з'яўляецца выбылым з гульні. Гульня працягваецца да той пары, пакуль або не застанецца гульцоў у крузе, або хто-небудзь з іх не зможа падабрацца да вядучага і зноў прывязаць яго да крэсла. У апошнім выпадку з новай сілай аднаўляецца гульня «ручаёк».

**«Лухта».** Колькасць гульцоў трохі абмежаваная папярэднімі гульнямі. Раптам аднаго з гульцоў прызнаюць вядучым і прывязваюць да крэсла, а затым астатнія гульцы пояць яго півам на працягу 2—3 гадзін. У параўнанні з 5—6 гадзінамі гульні ў «ручаёк» тое, што адбываецца зараз, здаецца вядучаму проста лухтой. Адгэтуль і назва гульні.

**«Хованкі».** Колькасць гульцоў не абмежаваная. Раптам аднаго з гульцоў прызнаюць вядучым і прывязваюць яго да крэсла. Затым першы гулец гучна і выразна кажа: «У нас ёсць лішніх 20 літраў піва. Куды б нам іх схаваць за 5—6 гадзін?» Пасля чаго пачынаецца ўласна гульня ў хованкі.




**«Жмуркі».** Колькасць гульцоў не абмежаваная. Аднаму з гульцоў (па жаданні) завязваюць шыю шалікам і раскручваюць яшчэ на 20 літраў піва для вядучага. Гулец ідзе па піва, а вядучы незадаволена жмурыцца.

**«Марская постаць, замры!».** Марскую постаць адвязваюць ад крэсла і кладуць на канапу. Усе гульцы разыходзяцца па дамах, а марская постаць замірае да раніцы. Выйграе той, каму раніцай марская постаць патэлефануе апошняму.

# Кату пад хвост

## Як святкуем? (вынікі пераднавагодняга дзіцячага сацыялагічнага апытання)

**Колькі разоў б'юць куранты ў навагоднюю ноч?**

Дванаццаць разоў — 15 %
Разоў сто — 10 %
Я толькі да двух лічу і адразу кладуся спаць — 2 %
А што такое — куранты? — 65 %

**Куды звычайна твае бацькі кладуць падарункі?**

Пад елачку — 90 %
Пад ложак — 5 %
Пад замок — 5 %

**Ці добра ты паводзіў/ла сябе ў адыходным годзе?**

А што? — 10 %
Ведаеш, ідзі ты, дзядзька... — 10 %
Прынамсі лепш за тату! — 100 пудоў
А які кошт пытання? — 80 %

**Хто першым стаў адзначаць Новы год?**

Пётр I — 5 %
Старажытныя рымляне — 10 %
Неандэртальцы — 5 %
Малпы — 5 %
Прасцейшыя амёбы — 5 %
Дзядзька Коля са 127-й кватэры — 70 %
Жыхары Петрапаўлаўска-Камчацкага — 99 %

**На чым прыскакаў Дзед Мароз на свята?**

На аленях — 30 %
На сабачках — 10 %
На карачках — 30 %
На бровах — 30 %

**З чаго зроблена барада Дзеда Мароза?**

З ваты — 10 %
З валасоў — 10 %
З зайчыка?.. — 5 %
Можа, з валасоў зайчыка? — 5 %
З капусты ўжо — 60 %
З шаліка — 10 %




**Што ў руках у Дзеда Мароза?**

Падарунак — 20 %
Кій — 20 %
Чарка — 40 %
Шкварка — 5 %
Сцяна — 5%
Барада — 5 %
Паперка з адрасам — 5 %

**Што тата і Дзед Мароз робяць на кухні?**

Хаваюцца ад мамы і Снягуркі — 10 %
Рыхтуюць сюрпрыз — 10 %
П'юць сюрпрыз — 50 %
Паляць сюрпрыз — 20 %
Дзеляць ганарар — 5 %

**Куды потым сыходзіць Дзед Мароз?**

У казку — 10 %
У ліфт — 10 %
У ноч — 20 %
У сябе — 20 %
Уразнос! — 40 %

**Каго тата віншуе, абдымае і цалуе ў навагоднюю ноч?**

Маму — 5 %
Мяне — 10 %
Снягурку — 15 %
Бутэльку — 30 %
Талерку — 40 %

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ: тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by.

Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33310. Індэкс 63850.
Зак. № 6366. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12